Л. У. ДУЧЫЦ

# Браслаўскае ПААЗЕР'Е
## у IX–XIV ст. ст.



АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

Л. У. ДУЧЫЦ

# Браслаўскае ПААЗЕР'Е ў IX–XIV ст.ст.



ГІСТОРЫКА-АРХЕАЛАГІЧНЫ НАРЫС

Пад рэдакцыяй
доктара гістарычных навук
*Г. В. Штыхава*

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1991

ББК 63.4(2)
Д 85

Рассматриваются археологические памятники, находящиеся на белорусско-литовско-латышском порубежье, которое занимает северо-западную часть Белоруссии — Браславское Поозерье.

Рассчитана на археологов, историков, искусствоведов и всех, кто интересуется историей Белоруссии.

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук М. А. Ткачоў,
кандыдаты гістарычных навук Ю. І. Драгун,
А. Р. Мітрафанаў

**Дучыц Л. У.**

Д85 Браслаўскае Паазер'е ў IX—XIV стст.: Гіст.-археал. нарыс/Пад рэд. Г. В. Штыхава.— Мн.: Навука і тэхніка, 1991.— 120 с.; іл.

ISBN 5-343-00470-9.

Дучиц Л. В. Браславское Поозерье в IX—XIV вв.: Ист.-археол. очерк.

Разглядаюцца археалагічныя помнікі, размешчаныя на беларуска-літоўска-латышскім сумежжы, якое займае паўночна-заходнюю частку Беларусі — Браслаўскае Паазер'е.

Разлічана на археолагаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Д $\frac{0504000000-045}{М316(03)-91}$ 14—90

ББК 63.4(2)

ISBN 5-343-00470-9

© Л. У. Дучыц, 1991

## УВОДЗІНЫ

У апошні час у савецкай гістарыяграфіі вялікая ўвага ўдзяляецца вывучэнню гісторыі ўскраінных зямель Кіеўскай Русі і кантактам з суседзямі. Рэгіянальны падыход дазваляе высветліць развіццё агульнасацыялагічных заканамернасцей у канкрэтных гістарычных умовах і лакальныя асаблівасці.

У канцы I — пачатку II тысячагоддзя ў склад Полацкага княства, аднаго з буйнейшых дзяржаўных аб'яднанняў Усходняй Еўропы, уваходзіла і тэрыторыя Браслаўскага Паазер'я. У васальных адносінах з Полацкам знаходзіліся землі па ніжняму цячэнню Заходняй Дзвіны, дзе ў XII — XIII стст. існавалі дзяржаўныя аб'яднанні Кокнэсе (Кукенойс) і Ерсіка (Герсіке). Вялікую ролю ў гістарычным развіцці Полацкага княства адыграла Заходняя Дзвіна, якая звязвала дзяржавы Захаду і Усходу. Па Заходняй Дзвіне праходзіла адна з галін «шляху з варагаў у грэкі». У XIV ст. тэрыторыя Полацкага княства ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага, але яшчэ на працягу доўгага часу захоўвала сваю незалежнасць.




*Рыс. 1. Карта Беларусі з вызначэннем межаў Полацкага княства*

Шмат навуковых прац прысвечана розным аспектам палітычнай і эканамічнай гісторыі Полацкага княства. У той жа час гісторыя яго паўночна-заходняй ускраіны, пад якой па сучаснаму адміністрацыйнаму дзяленню маюцца на ўвазе тры раёны Віцебскай вобласці — Браслаўскі, Міёрскі і Верхнядзвінскі, застаецца малавывучанай. Пытанні аб рассяленні тут славян і іх узаемаадносінах з усходнепрыбалтыйскімі народамі, а таксама праблема паўночна-заходняга рубяжа княства з'яўляюцца спрэчнымі.

Звесткі па гісторыі гэтага рэгіёна ў старажытнарускіх летапісах нешматлікія і фрагментарныя. У «Аповесці мінулых часоў» гаворыцца аб данніках Русі на паўночным захадзе: «... А се суть инше языце, иже дань дают Руси: Чудь, Литва, Земигола, Корсь, Норома, Либь...»[1] Аб барацьбе палачан з літоўцамі ёсць звесткі ў Іпацьеўскім летапісе[2] і ў летапісе Рачынскага[3]. Ёсць падставы лічыць, што падзеі, якія тут адбываліся, адлюстроўваліся і ў полацкіх летапісах[4]. На жаль, гэтыя летапісы не дайшлі да нас.

Акрамя старажытнарускіх крыніц вядомы яшчэ шэраг дакументаў, якія маюць адносіны да гэтага пытання. У 1225 г. з'явілася хроніка Генрыха Латвійскага, дзе згадваецца аб лівах, латгалах, іншых усходнепрыбалтыйскіх плямёнах, якія плацілі даніну полацкім князям і пастаўлялі ім войскі, а таксама аб княствах Кокнэсе і Ерсіка, дзе правілі прадстаўнікі полацкага княжаскага дома, апісваецца шэраг ваенных падзей, звязаных з Полацкам[5]. Да XIII ст. адносіцца сачыненне Барталамея Англійскага «Аб уласцівасцях рэчаў», дзе даецца апісанне Усходняй Прыбалтыкі і гаворыцца аб ёй як аб тэрыторыі, падуладнай Полацкаму княству[6].




*Рыс. 2. Карта рэгіёна*

У XIV ст. была складзена Малодшая лівонская рыфмаваная хроніка (1315 — 1348), дзе падрабязна апісваецца агрэсія нямецкіх феадалаў, скіраваная на ўсходнеславянскія і літоўскія землі, указваецца аб збудаванні новых замкаў на ўсходзе славяна-літоўскай граніцы[7].

Да XIV ст. адносяцца таксама хроніка Германа Вартберга і хроніка Балтазара Русава. Аўтар першай хронікі быў свяшчэннікам Тэўтонскага ордэна, другой — пастарам рэвельскай царквы святога Алава. У гэтых хроніках расказваецца аб войнах Ордэна з рускімі і літоўцамі. У хроніцы Германа Вартберга паведамляецца, што ў 1333 г. магістр Эвергард Мунгеймскі са шматлікім войскам з'явіўся на лодках пад Полацкам, а ў 1366 г. магістр Вільгельм павёў войскі супраць Полацка і г. д.[8]

Упамянутыя хронікі выйшлі з-пад пяра заваёўнікаў, і таму падзеі пададзены суадносна іх інтарэсам. Як ідэолагі прыбалтыйскіх нямецкіх феадалаў і бюргерства аўтары абаранялі і апраўдвалі іх панаванне ў Прыбалтыцы і дзеля гэтага часта прыбягалі да фальсіфікацыі гістарычных фактаў. У палачанах і літоўцах яны бачылі толькі ворагаў.

У XV — XVI стст. гісторыя Вялікага княства Літоўскага, у склад якога ўваходзіла Браслаўскае Паазер'е, асвятлялася ў працах польскіх храністаў М. Мяхоўскага, М. Кромера, Б. Ваноўскага і інш. Да XV ст. адносіцца 12-томная «Гісторыя Польшчы», напісаная Я. Длугашам. Тут упершыню выказваецца думка аб заваяванні Літвой Полацкага княства[9]. У XV ст. напісана таксама сачыненне французскага вандроўніка Жыльбера дэ Лануа, дзе, на думку некаторых даследчыкаў, нібыта згадваецца Дрысвяцкі замак[10].

У 1611 г. ротмістр Літоўскага войска, камендант Віцебска А. Гваньіні на лацінскай і польскай мовах выдаў хроніку Еўрапейскай Сармацыі. Вядома, што тэкст быў падрыхтаваны М. Стрыйкоўскім, які служыў пад камандаваннем А. Гваньіні. У хроніцы змешчана шмат звестак па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, апісаны гарады і крэпасці, гаворыцца аб сварках паміж рускімі князямі і аб набегах літоўцаў на полацкія землі, асабліва ў 1103 і 1214 гг.[11]

Шырокавядомая «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі» М. Стрыйкоўскага ўпершыню выйшла ў 1562 г. у Круляўцы (сучасны Калінінград). Аўтар крытычна выкарыстаў 15 беларускіх летапісаў, заснаваных на найбольш старажытных запісах, а таксама старажытнарускія і заходнееўрапейскія крыніцы. У хроніцы пад 1065 г. упамінаецца Браслаў, а таксама даецца апісанне «Барысавых камянёў» у рэчышчы Заходняй Дзвіны каля г. Дзісны і выказваецца меркаванне, што знакі і надпісы на камянях звязаны з полацкім князем Барысам[12].

Цікавасць для вывучэння гісторыі паўночнага захаду Полацкага княства ўяўляюць таксама і іншыя крыніцы — хронікі XVI ст.: хроніка М. Бельскага[13], хроніка Быхаўца[14], літоўская і жамойцкая хронікі[15].

Да XVIIст. адносіцца праца Мацеуша Догеля, прысвечаная гісторыі Полацкага княства, якая так і засталася ненадрукаванай[16].

У канцы XVIII ст., калі беларускія землі на поўнач ад Заходняй Дзвіны ўвайшлі ў склад Расіі, туды была накіравана экспедыцыя Расійскай Акадэміі навук пад кіраўніцтвам акадэміка І. І. Лепёхіна. Абследавалася тэрыторыя ад Віцебска да Рыгі. У час экспедыцыі быў апісаны шэраг помнікаў, у тым ліку адзін з помнікаў эпіграфікі XII ст. — «Барысаў камень» каля г. Дзісны[17].

У пачатку мінулага стагоддзя сярод прац, якія датычацца гісторыі паўднёва-заходняй Беларусі, вылучаюцца публікацыі З. Даленгі-Хадакоўскага і П. Кеппена. З. Даленга-Хадакоўскі супрацоўнічаў з Тварыс-

твам гісторыі і старажытнасцей расійскіх[18]. У шэрагу сваіх прац ён разглядаў пытанне аб рассяленні славян, аб граніцы паміж славянамі і ўсходнепрыбалтыйскімі народамі. Да пагранічных пасяленняў даследчык адносіў Друю[19]. У гэтыя ж гады «Барысавы камяні» вывучаліся П. Кеппенам, дзейнасць якога была звязана з гуртком Н. П. Румянцава[20].

Зборам звестак аб археалагічных помніках Сярэдняга Падзвіння займаўся ўраджэнец Полаччыны Караль Халдзіеўскі. Вынікі сваіх даследаванняў ён выклаў у працы «Archeologia Slowiańska» (1818), да якой склаў археалагічную карту Падзвіння. Праца засталася ненадрукаванай [21]. К. Халдзіеўскі вывучаў таксама старажытныя ўмацаванні ў Косараве каля Дрысы і ў Полацку [22].

Пачынаючы з сярэдзіны мінулага стагоддзя сярод памешчыкаў і інтэлігенцыі пачало распаўсюджвацца захапленне раскопкамі курганоў. Найбольш сур'ёзна да раскопак ставіліся граф А. Плятэр і ўрач І. Брандт. Маёнткі роду Плятэраў былі ў Бяльмонтах, Опсе, Злоце і іншых месцах Браслаўшчыны. А. Плятэр з'яўляўся членам імператарскага Археалагічнага таварыства, перадаваў туды матэрыялы сваіх раскопак, а таксама друкаваў вынікі даследаванняў. Датаванне курганных могільнікаў на беларуска-латышскім сумежжы ён вызначыў XI—XII стст. і лічыў, што круглыя ў плане курганы належалі балтам, а доўгія — славянам. Ён падкрэсліваў рознаэтнічнасць старажытнага насельніцтва Падзвіння. І. Брандт таксама прыйшоў да высновы аб прыналежнасці курганоў дзвюм племянным групам — літоўска-латышскай і славянскай [23].

Актывізацыя вывучэння археалагічных помнікаў звязана з заснаваннем Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі пры ім. Дзейнасць камісіі прыпадае на 1855—1865 гг.[24] У сярэдзіне мінулага стагоддзя ўбачылі свет працы вядомых даследчыкаў Я. і К. Тышкевічаў, М. Пагодзіна, І. Паўлішчава, у якіх змешчаны некаторыя звесткі па гісторыі Браслаўшчыны. Цікавасць да гісторыі Паўночна-Заходняга краю ўзрасла пасля падаўлення паўстання 1863 г. З мэтай доказу старажытнасці праваслаўя ў краі сюды накіроўваліся экспедыцыі для збору звестак аб царкоўных старажытнасцях. Сярод такіх экспедыцый увагу заслугоўваюць матэрыялы, сабраныя групай, якую ў 1864 г. узначальваў мастак Збройнай палаты, член Маскоўскага археалагічнага таварыства Д. М. Струкаў. Вынікі работы змяшчае альбом, у якім ёсць замалёўкі Браслаўскага гарадзішча і гарадзішчаў ваколіц Верхнядзвінска[25].

У 60-я гады выйшлі састаўленыя павятовым настаўнікам Эстляндскай губерні Э. Баннэлем «Руска-Ліфляндская хранаграфія», дзе змешчаны матэрыялы з розных нямецкіх крыніц[26], а таксама выбраныя карэспандэнтам археалагічнай камісіі К. Э. Нап'ерскім дакументы Рыжскага гарадскога архіва, якія датычаць гандлёвых сувязей Русі і Прыбалтыкі[27]. Засталіся ненадрукаванымі рускія граматы Рыжскага гарадскога архіва, якія рыхтаваліся да друку А. А. Шахматавым і Б. А. Тарашкевічам[28].

Вялікую ўвагу археалагічным помнікам Браслаўскага краю ўдзяліў арганізаваны ў 1868 г. Віцебскі губернскі статыстычны камітэт, якім кіраваў А. М. Семянтоўскі, а потым А. П. Сапуноў. Напярэдадні IX археалагічнага з'езда (1893) былі разгорнуты значныя навуковыя раскопкі. На тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна (Бяльмонты, Богіна, Заборныя Гумны, Опса, Рацкі Бор, Укля) раскопкі курганоў праводзіліся захавальнікам Віленскага музея старажытнасцей Ф. В. Пакроўскім[29], а на тэрыторыі суседняй Усходняй Латвіі помнікі вывучаліся Е. Р. Рамманавым[30].

Першая спроба складання археалагічнай карты Віцебскай губерні належыць А. М. Семянтоўскаму. Ім была распрацавана праграма, па якой губернскі статыстычны камітэт вёў збор звестак аб археалагічных помніках. Працы па састаўленню археалагічнай карты праводзіліся таксама М. Ф. Кусцінскім[31]. Шмат гадоў працаваў над археалагічнай картай Віцебшчыны Е. Р. Раманаў, якому даручыў гэта папярэдні камітэт па правядзенню IX археалагічнага з'езда[32]. Са складзеных карт былі надрукаваны толькі карты Ф. В. Пакроўскага. За гэту працу аўтар быў ўзнагароджаны сярэбраным медалём Рускага археалагічнага таварыства. Да збору звестак Ф. В. Пакроўскі прыцягваў мясцовую інтэлігенцыю, праводзіў анкетаванне. Ён збіраў не толькі апісанні помнікаў археалогіі, але і паданні, звязаныя з імі, а таксама звесткі аб камянях з надпісамі, каменных крыжах, скарбах і выпадковых знаходках старажытных рэчаў[33]. Некаторыя помнікі паўночна-заходняй Беларусі былі нанесены таксама на карту, складзеную прыбалтыйскім археолагам Е. Сітцке[34].

Цікавыя звесткі па гісторыі паўночна-заходняй Беларусі змяшчаюцца ў працах А. П. Сапунова. Ім быў знойдзены і «Барысаў камень» у Друі пры ўпадзенні р. Дзісны ў Заходнюю Дзвіну[35]. У 1903 г. убачылі свет сабраныя яшчэ ў 1873 г. археалагічным камітэтам даныя аб гарадзішчах і курганах[36].

Гісторыя Полацкага княства, у тым ліку і Браслаўскага Паазер'я, займае пэўнае месца ў працах вядомых рускіх дарэвалюцыйных гісторыкаў. У канцы XIX — пачатку XX ст. канкрэтныя звесткі аб старажытнасцях Браслаўшчыны сустракаюцца ў працах Я. Ф. Карскага[37], Д. І. Даўгялы[38], А. Маркава[39] і інш.

У паслякастрычніцкі перыяд работу па вывучэнню помнікаў археалогіі праводзіла камісія па выяўленню і ахове помнікаў археалогіі, якая знаходзілася ў складзе Інстытута беларускай культуры. Экспедыцыі арганізоўваліся таксама. Беларускім дзяржаўным універсітэтам, музеямі і краязнаўчымі гурткамі.

Частка тэрыторыі, якая даследавалася аўтарам, з 1921 па 1939 г. уваходзіла ў склад Польшчы. У 1933—1939 гг. археалагічныя раскопкі на Дзісеншчыне і Браслаўшчыне праводзіліся супрацоўнікамі археалагічнага музея Віленскага універсітэта А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовічам (Бяльмонты, Вята, Паддубнікі, Чамяры, Чурылава, Чарневічы, Шо).

У час раскопак вяліся падрабязныя дзённікавыя запісы, складаліся планы, рабіліся фотаздымкі, малюнкі. На жаль, публікацыі аб гэтых работах фрагментарныя. А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіч склалі археалагічныя карты. Адна з іх часткова надрукавана ў 1945 г., але без указання населеных пунктаў, што значна зніжае яе каштоўнасць[40].

Абследаваннем археалагічных помнікаў Падзісення ў 20—30-я гады займаўся вядомы беларускі мастак, фалькларыст і этнограф Я. Н. Драздовіч, ураджэнец Глыбоччыны. Ён здымаў планы гарадзішчаў, рабіў іх замалёўкі, а таксама напісаў шэраг краязнаўчых прац, найбольш значная з якіх «Дзісенская дагістарычная старына», дзе апісана 30 гарадзішчаў. Дзённікі і рукапісы Я. Н. Драздовіча захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа АН БССР[41].

Ненадрукаванымі засталіся і звесткі аб археалагічных даследаваннях на Браслаўшчыне, якія праводзіліся ў 1938 г. вядомым беларускім этнографам і культурным дзеячам Мар'янам Пецюкевічам. Каля в. Кузьмаўшчына ім былі знойдзены металічныя шалі вагаў, жалезны наканечнік дзіды і дзве сякеры. У час раскопак на хутары Бароўка ў магіле пры

касцяку трапіліся жалезны нож, спражка, крэсіва, тры абабітыя крамяні, два кавалкі ад разбітага гаршка, бронзавы крыжык і манета 1566 г. Гэтыя рэчы былі перададзены ў Віленскі беларускі музей імя Івана Луцкевіча[42].

Вялікі архіўны матэрыял па гісторыі пасяленняў ёсць у манаграфіях настаўніка Браслаўскай гімназіі Аттона Хедэмана, якія выйшлі ў свет у 30-я гады[43]. Да гэтага часу адносяцца працы Г. Лаўмянскага[44] і І. Ядкоўскага[45], дзе таксама можна знайсці кароткія звесткі, якія тычацца Браслаўскага Паазер'я. Трэба адзначыць таксама нумізматычную работу Р. Якімовіча[46].

На тэрыторыі Латвіі ў тыя ж гады выйшлі працы Б. Брэжгі[47] і Ф. Балодзіса[48], якія таксама ўяўляюць цікавасць для вывучэння гісторыі Браслаўскага Паазер'я. А ў сталіцы тагачаснай Літвы Каўнасе ў 20-я гады на беларускай мове выдаваўся часопіс «Крывіч». Амаль у кожным нумары друкаваліся артыкулы, якія закраналі пытанні гісторыі і археалогіі Падзвіння, асабліва Падзісення. Напрыклад, аб былых курганах каля Дзісны, аб скарбе арабскіх манет на востраве воз. Старапагосцкага і г. д.[49]

У пасляваенныя гады ў Падзвінні працавалі экспедыцыі АН БССР і АН СССР. Л. В. Аляксеевым былі праведзены раскопкі Браслава, на падставе якіх даследчык зрабіў вывад, што ў пачатку XI ст. на месцы спаленага пасёлка са змешаным латгала-славянскім насельніцтвам князь Полацкай зямлі Брачыслаў заснаваў горад і назваў яго сваім імем.[50] У 60-я гады вялікія археалагічныя працы пачаліся ў Кокнэсе пад кіраўніцтвам латышскага археолага А. Стубаўса[51].

У 50—60-я гады выходзіць у свет шэраг прац, якія маюць непасрэднае дачыненне да крайняга паўночнага захаду Беларусі ў старажытна-




*Рыс. 3. Помнікі археалогіі на даследаванай тэрыторыі*

рускія часы. Найбольш значнымі з'яўляюцца работы А. Н. Насонава, У. Ц. Пашуты, Л. В. Аляксеева, В. М. Поціна, В. В. Сядова, Н. А. Казаковай[52]. У большасці з гэтых публікацый разглядаюцца пытанні, звязаныя з фарміраваннем паўночна-заходняга рубяжа Полацкага княства.

Важнымі з'яўляюцца работы польскіх даследчыкаў К. Слязскага, Г. Лаўмянскага, Е. Ахманьскага[53], прысвечаныя пытанню славяна-балцкага сумежжа. Цікавасць уяўляе і артыкул З. Вайткавяка аб паходжанні Браслава і ўваходзе яго ў склад Літоўскай дзяржавы[54].

У 70-х гадах у Дрысвятах і Дзісне раскопкі праводзіў М. А. Ткачоў. У той жа час раскопкамі курганоў у Верхнядзвінскім раёне (Абрамава, Дзянісенкі, Зашчырына, Лісна і інш.) займалася З. М. Сяргеева. З 1976 г. вывучэннем помнікаў канца I — пачатку II тысячагоддзя на беларуска-латышска-літоўскім сумежжы займаецца аўтар. Праводзіліся раскопкі на гарадзішчах Маскавічы і Рацюнкі, а таксама на 15 курганных могільніках, дзе раскапана больш за сотню насыпаў.

З апісаных фактаў вынікае, што назапашаны значны археалагічны і гістарычны матэрыял, які разам з прыцягненнем даных іншых навук дазваляе паглыбіць уяўленні аб гісторыі паўночна-заходняй Беларусі ў эпоху Полацкага княства і паставіць шэраг важных гістарычных пытанняў.

У апрацоўцы археалагічнога матэрыялу прымалі ўдзел супрацоўнікі Інстытута гісторыі АН БССР, а таксама іншых навуковых устаноў. Антрапалагічны матэрыял быў вызначаны І. У. Чаквіным. Астэалагічны матэрыял даследавалі В. В. Шчаглова, Л. І. Рэкавец і Н. Г. Бялан, рэшткі арнітафауны — А. М. Дарафееў і А. С. Уманская, іхтыяфауны — Н. П. Александровіч. Аналізы жалезных вырабаў зроблены М. Ф. Гурыным, шкляных — Т. С. Скрыпчанка. Вывучэннем рунічных знакаў і надпісаў на абломках касцей жывёл з гарадзішча Маскавічы займалася Е. А. Мельнікава.

*Глава I*

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПОМНІКАЎ

## 1. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ І ПРАБЛЕМА РАССЯЛЕННЯ СЛАВЯН

Агляд археалагічных помнікаў аўтар лічыць неабходным пачынаць з характарыстыкі пахавальных помнікаў, таму што паселішчы ў рэгіёне амаль не вывучаліся, а ўмацаваныя пункты ўзніклі ў пачатку II тысячагоддзя і выконвалі ролю полацкіх фарпостаў.

Вынікі раскопак курганоў, як вядома, з'яўляюцца важнымі для вызначэння этнасу, разгляду сацыяльных і гаспадарчых адносін, ідэалагічных уяўленняў і пытанняў дэмаграфіі. У дадзеным выпадку разгляд пахавальных помнікаў неабходны і для вывучэння праблемы рассялення славян на паўночным захадзе Беларусі, а таксама іх узаемаадносін з балцкімі плямёнамі.

У Беларусі на тэрыторыі сучаснага беларуска-латышска-літоўскага сумежжа можна назваць больш за 40 курганных могільнікаў, вядомых сярод мясцовага насельніцтва як «капцы», «валатоўкі» ці «французскія магілы» (дадатак). Курганы гэтага рэгіёна здаўна прыцягвалі ўвагу вучоных. Як ужо адзначалася, найбольш значныя раскопкі тут праводзілі Ф. В. Пакроўскі, А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіч, З. М. Сяргеева, а таксама аўтар.

Пытанне аб этнічнай прыналежнасці пахаваных было пастаўлена яшчэ Ф. В. Пакроўскім. Даследчык датаваў раскапаныя ім насыпы XI—XIV стст. і выказаў меркаванне, што курганы з трупаспаленнем належаць лета-літоўскаму племені, а курганы з трупапалажэннем — славянам[1]. А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіч упершыню адзначылі, што курганы з трупаспаленнем адрозніваюцца ад балцкіх пахаванняў і што абрад трупапалажэння ў яме не з'яўляецца больш познім у параўнанні з абрадам трупапалажэння на гарызонце[2].

У канцы 40-х — пачатку 50-х гадоў надрукаваны шэраг артыкулаў, якія датычацца пахавальных помнікаў на тэрыторыі Браслаўскага раёна. Гэта публікацыі Ф. Д. Гурэвіч[3], Р. Кулікаўскене[4] і С. А. Тараканавай[5]. Даследчыкі ўслед за Ф. В. Пакроўскім аднеслі вывучаныя ім курганы з трупаспаленнем да літоўскіх старажытнасцей, а з трупапалажэннем — да славянскіх пахаванняў.

Курганныя могільнікі размешчаны як на ўзгорках, так і ў нізінных месцах, паблізу вадаёмаў і звычайна выцягнуты ўздоўж дарог. Побач з многімі знаходзяцца сучасныя могілкі. Колькасць курганных насыпаў, якія захаваліся, не пераўзыходзіць 80. Форма насыпаў у плане круглая, авальная, падчас блізкая да прамавугольнай і падоўжаная. Зафіксавана пяць доўгіх курганоў (Рацкі Бор, Вята, Поціна, Ігналіна, Субаўшчына). Даўжыня іх ад 20 да 40 м. Авальныя і падоўжаныя, як правіла, арыентаваны па лініі захад — усход. Вышыня насыпаў ад 0,4 да 1,5 м. Вядомы адзін курган вышынёй 3 м (Чарневічы), які раскапаны А. Цэгак-Галубо-

віч і У. Галубовічам. Даследчыкамі выяўлена попельна-вугальная праслойка, але слядоў пахавання не зафіксавана.

У цэлым пераважаюць паўсферычныя курганы. Вакол большасці насыпаў захаваліся ровікі і перамычкі. Ёсць нават ровікі глыбінёй да 0,5 — 0,6 м (Опса). Вядома і некалькі сопак, дакладней, сопкападобных насыпаў (Струста, Пруднікі, Сар'я), але пакуль што ні адзін з іх не вывучаўся.

Могільнікі, якія можна было б звязваць з паселішчамі гарадскога тыпу, не вядомы, за выключэннем курганоў ва ўрочышчы Заборныя Гумны каля Браслава, якія Ф. В. Пакроўскі лічыў могільнікам Браслава[6].

Сельскія паселішчы, звязаныя з курганнымі могільнікамі, не вывучаліся. Сярод курганных груп вылучаюцца курганы перыяду позняга сярэдневякоўя. Яны размешчаны непасрэдна на берагах Заходняй Дзвіны і ўяўляюць сабой насыпы з попельна-вугальнай праслойкай, часта маюць выбрукоўкі і разбітую кераміку (Вята, Крумплева, Чамяры, Чурылава)[7]. Гэта з'ява пакуль што канчаткова не вывучана, але ёсць падставы меркаваць, што такія курганы звязаны з адраджэннем язычніцкіх вераванняў у эпоху позняга сярэдневякоўя[8].

Усяго да нашага часу на даследаванай аўтарам тэрыторыі раскапана звыш 300 курганных насыпаў. Падрабязную класіфікацыю іх прывесці не ўяўляецца магчымым, таму што комплексы часта дэпаспартызаваны, шэраг матэрыялаў зусім не надрукаваны ці надрукаваны фрагментарна. З публікацый Ф. В. Пакроўскага, А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіча, З. М. Сяргеевай, рэзультатаў раскопак аўтара вынікае, што для большасці насыпаў, у тым ліку і без слядоў пахаванняў, характэрны попельна-вугальныя праслойкі каля мацерыка, у насыпе і ў падкурганных ямах. Асабліва добра выяўлены попельна-вугальныя праслойкі ў Кублішчыне, Загор'і, Лясной, Абрамаве і Чарневічах.

Каля чвэрці раскапаных курганоў аказаліся без слядоў пахаванняў, але ў некаторых знойдзены рэчы. Так, напрыклад, у Рацкім Бары ў адным з курганоў быў абломак ляпнога посуду, у другім — два кальцы з дроту і ў трэцім — 5 бразготак. У Лясной у адным «пустым» кургане знойдзены абломкі ляпнога гаршка, у другім — маленькая жалезная падковападобная фібула са спіралепадобнымі канцамі, а ў Кублішчыне — ляпная пасудзіна. Асобныя рэчы і фрагменты керамікі ў курганах без слядоў пахаванняў вядомы ў іншых раёнах Усходняй Еўропы. Большасць даследчыкаў такія помнікі адносіць да мемаратыўных насыпаў[9].

Паводле абраду пахавання помнікі падраздзяляюцца на курганы з рэшткамі трупаспалення і трупапалажэння. Сярод трупаспаленняў у сваю чаргу вылучаюцца віды: крэмацыі, змешчаныя ў ямках (дыяметр ямак 0,6 — 0,9 м, глыбіня 0,2 — 0,4 м); на мацерыку і ў вяршыні кургана. Пераважаюць рэшткі крэмацыі на мацерыку. Зафіксавана некалькі выпадкаў з 2 — 4 пахаваннямі пад адным насыпам (Бяльмонты, Рацкі Бор, Вусце, Опса). У большасці курганоў спаленыя косці змяшчаліся ў гаршчок, іншы раз гаршчок, перавернуты дні́шчам уверх, ставіўся над кучкай касцей. Спаленні рабіліся за межамі будучага кургана, напэўна, на спецыяльна прызначаных для гэтай мэты месцах.

Трупапалажэнні ёсць на мацерыку і ў ямках. Адзначаны парныя і ўпускныя пахаванні. Пераважаюць інгумацыі на мацерыку (з заходняй арыентацыяй у жаночых і мужчынскіх пахаваннях). Рукі ў нябожчыкаў у асноўным выцягнуты ўздоўж цела. Іншыя выпадкі (рукі на жываце, рукі, сагнутыя ў локцях і кісцямі на плячах) рэдкія.




*Рыс. 4. Ляпны посуд з курганоў: 1—4— трупаспаленне, 5—6— трупапалажэнне (1—2— Усце, 3— Опса, 4— Бяльмонты, 5— Лясная, 6— Кузьмайшчына)*

Трупапалажэнні на мацерыку і ў ямках адносяцца да аднаго часу. Ранняе з'яўленне інгумацый у падкурганных ямах хутчэй за ўсё звязана з блізкасцю латгальскай тэрыторыі, дзе ў VI—XIII стст. нябожчыкаў хавалі ў грунтавых магілах.

Храналагічна вылучаюцца пахаванні VII—IX стст., якія адносяцца да культуры доўгіх курганоў, курганы X—XI стст. і XI—XII стст.

Для пахавальнага інвентару ранніх курганоў характэрныя ляпны посуд, нажы, крэсівы ў выглядзе жалезных трубачак, падковападобныя жалезныя фібулы са спіральнымі канцамі, пранізкі, В-падобная спражка, шыйныя грыўні, пацеркі-лімонкі, пацеркі з сіняга і цёмна-чырвонага шкла, зрэдку цуглі.

У нажоў лінія спінкі пераходзіць непасрэдна ў чаранок, а лязо злучаецца з чаранком плаўным выгінам ці аддзяляецца ад чаранка асіметрычнымі ўступамі. Даўжыня нажоў 90—140 мм, шырыня пасярэдзіне ляза 10—17 мм, таўшчыня спінкі 2—4 мм. Нажы з курганнага могільніка каля Опсы маюць доўгія чаранкі. Спражкі ў асноўным прамавугольныя, зроблены з жалеза ці бронзы. Ёсць таксама бронзавыя фігурныя і адна жалезная рыфленая В-падобная спражкі (Рацкі Бор). Кольцы ў асноўным медныя драцяныя, за выключэннем трох (спіральнага, пласцінчатага і плеценага) з Богінскага могільніка. Бранзалеты зроблены з круглага бронзавага дроту. Шыйныя ўпрыгожанні прадстаўлены бронзавымі грыўнямі з тоўстага дроту, нанізанымі на шнур спіральнымі пранізкамі ці вузкапласцінчатымі ажарэлкамі з заходзячымі канцамі і прымацаванымі трапецападобнымі падвескамі. Сустракаліся званочкі і грыбападобныя падвескі. Званочкі асабліва характэрны для народаў Усходняй Латвіі VII—XI стст., дзе яны ўваходзілі ў склад жаночых і мужчынскіх упрыгожанняў [10]. Грыбападобныя падвескі з'яўляюцца характэрным атрыбутам пахавальнага інвентару доўгіх курганоў, а трапецападобныя падвескі шырока распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі паўночнага захаду Усходняй Еўропы. Ёсць ланцужкі і ланцугатрымальнікі.

Дрот, з якога зроблены спіральныя пранізкі, уплошчаны або сегментавідны. Дыяметр спіральных трубачак 5—8 мм. У курганах зафіксаваны таксама гліняныя праселкі (Рацкі Бор).

Ляпны посуд па форме венчыка падраздзяляецца на чатыры тыпы: з прамым, крыху загнутым унутр ці адагнутым наверх краем венчыка і слабапрафіляваны. Ёсць прыземісты посуд, а таксама гаршкі, блізкія па форме да баначных. Арнаментаваны посуд не сустракаўся. Вышыня гаршкоў 89—150 мм, дыяметр вусця 73—155, дыяметр дна 68—100 мм (рыс. 5). Гаршкі слаба абпалены, у чырванаватай гліне шмат дробнай жарствы і пяску. Магчыма, іх выраблялі спецыяльна для пахавальных мэт.




*Рыс. 5. Пахавальны інвентар з курганоў з трупапаленнем: 1—6,11— Рацкі Бор; 7, 9, 10, 13—15— Усце; 8—12— Бяльмонты; 16— Опса (1—4— спіральныя пранізкі; 5—6— трапецападобныя падвескі; 7—8,11— ланцугатрымальнікі; 9,12— спражкі; 13—15— нажы; 16— крэсіва)*

У некалькіх курганах былі косці жывёл і птушак. Усё вышэйпералічанае адпавядае прыкметам культуры доўгіх курганоў [11]. У даследаваным рэгіёне сустракаюцца рэчы, распаўсюджаныя па ўсяму арэалу гэтай культуры: посуд, нажы, бранзалеты, пярсцёнкі, пацеркі, фібулы, гліняныя праселкі, крэсівы ў выглядзе жалезнай трубачкі, цуглі і г. д. Да лакальных рыс адносяцца наяўнасць элементаў вайнагі, скроневыя кольцы з дроту з заходзячымі пласцінчатымі канцамі. У адрозненне ад асноўнай тэрыторыі распаўсюджання культуры доўгіх курганоў тут няма блокападобных крэсіваў і бляшак-шкарлупінак.

У многіх раскапаных курганах, асабліва ў раёне воз. Богінскага, зафіксаваны каменныя вянцы ці выбрукоўкі. В. В. Сядоў адзначае, што ўсе доўгія курганы з каменнымі канструкцыямі знаходзяцца ў межах рассялення старажытных прыбалтыйскіх фінаў [12]. У дадзеным выпадку трэба ўлічваць той факт, што помнікі знаходзяцца па суседству з усходнелітоўскімі курганамі, дзе пахаванні V—VII стст. абносіліся каменнымі вянцамі [13]. Таму пытанне аб з'яўленні каменных агароджак у Браслаўскім Паазер'і можа быць вырашана дваяка — ці гэта рытуал, які застаўся ад прыбалтыйскіх фінаў, ці рытуал, пераняты ў суседзяў-балтаў. Гэта таксама датычыцца наяўнасці пад адным насыпам некалькіх пахаванняў (Усце, Бяльмонты) і знаходак гліняных праселкаў.




*Рыс. 6. Пахавальны інвентар з курганоў з трупапалажэннем: 1— Кублішчына; 2, 3, 4, 6— Чарневічы; 5— Лясная (1— наканечнік суліцы; 2— нож; 3— крэсіва; 4, 6— сякеры; 5— серп)*

Курганы X — пачатку XI ст. характарызуюцца бірытуальнасцю пахаванняў. У пахаваннях, зробленых па абраду трупаспалення, сустракаецца кругавая кераміка (Опса, Укля, Усце), а ў пахаваннях з трупапалажэннем частыя ляпныя гаршкі (Дзянісенкі, Кузьмаўшчына, Лясная, Укля, Чарневічы), ідэнтычныя посуду з курганоў з трупаспаленнем.

Для курганоў гэтага часу характэрны калачападобныя крэсівы з язычком, вузкапласцінчатыя скроневыя кольцы з кручкападобнымі канцамі, вяночкі са спіральных пранізак з раздзяляючымі пласцінкамі, пацеркі-лімонкі і рубленыя бісерныя пацеркі. У адным з пахаванняў па абраду трупаспалення ў Уклі была сякера. Даўжыня яе 130 мм,




*Рыс. 7. Пахавальны інвентар з курганоў з трупапалажэннем: 1—10,16— Кублішчына; 11— Лясная; 13— Укля; 12—14, 15— Чарневічы; 17— Усце (1— бразготка; 2, 3— пярсцёнкі з дроту; 4, 5, 6— спіральныя пранізкі; 7, 8, 10— бронзавыя спражкі; 9— паясное кальцо; 11, 15— скроневыя кольцы; 12, 13, 17— бранзалеты; 14, 16— падковападобныя фібулы)*

а адтуліна для абуха мае авальную форму (24×29 мм). Па класіфікацыі А. Н. Кірпічнікава, гэта сякера адносіцца да другога тыпу сякер і датуецца XII ст.[14] У адным з курганоў у Опсе (Даўборская група) выяўлены чатыры гіркі-разнаважкі, якія датуюцца канцом X — сярэдзінай XI ст.[15]

У курганах XI—XII стст. пахаванні зроблены па абраду трупапалажэння на мацерыку ці ў яме. Ямныя пахаванні характэрны для басейна р. Авуты і для правабярэжжа Заходняй Дзвіны. На тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна яны не вядомы.

Пахавальны інвентар гэтага часу прадстаўлены рэчамі побыту, прыладамі працы, зброяй, упрыгожаннямі, прыналежнасцямі адзення, кругавым і ляпным посудам. Сярод першай катэгорыі знаходак вылуча-




*Рыс. 8. Пахавальны інвентар з курганоў з трупапалажэннем: 1, 2— Лясная; 3— Кублішчына; 4, 5— Чарневічы (1, 4, 5— бранзалеты; 2— шыйная грыўня; 3— падковападобная фібула)*

юцца нажы, калачападобныя крэсівы з язычком, тачыльныя брускі, сякеры, сярпы (рыс. 6). У Чарневічах знойдзены лапаткападобны ключ і касцяны аднабаковы грабеньчык. Нажы ёсць у мужчынскіх і жаночых пахаваннях. Месцазнаходжанне нажа зафіксавана каля правага пляча, левай рукі, пояса, ног. Астрыё накіравана ўверх ці ўніз. Крэсівы ва ўсіх выпадках знойдзены каля левага бядра нябожчыка. Зброя нешматлікая і прадстаўлена ўтульчатымі наканечнікамі коп'яў з падоўжанымі ланцэтападобнымі клінкамі і суліцай.

Упрыгожанні і прыналежнасці адзення складаюць спражкі, бранзалеты, фібулы, скроневыя кольцы, грушападобныя бразготкі з крыжападобнай прораззю і пацеркі (рыс. 7). У Заборных Гумнах знойдзена жалезнае вастрыё з рухомым кальцом. Спражкі падраздзяляюцца на жалезныя, прамавугольныя, лірападобныя і адну прамянёвую. Бранзалеты дзеляцца на вітыя, драцяныя з завужанымі канцамі, пласцінчатыя арнаментаваныя




*Рыс. 9. Кругавы посуд з курганоў з трупапалажэннем: 1— Уцес; 2—4— Укля; 5—7— Кублішчына; 8— Лясная*

і зааморфныя (сегментападобныя ў сячэнні). Фібулы ўсе падковападобныя са спіралепадобнымі канцамі. У сячэнні яны круглыя, прамавугольныя ці трохвугольныя. Ёсць тардзіраваная фібула і фібула з макападобнымі галоўкамі. Скроневыя кольцы раздзяляюцца на драцяныя пярсцёнкападобныя са звязанымі канцамі і месяцападобныя. Пацеркі шкляныя і бурштынавыя.

Пры трупаспаленнях сустракаліся прыземістыя ляпныя і кругавыя гаршкі. Ляпны посуд з адагнутым звонку краем венчыка ці слабапрафіляваны. У кругавых гаршкоў добра прасочваецца плечыка, край венчыка загнуты ўнутр ці, наадварот, адагнуты наверх. Вылучаецца міскападобны гаршчок з кургана ў Лясной (рыс. 9). Колькасць арнаментаваных пасудзін нязначная. Арнамент лінейны, хвалісты ці зроблены з дапамогай насечак. У чарневіцкім могільніку выяўлены чарапы авечкі і барана.

Паміж курганамі, зробленымі па абраду трупаспалення і па абраду трупапалажэння, прасочваецца генетычная пераемнасць. Культура доўгіх курганоў паказвае поўную сувязь з дакладна крывіцкімі старажытнасцямі, якая заключаецца ў наступным. Ляпны посуд з пахаванняў з трупаспаленнем ідэнтычны посуду з пахаванняў з трупапалажэннем. У абодвух тыпах пахавання на пляцоўках зафіксаваны валуны і больш дробныя камяні, размешчаныя ў выглядзе агароджаў ці выбруковак, а таксама косці жывёл і птушак. Для ўсіх курганоў характэрны нажы (адрозніваецца толькі іх форма), калачападобныя крэсівы з язычком, жалезныя прамавугольныя спражкі, спіральныя пранізкі, шкляныя пацеркі, вайнагі і г. д.

Сярод асаблівасцей рэгіёна трэба вылучыць вялікую колькасць нажоў, прыземістую форму гаршкоў, пакладанне ў пахаванні з трупапалажэннем ляпных гаршкоў і ранняе з'яўленне трупапалажэнняў у падкурганных ямах.

Вылучаецца чатыры групы пахавальных помнікаў з уласцівымі кожнай з іх лакальнымі адрозненнямі: дзісенская, браслаўска-міёрская, асвейская і богінская (рыс. 3). Яны падзелены паміж сабой геаграфічна (рэкі, балотныя масівы). Дзісенскія курганныя групы, якія ахопліваюць помнікі басейна рэк Дзісны і Авуты (Чарневічы, Паддубнікі, Чабаны, Шо), адмяжоўваюцца ад браслаўска-міёрскіх (Кублішчына, Лясная, Укля, Кузьмаўшчына, Заборныя Гумны) Ельненскім балотам. Браслаўска-міёрская група ад богінскіх курганоў аддзяляецца воз. Дрывяты і балотам, якое займае вярхоўі р. Янкі. Асвейскія курганы (Абрамава, Лісна, Зашчырына, Дзянісенкі) знаходзяцца ўбаку ад усіх іншых і аддзяляюцца Заходняй Дзвіной.

На богінскі мікрарэгіён прыходзіцца асноўная частка насыпаў культуры доўгіх курганоў. Цікавасць уяўляе курганны могільнік каля в. Усце на беразе воз. Богінскага, паблізу сучаснай граніцы з Літвой. З 74 насыпаў аўтарам сумесна з В. І. Шадырам вывучана 16 насыпаў. Насыпы мелі каля падножжа попельна-вугальныя праслойкі. У шасці курганах на мацерыку знойдзены рэшткі аднаго трупаспалення, у адным з насыпаў — рэшткі трох трупаспаленняў. У трох курганах рэшткі трупаспалення знойдзены ў мацерыковых ямах. Два з гэтых курганоў мелі таксама ўпускныя пахаванні каля вяршыні. У адным насыпе было толькі ўпускное пахаванне каля вяршыні. Чатыры курганы аказаліся без слядоў пахаванняў, але ў трох з іх знойдзены валуны на мацерыку. Адзін курган быў з пахаваннем па абраду трупапалажэння на грунце (мужчынскае, арыентавана на паўночны захад). Пахавальны інвентар пры трупаспаленнях: нажы, шкляныя пацеркі (лімонкі, раннія вочкападобныя, рыфленыя блакітныя), ланцужкі і ланцугатрымальнікі, трапецападобныя падвескі, ліраподобныя спражкі,

падковападобная фібула са спіральнымі канцамі, жалезныя і бронзавыя спражкі, ляпны і кругавы посуд. У кургане з трупапалажэннем знойдзены сякера, наканечнік кап'я, нож, драцяны бранзалет, на поясе былі дзве грушападобныя бразготкі, а каля ног — кругавы арнаментаваны гаршчок. Могільнік каля Усця можна датаваць IX—XI стст. Гэта самы заходні помнік, які паказвае крывіцкае пранікненне ў асяроддзе мясцовага насельніцтва, адлюстроўвае працэс асіміляцыі балтаў славянамі на ўскраіне Полацкага княства.




*Рыс. 10. Бранзалеты з курганнага могільніка каля в. Укля*

Курганы астатніх мікрарэгіёнаў адносяцца да больш позняга часу, і там пераважаюць трупапалажэнні. Па абраду пахаванняў і характару знаходак, нягледзячы на раздзяленне Заходняй Дзвіной, найбольш блізкія паміж сабой дзісенская і асвейская групы. Тут для жаночых комплексаў характэрны бранзалетападобныя скроневыя кольцы, шчытковыя пярсцёнкі, шкляныя пацеркі. Мужчынскія пахаванні малаінвентарныя ці зусім безынвентарныя. Асаблівасцю асвейскага мікрарэгіёна з'яўляюцца пласцінчатыя бранзалеты з геаметрычным арнаментам. Дзісенскі мікрарэгіён вылучаецца вялікай колькасцю нажоў і калачападобных крэсіваў. Зааморфных бранзалетаў няма ў асвейскай групе, але яны ёсць у дзісенскай. Для абедзвюх груп зброя не характэрна, за выключэннем аднаго пахавання ў Дзянісенках (Асвейскі мікрарэгіён).

Курганы браслаўска-міёрскай групы характарызуюцца наяўнасцю зброі, а таксама мужчынскімі пахаваннямі са шматлікім інвентаром. Для жаночых і мужчынскіх пахаванняў характэрны падкovападобныя фібулы са спіральнымі канцамі, а таксама грушападобныя бразготкі. Сярод раскапаных курганоў няма ніводнага пахавання ў яме. Комплексы жаночых упрыгожанняў маюць рэчы ад славянскага і балцкага касцюмаў. Асабліва выразна гэта прасочваецца ў пахавальным інвентары курганнага могільніка каля в. Лясная. Напрыклад, у адным з пахаванняў знойдзены блізкія да балцкіх бранзалеты з зааморфнымі канцамі, шыйная грыўня з петлепадобнымі канцамі і бурштынавыя пацеркі, да славянскіх — лімонкападобныя, бітрапецоідныя, вочкападобныя і рабрыстыя пацеркі. Нябожчыца была пакладзена галавой на ўсход. Для курганнага могільніка ў Лясной характэрна наяўнасць каменных абкладак і выбрукоўак[16] (рыс. 11, 12).

Нягледзячы на агульныя рысы курганных груп розных мікрарэгіёнаў, кожная з іх мае свае асаблівасці. Напрыклад, рэзка адрозніваецца абрад пахавання ў сінхронных, блізка размешчаных могільніках (Лісна, Абрамава і Зашчырына). У Лісне і Абрамаве пахаванні былі ў падкурганных ямах, а ў Зашчырыне — на гарызонце. Цікавасць уяўляе і суседства курганоў у Лясной і Кублішчыне. У Лясной у большасці насыпаў зафіксаваны каменныя абкладкі. Гэты помнік характарызуецца таксама багаццем паха-




*Рыс. 11. Выбрукоўкі ў курганах каля в. Лясная (1— спіралепадобная пранізка з кургана № 2; 2— падкоўападобная фібула з кургана № 16)*




*Рыс. 12. Выбрукоўкі ў курганах каля в. Лясная (курган № 22: 1— нож; 2— пярсцёнак з дроту; 3— медны дрот; 4, 5— скроневыя кольцы; курган № 27: 1— сіняя зонная пацерка; 2— пацерка-лімонка; 3, 4— спіральныя пранізкі; 5— фрагменты ляпнога посуду)*

вальнага інвентару. У той жа час курганы ў Кублішчыне вызначаюцца беднасцю інвентару.

У агульным жа пахавальныя помнікі даследаванага рэгіёна блізкія да кургаиоў Себежскага Паазер'я [17] і да кургаиоў ваколіц Полацка [18]. Вылучаныя чатыры мікрарэгіёны хутчэй за ўсё трэба звязваць з характарам засялення славянамі Падзвіння. Па наяўнаму матэрыялу можна папярэдне акрэсліць шляхі славянскай каланізацыі на паўночным захадзе Беларусі. Зыходзячы з датавання кургаиоў, ёсць падставы меркаваць, што першапачатковае прасоўванне славян ішло па левабярэжжы Заходняй Дзвіны, а на правабярэжжа яны прыйшлі пазней. Першая хваля славянскага рассялення адносіцца да часу не раней VII—VIII стст. Прычым гэта былі носьбіты культуры доўгіх кургаиоў, якая ўжо склалася. Нядаўнімі даследаваннямі У. В. Енукова ўстаноўлена сувязь опсаўскай керамікі з керамікай тыпу культуры смаленскіх доўгіх кургаиоў [19]. Славяне ўклініліся на тэрыторыю сучаснага стыку Беларусі, Латвіі і Літвы. Такая думка ўжо выказвалася Е. Ахманьскім [20]. Магчыма, прасоўванне славян ішло з боку Пскоўшчыны, але для канчатковага вырашэння пытання неабходна больш дэталёвае вывучэнне пахавальных помнікаў ва Усходняй Латвіі, дзе вядомы 23 могільнікі аднachасова з доўгімі, падоўжанымі і круглымі ў плане насыпамі. Гэтыя помнікі сканцэнтраваны ў асноўным на стыку граніц РСФСР, БССР і ЛатвССР [21].

На тэрыторыі Браслаўскага раёна ўсходнелітоўскіх пахаванняў не знойдзена*. Гэта дазваляе меркаваць аб маланаселенасці гэтай часткі рэгіёна ў часы першай хвалі славянскай каланізацыі, што хутчэй за ўсё і дало магчымасць славянам прасунуцца так далёка ў балцкае асяроддзе

* У VI—XII стст. ва Усходняй Літве быў распаўсюджаны абрад трупаспалення. Пад адным насыпам звычайна знаходзяць больш аднаго пахавання. Для мужчынскіх пахаванняў характэрныя зброя, умбоны ад шчытоў, шпоры, вузкалязовыя сякеры, наканечнікі коп'яў, упрыгожанні, а для жаночых — шылы, бранзалеты, шыйныя грыўні, шпількі. Посуд не характэрны. Часта побач з нябожчыкам хавалі каня, бывала спаленага. Сустракаюцца асобныя пахаванні коней.

(Опса, Вусце, Богіна, Рацкі Бор). Усе вывучаныя курганныя могільнікі на захадзе і поўдні (Пастаўскі раён БССР, Зарасайскі і Швянчонскі раёны ЛітССР) маюць усходнелітоўскі характар. Гэта дазваляе сцвярджаць, што славянскае рассяленне было прыпынена ў заходняй частцы сучаснага Браслаўскага раёна.

Трэба ўлічваць таксама наступнае. Калі насельніцтва тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна межавала з літоўскімі плямёнамі, якія ў той час хавалі нябожчыкаў у курганах, то крывічы, што жылі на тэрыторыі сучаснага Верхнядзвінскага раёна, з'яўляліся суседзямі латгалаў, для якіх былі характэрны пахаванні ў грунтавых могільніках. Нягледзячы на суседства латгалаў, тут не знойдзена ніводнага манжэтападобнага бранзалета, аўдзінэ і іншых рэчаў, дамінуючых у сінхронных, добра вывучаных латгальскіх помніках накшталт Нукшынскага і Люцынскага*.

У той жа час на тэрыторыі Усходняй Латвіі вядомы курганныя могільнікі канца I — пачатку II тысячагоддзя, інвентар якіх ідэнтычны з інвентаром з грунтавых латгальскіх могільнікаў[22]. Ёсць звесткі і аб больш ранніх курганах[23].

Такім чынам, разгляд пахавальных помнікаў паўночна-заходняй Беларусі паказвае, што гэту тэрыторыю ў VII—XII стст. насялялі славяне, якія засвоілі элементы балцкай культуры,— крывічы. Асабліва добра гэта прасочваецца на ўпрыгожаннях. З. М. Сяргеева прыйшла да вываду, што частка балцкіх упрыгожанняў запазычана ад карэннага балцкага насельніцтва, частка трапіла дзякуючы сувязям з суседнімі прыбалтыйскімі плямёнамі, а некаторыя былі зроблены на месцы пад уплывам прыбалтыйскіх узораў[24].

Ступень узаемаўплыву ўсходнепрыбалтыйскіх плямёнаў і славян была рознай. На балцка-славянскае аблічча пахаваных указваюць таксама антрапалагічныя даныя. Адзінаццаць чарапоў з раскопак у Лясной, Кублішчыне, Кузьмаўшчыне былі вывучаны І. У. Чаквіным (ІМЭФ АН БССР). Сярод іх адзін брахікранны, тры мезакранныя, астатнія долікранныя. Чарапы маюць краніялагічныя рысы як балтаў, так і славян. Па апошніх даных даследавання чарапоў, пераважае іх блізкасць да марфалагічнага аблічча паўднёвай групы палачанска-дрыгавіцкага сумежжа, чым да латгалаў[25].

Цікавасць уяўляюць і даныя тапанімікі. На паўночным захадзе Беларусі сустракаюцца тапонімы тыпу Крывічы, Крывічаны і г. д. Е. Ахманьскі ў выніку вывучэння шэрагу крыніц прыйшоў да вываду, што назвы тыпу «Крывічы» з'явіліся не раней VII—VIII стст.[26] Ад часоў славянскага рассялення, пэўна, захаваліся і тапонімы тыпу Латышы, Літоўшчына, Лівы і т. п.

Разглядаючы пахавальныя помнікі Сярэдняга Падзвіння, варта адзначыць цікавую гіпотэзу, выказаную Д. А. Мачынскім адносна ўпамянутай у «Аповесці мінулых часоў» наромы (наровы). Грунтуючыся на даных тапанімікі (тапонімы Нарова, Наравец, Няроўка, Нарва і інш.), аўтар прыйшоў да высновы, што летапісная нарова жыла на ўсход адліваў, і змясціў яе ў вобласць басейна р. Вялікай і Усходняга Прычуддзя. На скла-

---

* У 1987 г. каля в. Казлоўцы Міёрскага раёна ў час распрацоўкі кар'ера выяўлены грунтавы могільнік канца I— пачатку II тысячагоддзя. Пры гэтым знойдзены бранзалетападобныя скроневыя сярэбраныя кольцы, шкляныя пацеркі, утульчатыя наканечнікі коп'яў, шырокасярэдзінныя пярсцёнкі, падобныя да курганных знаходак паўночнага захаду Беларусі. Ёсць шэраг прыбалтыйскіх вырабаў: спіральны змеепадобны пярсцёнак, вітая шыйная грыўня з гранёнымі канцамі, зааморфныя бранзалеты. Знойдзены таксама тры медныя дырхемы-падвескі і трохпацеркавыя зярнёныя сярэбраныя скроневыя кольцы (рыс. 13).




*Рыс. 13. Знаходкі з кар'ера на месцы грунтавога могільніка каля в. Казлоўцы Міёрскага раёна*

дзенай ім карце тэрыторыя Сярэдняга Падзвіння ўключана ў зону доўгіх курганоў неўстаноўленай культурнай прыналежнасці. На думку Д. А. Мачынскага, нарова ўяўляла сабой этнагрупу, якая рана страціла самастойнасць [27].

У сувязі з адзначаным важна заўважыць, што менавіта ў Падзвінні зафіксаваны тапонімы Наровы, Наруці (2), Нарушова (2), Нурава і г. д.[28] Акрамя таго, вядома, што рачныя парогі на Заходняй Дзвіне каля г. Дзісны называліся «Нароўскія парогі» [29]. Усё гэта цікавыя дапаўненні да гіпотэзы Д. А. Мачынскага.

### 2. ПАСЕЛІШЧЫ

На тэрыторыі беларуска-літоўска-латышскага сумежжа ў XI — XIII стст. існавалі своеасаблівыя ўмацаваныя паселішчы — Браслаў, Маскавічы, Рацюнкі, Дрысвяты і Прунікі (рыс. 14).

Найбольш вывучана гарадзішча ў Маскавічах (Маскаўцах)*, якое знаходзіцца ў трохстах метрах на поўдзень ад вёскі (рыс. 15). Марэнны ўзгорак, на якім узнікла паселішча, размешчаны на ўсходнім беразе воз. Дзерба, што ўваходзіць у сістэму Браслаўскіх азёр і злучаецца Друйкай з Заходняй Дзвіной. Вышыня гарадзішча 18 м. Яго пляцоўка займае 1 га. З паўночнага і ўсходняга бакоў знаходзіцца балоцістая нізіна, з паўднёвага — плаўны схіл, а з заходняга — абрыў да возера. Пляцоўка і схілы гарадзішча доўгія гады разворваліся, што прывяло да нівеліроўкі ўмацаванняў і парушэння стратыграфіі.

На пляцоўцы і схілах гарадзішча ўскрыта плошча каля 2,5 тыс. м². Магутнасць культурнага пласта цёмна-карычневага, месцамі амаль чорнага колеру вагаецца ад 0,2 да 1,2 м. У цэнтры, на паўднёвым і ўсходнім схілах таўшчыня яго ад 0,2 да 0,3 м, на паўночным — да 0,6, а на заходнім месцамі дасягае 1,2 м. Культурны слой неаднолькавы. Для яго характэрны пясчана-вугальныя праслойкі, праслойкі пяску, гліны, шэрай зямлі і суглінку. Сустракаюцца дробныя і сярэдняй велічыні камяні. Масавы матэрыял прадстаўлены керамікай, касцямі жывёл, птушак, рыб і кавалкамі глінянай абмазкі. Выяўлена каля сотні фрагментаў ляпнога посуду, якія ў асноўным адносяцца да культуры штрыхаванай керамікі і да позняга этапу днепра-дзвінскай культуры. Асноўная маса керамікі адносіцца да старажытнарускага часу. За выключэннем некалькіх гліняных праселкаў, усе індывідуальныя знаходкі таксама датуюцца часам Кіеўскай дзяржавы.

Рэшткі дрэва не захаваліся, але зафіксаваны сляды згарэлых бярвенняў і дошак. Мацярык уяўляе сабой пясок жоўтага колеру і ўтрымлівае вялікую колькасць ямаў розных памераў. Запаўненне ямаў было з культурнага слоя, у якім знойдзены тыя ж знаходкі, што і ў верхніх культурных пластах. Мяркуючы па профілю раскопаў (рыс. 16) і характару мацерыка, жытлы былі наземнымі, зрубнымі, у плане па форме блізкімі да квадрата. Шматлікія кавалачкі глінянай абмазкі паказваюць, што пабудовы ўзводзіліся з круглых і абчасаных бярвенняў. Пад глінабітнай ці зробленай з дошак падлогай знаходзіліся пясчаныя падсыпкі і гліняныя падмазкі. Выяўленая вялікая колькасць гліны дазваляе меркаваць аб наяўнасці глінабітных печак. Адразу ж пад дзёрнам знойдзены рэшткі адной

---

* Упершыню помнік апісаны Ф. В. Пакроўскім. У 30-я гады ён абследаваўся А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовічам, у 1955 г. — Л. В. Аляксеевым, у 1972 г. — М. М. Чарняўскім, у 1976 — 1988 гг. раскопкі праводзіліся аўтарам.

амаль цэлай печы памерам 1 × 0,6 м і вышынёй 0,4 м. Пры расчыстцы яе пода выяўлена вуголле, фрагменты керамікі і бронзавы шырокасярэдзінны бранзалет. Побач змяшчалася яма глыбінёй 0,6 м і дыяметрам 1 м.

З боку возера зроблены дзве прарэзкі схілу траншэямі шырынёй да 1 м. Удалося ўстанавіць, што ўмацаванні ўзводзіліся пасля нівеліроўкі ўзгорка пяском і глінай не раней XI ст. Адзначаны сляды пад-




*Рыс. 14. Планы гарадзішчаў: 1 — Пруднікі (па А. Р. Мітрафанаву); 2 — Браслаў (па Л. В. Аляксееву); 3 — Дрысвяты (па Л. В. Аляксееву); 4 — Рацюнкі (па Л. У. Дучыц); 5 — Гарадзец (па Г. В. Штыхаву); 6 — Маскавічы (па Л. У. Дучыц)*




*Рыс. 15. План гарадзішча Маскавічы з абазначэннем ускрытай плошчы: I — падводны раскоп; II — раскоп 2; III — раскоп 3; IV — раскоп 4; V — раскоп 5*

сыпкі ў выглядзе дапаўняючага пясчанага насыпу (рыс. 17). Пры прарэзцы схілу выяўлены кавалкі глінянай абмазкі, кераміка і шэраг рэчаў — ключы, замкі, шыферныя праселкі, шкляныя бранзалеты і інш.

Аб мікратапаграфіі Маскавіцкага паселішча ўяўленне дае дэшыфроўка К. В. Шышкіным (Інстытут археалогіі АН СССР) аэрафотаздымка (рыс. 18), якая сведчыць аб цеснай забудове паселішча. Прычым на пляцоўцы забудова кучавая, а ўздоўж берагавой лініі — вулічная. Сляды пабудоў выяўлены і каля паўднёвага падножжа гарадзішча.

Браслаўскае гарадзішча знаходзіцца ў цэнтры г. Браслава, на перашыйку паміж азёрамі Дрывяты і Навяты, і займае плошчу 3 га. Вышыня гарадзішча ад падножжа 20 м. Пляцоўка (200 $\times$ 100 м) з усіх бакоў акружана валам, шырыня якога 3 — 4 м, а на паўночным захадзе да 9 м. Раскопкі праводзіліся Л. В. Аляксеевым у 1955 — 1956 гг. Ускрыта 400 м$^2$, а таксама зроблена прарэзка вала трохметровай траншэяй. Таўшчыня культурнага слоя ад 0,2 да 1,6 м (каля вала). На Браслаўскім гарадзішчы вылучаюцца тры слоі: трэцяй чвэрці I тысячагоддзя, эпохі Кіеўскай Русі і перыяду Вялікага княства Літоўскага. Захаваліся рэшткі двух пабудоў старажытнарускага часу. Вянец хаты (4 $\times$ 4 м) рублены ў «абло». Вуглы яго апіраліся на невялікія камяні-крэслы, а падлога была са шчыльна ўтрамбаванай гліны. Печка знаходзілася ў паўночнай частцы памяшкання. Пад хатай выяўлены рэшткі абгарэлых дошак падлогі больш ранняга збудавання, загінуўшага ад

пажару. Ад другой пабудовы захаваліся сляды бярвенняў ніжняга вянца. Памеры зруба (даўжыня паўночна-заходняй сценкі 2,2 м) і адсутнасць печкі дазволілі Л. В. Аляксееву меркаваць аб гаспадарчым прызначэнні гэтай пабудовы[30].

Дрысвяцкае гарадзішча (плошча 1 га) размешчана на ўзгорку, на востраве возера з той жа назвай і мае ў плане амаль авальную форму. Вышыня ад падножжа 15 м. Пляцоўка з усіх бакоў умацавана валам вышынёй ад 6 да 9 м. Раскопкі праводзіліся М. А. Ткачовым у 1976 і 1980 гг. Ускрыта плошча 800 м². Таўшчыня культурнага слоя 0,6 — 0,8 м. Вылучаны тры слоі: культуры штрыхаванай керамікі, эпохі Кіеўскай Русі і перыяду Вялікага княства Літоўскага. Каля




*Рыс. 16. Профілі раскопаў на гарадзішчы Маскавічы*




Рыс. 17. Разрэз схілу на гарадзішчы Маскавічы




*Рыс. 18. Дэшыфраваны аэрафотаздымак гарадзішча Маскавічы*

гарадзішча адзначаны сляды пасада, які існаваў ад эпохі ранняга жалезнага веку да самага позняга сярэдневякоўя[31].

Гарадзішча Пруднікі (плошча 1 га) знаходзіцца ў васьмістах метрах на захад ад вёскі, на крутым узгорку, размешчаным на левым беразе р. Вяты (прыток Заходняй Дзвіны). Вышыня гарадзішча 18 м. Пляцоўка няправільнай авальнай формы выцягнута па лініі поўнач — поўдзень. З паўднёва-заходняга боку маецца вал вышынёй да 3 м. З 1977 г. раскопкі на помніку вядзе В. І. Шадыра. Таўшчыня выяўленага культурнага слоя ад 0,3 да 3 м. Гарадзішча трохслойнае: ранні жалезны век, эпоха Кіеўскай Русі і часоў Вялікага княства Літоўскага. Да гарадзішча прымыкае селішча II — пачатку XI ст.[32]

Гарадзішча Рацюнкі (плошча 0,2 га) размешчана на паўднёвай ускраіне вёскі. Вышыня 10 м. Пляцоўка круглая, дыяметрам 45 м. Валоў і равоў няма. Схілы пакатыя, за выключэннем крутога паўночнага. З паўднёва-заходняга боку знаходзіцца балоцістае месца. Раскопкі праводзіліся аўтарам у 1978, 1979 і 1981 гг. Ускрыта 236 м$^2$. Таўшчыня культурнага слоя чорнага колеру 0,4 — 1 м. Сустракаюцца ўкрапіны пяску, гліны і дробныя камяні. Вылучаюцца два слоі — культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай, а таксама старажытнарускі. З паўночнага боку помніка траншэяй была зроблена прарэзка схілу. Знойдзены рэшткі ўмацаванняў у выглядзе вялікай колькасці вугалля і абпаленых бярвенняў. Зафіксаваны дзве пясчаныя падсыпкі, паміж якімі выяўлены слой пажарышча. З паўднёвага боку каля гарадзішча адзначаны сляды селішча другой паловы І тысячагоддзя.

Па суседству з даследаваным аўтарам рэгіёнам вывучаліся гарадзішчы каля в. Гарадзец Шаркаўшчынскага раёна і в. Свіла І Глыбоцкага раёна. Гарадзішча Гарадзец (плошча 1 га) размешчана на правым

беразе р. Мнюты (правы прыток Дзісны). Вышыня над узроўнем ракі 20 м. Пляцоўка ў плане трохвугольнай формы з бакамі 100 × 110 м. З паўночнага боку вал даўжынёй 100 м і вышынёй 5 м. У 1972 г. помнік абследаваў Я. Г. Звяруга і выказаў меркаванне аб магчымасці суаднясення яго з летапісным Гарадцом Полацкага княства. У 1973 і 1978 гг. раскопкі праводзіліся Г. В. Штыхавым. Ускрыта 108 $м^2$. Таўшчыня культурнага слоя шэрага колеру 0,3 — 0,7 м. У мацерыку выяўлены шматлікія ямы. Вылучаюцца тры слоі: раннеславянскі (VIII — IX стст.), старажытнарускі (X — першая палова XI ст.), перыяду Вялікага княства Літоўскага. Росквіт жыцця на паселішчы прыпадае на X — першую палову XI ст. З мэтай вывучэння абарончых збудаванняў на гарадзішчы была зроблена прарэзка вала. Адзначаны рэшткі падсыпкі і некалькіх абпаленых бярвенняў. Першапачатковае ўзвядзенне ўмацаванняў аднесена даследчыкам да VIII — IX стст.[33]

Гарадзішча каля в. Свіла I (плошча 1 га) мае авальную форму. Вышыня яго ад падножжа 15 м. Пляцоўка акружана трыма кальцавымі валамі і двума равамі. У 1974 г. раскопкі праводзіў А. Р. Мітрафанаў. Ускрыта плошча 168 $м^2$. Знойдзены жалезны двухшыпны наканечнік стралы, два бранзалетападобныя скроневыя кольцы з дроту, яма для збожжа і гаршчок з зернем азімага жыта. Даследчык датаваў паселішча VIII—IX стст.[34] Акрамя апісаных помнікаў вядомы таксама гарадзішчы са старажытнарускім слоем каля в. Межава Расонскага раёна[35].

Па літаратурных даных, можна дапусціць існаванне яшчэ некалькіх умацаваных паселішчаў, але яны пакуль што не лакалізаваны. Напрыклад, у «Спіску рускіх гарадоў дальніх і бліжэйшых» у ліку літоўскіх гарадоў упамінаецца горад Алешаск[36]. М. Любаўскі адзначае, што паселішчы ці ўрочышчы з найменнем Алешаск яму знайсці не ўдалося. Тым не менш у яго працы гаворыцца: «... У Браслаўскім павеце ў *Алескай* воласці Угорскага стану...», а таксама: «...У склад Браслаўскага павету, акрамя таго, уваходзіў вялікакняжаскі двор Опса з воласцю *Алескаю,* аддадзены ў 1300 годзе аднаму са смаленскіх князёў...»[37]

Зыходзячы з вышэйапісанага, можна дапусціць,што ў старажытнасці нейкі пункт Алеск (Алешаск) існаваў у раёне в. Опса ці былой в. Угор на беразе воз. Богінскага на тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна.

Сярод сугучных з назвай Алешаск тапонімаў у кнізе «Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці»[38] ў паўночна-заходніх раёнах Беларусі вядомы Алешына (Пастаўскі раён), Алешыцы (Міёрскі раён), Альшаны (Браслаўскі раён), Альшанкі (Верхнядзвінскі раён), Ольшчына (Глыбоцкі раён). Але пакуль што размову можна весці толькі аб сямі гарадзішчах, на якіх праводзіліся раскопкі: Браславе, Маскавічах, Дрысвятах, Прудніках, Рацюнках, Свіле I і Гарадцы.

У навуковай літаратуры звычайна ўжываецца класіфікацыя гарадзішчаў па іх месцазнаходжанню адносна рэльефу мясцовасці[39]. Па гэтай адзнацы гарадзішчы Гарадзец і Дрысвяты адносяцца да мысавых гарадзішчаў, а астатнія — да ўзгоркавых. У плане ўсе гарадзішчы адпавядаюць натуральнай форме ўзгоркаў. У дадзеным выпадку дапушчальнай з'яўляецца класіфікацыя гарадзішчаў па памерах пляцоўкі, у адпаведнасці з якой умацаваныя паселішчы можна падзяліць на вялікія (звыш 1 га), сярэднія (каля 1 га) і малыя (менш за 1 га). Да вялікіх адносяцца Браслаў (3 га), да сярэдніх — Маскавічы, Дрысвяты, Пруднікі, Гарадзец, Свіла I і да малых — Рацюнкі (0, 2 га).

Жыццё на большасці гарадзішчаў узнікла ў раннім жалезным веку.

На гарадзішчы Гарадзец жыццё квітнела ў X — першай палове XI ст. Гарадзішча Свіла I узнікла ў VIII ст. і існавала да канца IX ст. На ўсіх астатніх паселішчах росквіт жыцця быў у XI — XIII стст.

Сельскія паселішчы эпохі Полацкага княства ў Сярэднім Падзвінні амаль не вывучаліся. Маюцца звесткі аб існаванні неўмацаваных паселішчаў, якія спадарожнічалі ўмацаванням у Дрысвятах, Прудніках, і невялічкага паселішча ў Маскавічах. Селішчы вядомы таксама каля в. Пашавічы Браслаўскага[40] і в. Ігналіна Верхнядзвінскага раёнаў[41].

Некаторыя ўяўленні аб сельскіх паселішчах можна атрымаць пры вывучэнні курганных могільнікаў. Назваць лічбу паселішчаў па курганных групах цяжка, таму што часта ў адным могільніку хавалі нябожчыкаў адразу з некалькіх вёсак. Акрамя таго, частка курганных груп не захавалася да нашага часу. Курганныя матэрыялы сведчаць аб складаным этнасе, сацыяльнай дыферэнцыяцыі вёскі, а таксама аб актыўным удзеле сельскага насельніцтва ў гандлі. Адрозненне насельніцтва вёскі ад жыхароў умацаваных пунктаў дазваляе меркаваць, што насельніцтва фарпостаў Полацкага княства на яго паўночна-заходніх рубяжах фарміравалася ў асноўным за кошт выхадцаў з далёкіх зямель, а не з навакольных вёсак.

Пакуль найбольш поўныя даныя маюцца аб Маскавічах. Як адзначалася, дэшыфраваны аэрафотаздымак паказаў забудову ўздоўж прыбярэжнай часткі воз. Дзерба. На беразе возера каля падножжа гарадзішча ўскрыта плошча 16 м$^2$. Таўшчыня культурнага слоя тут 0,2 — 0,3 м. Выяўлены сляды абпаленых бярвенняў ад вугла пабудовы і выбрукоўка. Рэчавыя знаходкі прадстаўлены нажом, абломкамі жалезных вырабаў, бронзавай падвескай-качачкай і керамікай XII — XIII стст. На поўдзень ад гарадзішча, на полі, якое разворваецца, было закладзена 10 шурфаў. Таўшчыня культурнага слоя тут ад 0,1 да 0,4 м. Знойдзены фрагменты керамікі і жалезныя рэчы, сінхронныя знаходкам на гарадзішчы. Выяўлены таксама кавалкі глінянай абмазкі.

Яшчэ ў першыя гады даследаванняў у Маскавічах было адзначана, што пастаянна з воз. Дзерба на бераг вымываюцца рэчы XI — XIII стст. Гэтыя даныя і вынікі дэшыфроўкі аэрафотаздымка, якія фіксуюць пабудовы ўздоўж берага, дазваляюць меркаваць, што частка паселішча магла аказацца затопленай. З даных азёразнаўцаў вынікае, што ўзровень вады ў воз. Дзерба значна павысіўся пасля правядзення ў 1930—1935 гг. меліярацыйных работ у даліне р. Друйкі і пасля пабудовы ў 1955 г. на гэтай рацэ Чарневіцкай ГЭС. Донныя адклады ў воз. Дзерба прадстаўлены шчыльнай азёрнай глінай, гліністым глеем, заглееным пяском і сапрапелем з ракавінамі малюскаў[42].

Аквалангістамі ў ходзе візуальнага абследавання дна возера выяўлена, што на ўсёй прылягаючай да берага акваторыі на пясчаных водмелях сустракаюцца фрагменты керамікі, косці жывёл, кавалкі глінянай абмазкі і вуголле. Знойдзены таксама бронзавыя ўпрыгожанні: бранзалет з незамкнёнымі звужанымі канцамі, пярсцёнак-пячатка і кальцо з незамкнёнымі канцамі. У некалькіх месцах каля берага адзначаны ўчасткі з выбрукоўкамі. У найбольш перспектыўных для даследавання месцах, выяўленых пры візуальным абследаванні, на адлегласці 20 — 30 м ад берага былі закладзены 4 шурфы памерам 1×1 м, а ў 10 м ад берага — падводны раскоп плошчай 60 м$^2$. Глыбіня вады ў месцах даследавання ў летні час звычайна 2—3 м. Устаноўлена, што амаль на ўсёй акваторыі пад слоем сапрапелю ў заглееным пяску сустракаюцца вуголле, фрагменты керамікі,

рэчы старажытнарускага часу і шматлікія косці жывёл. У адным з шурфаў пад слоем сапрапелю зафіксаваны слой вугалля таўшчынёй 0,1 м.

У час гідраархеалагічных раскопак і шурфоўкі было паднята звыш тысячы фрагментаў керамікі і больш за 300 касцей жывёл, а таксама розныя рэчы XI—XIII стст. — шыферныя праселкі, шкляныя пацеркі і бранзалеты, нажы, цыліндрычныя замкі і інш. (рыс. 19). Па вызначэнню В. В. Шчагловай, косці належаць 8 відам жывёл: каню, хатняму быку, буйному быку, хатняй свінні, дзіку, ласю, сабаку і выдры.

У сувязі з пытаннем аб сельскіх неўмацаваных паселішчах цікавасць уяўляюць даныя тапанімікі. На тэрыторыі Старажытнай Русі добра вядомы тапонімы тыпу Княжына, Княжыцы, Княжае і г. д. Звычайна даследчыкі атаясамліваюць іх з феадальнымі замкамі ці княжацкімі сёламі[43]. Падобныя назвы населеных пунктаў ёсць і на даследаванай тэрыторыі. Гэта в. Княжына Браслаўскага раёна, вёскі Князева і Княжыцы Верхнядзвінскага раёна. У в. Княжыцы знаходзіцца гарадзішча, якое пакуль не вывучалася. У Верхнядзвінскім раёне каля в. Красова ёсць урочышча Княжына Гара і г. д.

Заслугоўваюць увагі таксама і тапонімы Крывічы і Русакі. Е. Ахманьскі, як адзначалася, лічыць, што першыя з'явіліся ў VII—XIII стст., другія — у XIII—XIV стст.[44]

У атласе Н. І. Паўлішчава на карце «Русь у 1054 годзе пры Яраславе Вялікім» на правым беразе Заходняй Дзвіны, прыблізна паміж Друяй і Полацкам, адзначаны пункт Пераслаў[45]. У наш час на левым беразе Заходняй Дзвіны існуюць тры вёскі з сугучнымі назвамі. Гэта Пераслаў, Пераслоўе і Пераслова ў Міёрскім раёне[46]. Усе названыя пункты лакалізуюцца паміж Друяй і Полацкам. З гэтага вынікае, што, магчыма, у гэтым раёне існавала паселішча яшчэ ў старажытнарускі час, але археалагічна яно пакуль што не выяўлена.

Акрамя апісаных помнікаў неабходна адзначыць гарады Сярэдняга Падзвіння — Друю, Дрысу і Дзісну, першыя звесткі аб якіх вядомы па пісьмовых крыніцах XIV—XV стст. Але паколькі яны ў гэтыя часы ўжо трапілі на старонкі летапісаў, то, магчыма, існавалі і раней. Друя і Дрыса ўпамінаюцца ў 1386 г. у хроніцы М. Стрыйкоўскага ў ліку ўладанняў полацкага князя Андрэя Альгердавіча[47]. Прынята лічыць, што першае ўпамінанне аб Дзісне прыводзіць «Літоўская метрыка» (1461), дзе гаворыцца: «... А судил сам король в Диснах»[48]. Думка аб тым, што гэтыя гарады існавалі значна раней, неаднаразова выказвалася ў друку[49]. Вырашыць пытанне аб часе іх узнікнення магчыма толькі з дапамогай археалогіі. У Друі ў 20-х гадах Я. Альхімовічам была зроблена прарэзка нейкага вала (зараз не існуе), які ішоў ад Друйкі да былой плошчы Пятра і Паўла, але вынікі даследаванняў не надрукаваны[50]. Даследаванні 70—80-х гадоў і раскопак 1986 г. далі багаты матэрыял XVI—XVIII стст. Раскоп плошчай 64 м$^2$ быў закладзены на правым беразе р. Друйкі пры яе ўпадзенні ў Заходнюю Дзвіну. Культурны слой дасягае таўшчыні 1,3 м, але ён моцна пашкоджаны пабудовамі XIX—XX стст. У мацерыку выяўлены слупавыя і гаспадарчыя ямы. З ранніх знаходак вылучаюцца тры касцяныя прамавугольныя плоскія грабеньчыкі, ключ ад навяснога замка (тып Д па наўгародскай класіфікацыі) і нешматлікія фрагменты керамікі, што адносяцца да XIV—XV стст. Рэчы, магчыма больш ранняга перыяду, прадстаўлены нажом з асіметрычнымі выступамі каля чаранка, чарашковым бранябойным наканечнікам стралы (агульная даўжыня 83 мм, даўжыня пяра 53 і шырыня 12 мм), а таксама некалькімі




*Рыс. 19. Знаходкі з воз. Дзерба каля гарадзішча Маскавічы: 1 — манетападобная падвеска; 2 — фрагмент шклянога бранзалета; 3 — фрагмент шклянога пярсцёнка; 4, 5, 6 — спіральныя пранізкі; 7 — пярсцёнак; 8 — фрагмент пярсцёнка; 9 — дробны выраб з дроту; 10 — бранзалет; 11 — шыфернае праселка; 12 — дэталь ад дужкі цыліндрычнага замка; 13 — жалезнае звяно ланцуга; 14 — выраб з косці; 15 — нож; 16 — жалезны выраб; 17 — долата; 18 — касцяная праколка; 19 — асялок*

3. Зак. 1363

фрагментамі венчыкаў начыння, якое характэрна для Полацка XII—XIV стст.[51]

У Дзісне на пляцоўцы замка, размешчанага на востраве Заходняй Дзвіны, знойдзена кераміка XI ст.[52] Акрамя таго, у літаратуры ёсць звесткі аб знаходках каля Дзісны рэчаў эпохі Кіеўскай Русі. Напрыклад, упамінаюцца курганы, якія існавалі на беразе р. Дзісны, і паведамляецца, што скарбашукальнікі знаходзілі там бронзавыя пярсцёнкі, зааморфныя бранзалеты, шыйныя грыўні, розныя жалезныя рэчы[53]. Мяркуючы па апісаннях, яны адносяцца да XI — XII стст. Па даных Л. Д. Побаля, у Варшаўскім гістарычным музеі захоўваюцца фрагменты ляпнога посуду і абломак бронзавай шыйнай грыўні, перададзеныя з Дзісны[54]. Ёсць звесткі і аб знаходках каля Дзісны ў 1914 г. пярсцёнкаў-пячатак з выявамі княжацкіх знакаў і надпісаў[55].

У сувязі з пытаннем адносна часу ўзнікнення падзвінскіх гарадоў варта нагадаць аб манументальных помніках эпіграфікі XII ст. — «Барысавых камянях» у рэчышчы Заходняй Дзвіны. Тры з іх вядомы каля г. Дзісны, адзін у Друі і адзін каля Полацка[56].

Асаблівую цікавасць уяўляюць назвы мясцовасцей Стары замак. У Друі гэта левабярэжжа р. Друйкі[57]. У Хроніцы Германа Вартберга (XVI ст.) упамінаецца ў 11 мілях ад Дынабурга ўверх па Дзвіне Новы замак. Улічваючы, што адна нямецкая міля раўняецца прыблізна 5 км, упамянуты Новы замак можна лакалізаваць на месцы сучаснай Друі. Там жа аб ім паведамляецца наступнае: «...У 1373 годзе князь Андрэй Полацкі быў з дружынай перад Дынабургам, дзе захапіў людзей з коньмі і павёў іх з сабой. У адказ на гэта ў 1374 годзе дынабургскі камандор быў са сваімі людзьмі ў Расіі, перад Новым замкам, дзе на замкавым мосце забілі трох рускіх...» і далей: «...У 1377 годзе магістр і ордэнскія чыны павялі ўверх па рацэ Дзвіне вялікае войска да Новага замка рускіх, які ляжыць у 11 мілях за замкам Дынабург. Пасля прыбыцця туды яны паставілі чатыры асадныя машыны, а таксама гукі, але замак узяць не змаглі...»[58]. Такім чынам, калі правабярэжную частку Друі атаясамліваць з Новым замкам XIV ст. (менавіта тут фіксуецца культурны слой XIV ст.), то левабярэжная частка Друі (уласна Друя, ці Стары замак), трэба меркаваць, магла ўзнікнуць значна раней, але археалагічныя раскопкі тут пакуль што не праводзіліся.

З Дзісной у літаратуры звязаны тры ўпамінанні Старога замка. У інвентары г. Дзісны 1667 г. называецца месца Капавішча, дзе быў замак паміж рэкамі Дзвіной і Дзісной[59]. Другі замак пад назвай Стары упамінаецца на левым[60], а трэці — на правым беразе Заходняй Дзвіны[61]. Два апошнія Старыя замкі лакалізаваць не ўдалося.

Менш звестак у літаратуры аб Дрысе. Аўтары публікацый мінулага стагоддзя ўказваюць, што здаўна дрыскі замак знаходзіўся пры ўпадзенні р. Дрысы ў Заходнюю Дзвіну. Таксама паведамляецца, што месца былога замка раскапана і роў засыпаны[62]. У сувязі з пытаннем аб ўзнікненні Дрысы можна прывесці наступны факт. Як вядома, пытанне аб некаторых упамянутых у летапісах гарадах Полацкай зямлі ўжо неаднаразова ўзнімалася ў сувязі з адсутнасцю звестак аб іх месцазнаходжанні. У лік такіх гарадоў уваходзіць і Одрск (ці Адрэск), да якога пасля двух паходаў на Полацк хадзіў Уладзімір Манамах (1078). Выказваліся меркаванні аб месцазнаходжанні Одрска на р. Адроў (правы прыток Дняпра). Нярэдка яго атаясамлівалі з Друцкам, памылкова запісаным Одрэск. Ю. І. Драгун прыйшоў да высновы, што такога горада зусім не існавала[63]. У хроніцы Германа Вартберга ўказваецца,

што «...у 1374 годзе дынабургскі камандор з людзьмі рухаўся сухім шляхам у Расію і калі пакінуў за сабой Дзвіну, то падышлі князі полацкія і одрыскія да замка Дынабург. Князь Андрэй, даведаўшыся аб паходзе камандора, са сваімі людзьмі заспяшаўся ўздагон...»[64] Магчыма, пад одрыскімі князямі тут падразумяваліся дрыскія князі. У XIV — XVI стст. Дрыса, як вядома, належала Полацку[65]. Верагодна, гэта было і раней, таму нельга адмаўляць, што першапачатковая назва Дрысы — Одрыса (Адрэск).

Усе прыведзеныя думкі наконт паходжання Друі, Дзісны і Дрысы яшчэ патрабуюць удакладненняў, якія магчыма будзе зрабіць пасля археалагічнага вывучэння гэтых гарадоў.

*Глава II*

# *МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА І ПЫТАННІ ХРАНАЛОГІІ*

У час раскопак на розных помніках атрыманы значны матэрыял, які з'явіўся факталагічнай базай для разгляду ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл, сацыяльных адносін, гандлёвых сувязей і духоўнай культуры вывучаемага рэгіёна. Асаблівая ўвага пры даследаванні рэчавага матэрыялу звярталася на знаходкі з гарадзішча Маскавічы як найбольш вывучанага помніка. За аснову дыферэнцыяцыі рэчаў прыняты матэрыял, з якога яны зроблены. Рэчы разглядаюцца таксама па функцыянальнаму прызначэнню. У раздзеле, прысвечаным ювелірным вырабам, прыйшлося адысці ад прынятай схемы, бо сплавы, з якіх зроблены ўпрыгожанні, не вывучаліся. Частка старажытнасцей не магла быць сістэматызавана з-за іх фрагментарнасці.

## *1. ВЫРАБЫ З ЖАЛЕЗА, КОСЦІ, КАМЕНЯ І ГЛІНЫ*

**Вырабы з жалеза.** Жалезныя рэчы пры раскопках старажытнарускіх помнікаў з'яўляюцца аднымі з найбольш шматлікіх. Асабліва многа нажоў. Іх знаходзяць практычна на кожным помніку. Найбольш поўна можна характарызаваць нажы з Маскавічаў. У час раскопак тут знойдзена 166 нажоў , з якіх 74 цэлыя. Агульная даўжыня іх 75 — 190 мм, у тым ліку даўжыня чаранка 30—70, шырыня ляза 9—33, таўшчыня спінкі 3—5 мм.

Маюцца таксама даныя для характарыстыкі 10 нажоў з курганоў. 5 з іх знойдзены ў курганах з трупапалажэннямі (1 нож у Усці, 2 у Чарневічах, 1 у Кублішчыне і 1 у Лясной). Нажы ў пахаваннях па абраду трупаспалення розныя па форме і памерах. Агульная даўжыня іх 85—190 мм, у тым ліку чаранка —32—87, шырыня ляза 11—16, таўшчыня спінкі 3—4 мм. Агульная даўжыня цэлых нажоў з курганоў з трупапалажэннем 103 і 150 мм, даўжыня чаранка 33 і 52, шырыня ляза абодвух нажоў 12, таўшчыня спінкі 4 мм. Тыпалагічная класіфікацыя нажоў распрацавана Б. А. Колчыным. У якасці зыходнай прыкметы класіфікацыі прынята адносная палажэнне чаранка і асноўнай часткі і спосаб іх злучэння [1]. Згодна з класіфікацыяй, маскавіцкія нажы можна аднесці да трох тыпаў. Да першага тыпу належаць нажы, якія маюць з боку спінкі плаўны пераход у чаранок, а з боку ляза пераход да чаранка ўяўляе сабой рэзкі ўступ (35 экз.). Да другога тыпу адносяцца нажы з добра выяўленымі ўступамі спінкі і ляза каля чаранка (24 экз.). Трэці тып аб'ядноўвае нажы з плаўным пераходам ляза ў чаранок (21 экз.).

Мяркуючы па крытэрыях храналагічных адрозненняў, распрацаваных Б. А. Колчыным для Ноўгарада, нажы першага тыпу бытавалі

ў X — пачатку XII ст., а другі і трэці тыпы існавалі з другой паловы XII ст., і ў наступныя стагоддзі змяніліся толькі некаторыя элементы іх канструкцыі. Большасць нажоў з Маскавічаў адносіцца да XII — XIII стст.

На гарадзішчы Рацюнкі знойдзены 8 нажоў, сярод якіх 5 цэлыя. Па наўгародскай класіфікацыі, адзін з іх адносіцца да першага тыпу, адзін — да другога і тры — да трэцяга. Вылучаецца нож з доўгім чаранком. Агульная даўжыня яго 180 мм, даўжыня чаранка 95 мм.

*Сякеры.* У эпоху феадалізму сякера была галоўнай прыладай працы і адным з відаў зброі. У пісьмовых крыніцах упамінаюцца сякеры як прыналежнасць князёў, дружыннікаў, гараджан і смердаў. У Маскавічах знойдзены 5 сякер: 3 цэлыя (рыс. 20) і два фрагменты. Памеры цэлых




*Рыс. 20. Прылады працы з гарадзішча Маскавічы: 1 — скобель; 2—4 — свярдзёлкі; 5—7 — лыжачнікі; 8, 9, 10 — сякеры; 11—13 — долаты*

сякер: агульная даўжыня 142, 172 і 170 мм, даўжыня ляза 112, 107 і 62 мм, памеры абушных адтулін 36×32, 36×26 і 38×40 мм. Сякеры знойдзены і ў курганах з трупапалажэннямі: Кузьмаўшчына (1 экз.), Вусце (1 экз.), Рацкі Бор (1 экз.), Заборныя Гумны (2 экз.), Чарневічы (рыс. 6). Вядома і таксама ўжо памянёная сякера з кургана з трупаспаленнем у Уклі. Сякеры датаваны X—XII стст[2].

*Замкі*. 35 замкоў знойдзена на гарадзішчы Маскавічы, 7 замкоў — у воз. Дзерба каля гэтага гарадзішча і адзін замок — на гарадзішчы Рацюнкі. Усе замкі цыліндрычныя з папярочнай ключавой шчылінай, размешчанай у ніжняй частцы цыліндра корпуса. Корпус замка складаец-




*Рыс. 21. Рэчы побыту з гарадзішча Маскавічы: 1—3 — крэсівы; 4 — дэталь лампадкі; 5, 6 — нажніцы; 7—12 — ключы; 13 — дужка ад катла; 14 — дужка ад драйлянага вядра; 5 — вітое кальцо; 16—18 — вастрыё з рухомым кальцом*

ца з вялікага і малога цыліндраў, зробленых з жалезных або медных пласцін. Паверхня цыліндраў упрыгожана хвалістым, лінейным і геаметрычным арнаментам. Такія знаходкі па аналогіі з наўгародскімі адносяцца да XII — XIII стст.

*Ключы* (рыс. 21). 27 ключоў знойдзена на гарадзішчы Маскавічы. Гэта ў большасці ключы ад навясных замкоў. У Рацюнках знойдзены адзін ключ ад унутранага замка. Ёсць ключы ў Браславе і ў кургане каля Чарневічаў. 2 ключы з Маскавічаў, 1 з Браслава і 1 з Чарневічаў адносяцца да тыпу А па наўгародскай класіфікацыі. Гэта лапаткападобныя ключы, якія ўжываліся для кубічных замкоў з падоўжанай ключавой шчылінай. Такі тып замкоў на Русі вядомы з IX ст. да сярэдзіны XIII ст. 14 маскавіцкіх ключоў, па наўгародскай класіфікацыі, адносяцца да тыпу Б. Гэта ключы ад апісаных цыліндрычных замкоў. З'явіліся яны ў пачатку XII ст. і ў першай палове XIV ст. выйшлі з ужывання. Маскавіцкія ключы гэтага тыпу розныя па памерах і па форме адтуліны. Частка ключоў арнаментавана. Адзін экземпляр мае колца для падвешвання. 4 ключы з Маскавічаў адносяцца да тыпу В, датаванне іх — другая палова XII — першая палова XV ст. У канцы XIII ст. з'яўляецца шэраг сістэм унутраных замкоў, у якіх засоў перасоўваўся непасрэдна ключом. Замкі гэтай сістэмы шырока бытавалі ў XIV — XV стст. і дайшлі да сучаснасці [3]. 4 ключы ад такіх замкоў знойдзены ў Маскавічах і адзін у Рацюнках. Астатнія ключы ў фрагментах.

*Крэсівы.* 22 крэсівы налічваюцца ў маскавіцкай калекцыі. Адно калачападобнае крэсіва з язычком знойдзена ў Браславе і адно ў Прудніках. Авальнае кароткае крэсіва выяўлена ў Рацюнках. У пахаваннях, зробленых па абраду трупаспалення, калачападобныя крэсівы з язычком знойдзены ў Богіне (1 экз.) і Опсе (1 экз.). Пры трупапалажэннях было 9 крэсіваў: чатыры ў Чарневічах і па аднаму ў Заборных Гумнах, Кубліпічыне, Лясной, Паддубніках, Рацкім Бары.

Зыходзячы з наўгародскай класіфікацыі, сярод маскавіцкіх крэсіваў вылучаецца 6 відаў: калачападобныя з язычком (5 экз.), калачападобныя без язычка (1 экз.), авальныя завостраныя (7 экз.), авальныя кароткія (7 экз.), авальныя доўгія (1 экз.)і фігурныя (1 экз.).

Калачападобныя крэсівы з язычком датуюцца X — сярэдзінай XIII ст., калачападобныя без язычка — XII — першай паловай XIII ст., авальныя завостраныя — сярэдзінай XII — сярэдзінай XIV ст., авальныя кароткія — XIII — пачаткам XV ст. і авальныя доўгія — сярэдзінай XIII — XV ст. [4]

Аналогія фігурнаму крэсіву вядома сярод археалагічнага матэрыялу гарадзішча Герсіке [5].

*Іншыя рэчы побыту і прылады працы.* У Маскавічах вядомы знаходкі двух боўталаў. Адно боўтала жалезнае, другое жалезнае з медным пакрыццём. Ніжняя частка ў абодвух экземпляраў адламана. Іх шырыня 4 см, таўшчыня 2 см. У Маскавічах знойдзены спружынныя нажніцы (5 экз.). Усе яны з вітымі стрыжнямі. Даўжыня трох цэлых экземпляраў 146, 230 і 290 мм. Разнастайныя жалезныя кольцы (27 экз.), у сячэнні круглыя, прамавугольныя, квадратныя, а таксама вітыя. Дыяметр кольцаў 35 — 70 мм. Знойдзены звёны ад ланцужкоў (4 экз.), ручкі ад вёдраў, жалезныя ўстаўкі («порхліцы») для каменных жорнаў. Даўжыня ўставак 63, 80, 82, 90 і 100 мм. Вышыня адпаведна 36, 64, 32, 30 і 28 мм. Ёсць разнастайныя жалезныя спражкі (15 экз.) — прамавугольныя, авальныя, фігурныя. Цікавасць уяўляюць 7 жалезных стрыжняў з рухомымі кольцамі. У сячэнні стрыжні круглыя. Агульная даўжыня

цэлых вырабаў разам з кальцом 140, 150, 180 і 198 мм. Адзін стрыжань упрыгожаны насечкамі, а два маюць фігурную верхнюю частку. Па назіраннях Л. А. Голубевай, гэтыя знаходкі датуюцца IX — XIII стст. і распаўсюджаны ў асноўным па водных шляхах — Заходняй Дзвіне, Дняпру, Шэксне і Волзе, а таксама добра вядомы на тэрыторыі Польшчы. Пытанне аб прызначэнні такіх вырабаў пакуль што канчаткова не высветлена [6].

Трэба таксама адзначыць, што частка рэчаў побыту выраблялася з медзі і бронзы (лампадкі, катлы).

*Зброя.* Зброя дальняга бою (15 экз.) у Маскавічах прадстаўлена наканечнікамі стрэл, якія, па класіфікацыі А. Ф. Мядзведзева, падраздзяляюцца на чатыры віды: чатырохгранныя чарашковыя (8 экз.), ланцэтападобныя сплюшчаныя (3 экз.), астатнія ромбападобныя з найбольшым пашырэннем у верхняй палове пяра (рыс. 22).




*Рыс. 22. Зброя з гарадзішча Маскавічы: 1 — наканечнік ножнаў мяча; 2—7 — наканечнікі стрэл; 8 — булава; 9—11, 13, 14 — наканечнікі коп'яў; 12 — уток (наканечнік супрацьлеглага канца коп'я)*

Чатырохгранныя чарашковыя наканечнікі ўжываліся з X ст. да канца сярэдневякоўя. Ланцэтападобныя сплюшчаныя былі распаўсюджаны ў XI — XII стст. на паўночным захадзе Русі і ў Прыбалтыцы. Арбалетныя ромбападобныя ў сячэнні са зрэзанымі вугламі характэрны для XII — XIII стст., ромбападобныя з пашырэннем у верхняй частцы пяра былі шырока распаўсюджаны ў VIII — XIII стст., а зрэзні ў выглядзе вузкай лапатачкі з'явіліся не раней XIII ст.[7] Вага маскавіцкіх арбалетных наканечнікаў 17, 20 і 22 г, вага астатніх прыблізна 4 г. Утульчатыя двухшыпныя наканечнікі стрэл вядомы ў Браславе і Прудніках, шылападобныя выяўлены ў Браславе. Утульчатыя двухшыпныя наканечнікі характэрны для VIII — XIII стст., а шылападобныя — для XII — XIII стст.[8]

Зброя бліжняга бою (Маскавічы, 10 экз.). Галоўнай зброяй бліжняга бою на Русі было кап'ё. Кап'ёўшчыкі першымі наступалі і наносілі таранны ўдар па войску праціўніка, распачынаючы асноўную бітву. Кап'ё патрабуе добрай вывучкі байцоў. Наканечнікі коп'яў прадстаўлены пяццю тыпамі: двухшыпныя чарашковыя, лаўралісцевыя з доўгім чаранком, утульчатыя ланцэтападобныя, лістападобныя чарашковыя, аднашыпныя гарпунападобныя. У асноўным гэта знаходкі з Маскавічаў.

Двухшыпныя чарашковыя — 1 экз. Наканечнік знойдзены з абламаным чарашком. Даўжыня пяра 122 м. Для старажытнарускіх помнікаў такія наканечнікі лічацца рэдкімі. У асноўным яны характэрны для помнікаў XI — XII стст. на тэрыторыі Латвіі [9].

Лаўралісцевыя з доўгім чаранком — 2 экз. Агульная даўжыня аднаго наканечніка 210 мм, другога 300 мм. Сячэнне пяра ў абодвух экземплярах мае ромбападобную форму, а стрыжань — круглую. Па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава, гэтыя наканечнікі адносяцца да тыпу IX і датуюцца XI—XII стст.[10]

Утульчатыя ланцэтападобныя —1 экз. Ужываліся пераважна ў XI ст. Па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава, адносяцца да тыпу I. Аналагічныя знаходкі вядомы таксама ў Браславе і ў курганах у Заборных Гумнах і Уклі.

Лістападобныя чарашковыя (дроцікі-суліцы) — 2 экз. Выконвалі ролю дапаможнай зброі. Агульная даўжыня знаходак 200 і 254 мм. Такія ж наканечнікі знойдзены ў Браславе і ў кургане каля в. Кублішчына. На думку А. М. Кірпічнікава, такія знаходкі характэрны для XIII ст.[11]

Аднашыпныя гарпунападобныя — 6 экз. Канец стрыжня ў трох экземплярах адагнуты з боку шыпа. У аднаго наканечніка чарашок тардзіраваны (віты). Агульная даўжыня знаходак 230 — 290 мм. Такія наканечнікі ўжываліся і як зброя, і як прылада для палявання і рыбнай лоўлі. Аналогіі такім наканечнікам добра вядомы на тэрыторыі Усходняй Латвіі, у заходніх раёнах Літвы, Эстоніі, Латвіі, Фінляндыі, старажытнарускіх гарадах — Пскове, Ноўгарадзе, Гародні. Яны бытавалі ў XI — XII стст. [12]

У Маскавічах выяўлены ўток ад кап'я. Агульная даўжыня 190 мм, дыяметр утулкі 24 мм. Маецца адтуліна для цвіка. Тут знойдзены таксама два навершшы ад рукаяцяў мячоў і бронзавы наканечнік ножнаў мяча. Адно навершша паўкруглае (тып IV па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава), другое дыскападобнае (тып VI). Вага першага 310 г, другога 265 г. Такія навершшы датуюцца XII — XIII стст. і характэрны для многіх еўрапейскіх помнікаў [13].

Можна меркаваць, што мячы, навершшы рукаяцяў, якія знойдзены ў Маскавічах, маюць заходняе паходжанне. Наканечнікі ножнаў мяча

па краю ўпрыгожаны штрыхаванымі лініямі. Па даных П. Паўльзена, такія наканечнікі ножнаў выраблялiся ў землях куршаў і прусаў [14]. А. М. Кірпічнікаў падобныя наканечнікі ножнаў мячоў адносіць да XII— першай паловы XIII ст.[15]

У арсенал узбраення ўваходзілі таксама булавы, якія лічыліся падсобнай дапаўняльнай зброяй. На Маскавіцкім гарадзішчы знойдзены дзве жалезныя і адна бронзавая булавы. Жалезныя булавы маюць выгляд куба са зрэзанымі вугламі. Папярочнік адной булавы 41 мм, вышыня 28, дыяметр адтуліны 13 мм, вага 110 г. Памеры другой булавы — дыяметр 50 мм, вышыня 30, папярочнік 15 мм, вага 175 г. Па класіфікацыі




*Рыс. 23. Рыштунак каня і конніка з гарадзішча Маскавічы: 1—3 — спражкі; 4, 6, 7, 10 — шпоры і іх фрагменты; 5 — ледаходны шып; 8, 9, 11—14 — цуглі; 15, 16 — страмёны*

А. М. Кірпічнікава, яны адносяцца да тыпу II, які датуецца XII — XIII стст. Зроблены яны шляхам коўкі. Бронзавая булава мае 8 плаўна закругленых граняў. Дыяметр 47 мм, вышыня 38, дыяметр адтуліны 18 мм. Гэта тып V па класіфікацыі А. Н. Кірпічнікава, які характэрны для XII—XIII стст. Шарападобная, арнаментаваная рэльефнымі кропкамі і крыжыкамі булава знойдзена на полі паблізу гарадзішча Рацюнкі. Дыяметр 47 мм, вышыня 40 мм. На думку А. М. Кірпічнікава, яна адносіцца да пачатку XIII ст.

У ваяўнічых мэтах выкарыстоўваліся таксама нажы. Вядома, што нож лічыўся абавязковай прыналежнасцю кожнага воіна. Шчытоў і засцерагальнага адзення не знойдзена, але аб іх можна меркаваць па малюнках на абломках касцей жывёл, знойдзеных на Маскавіцкім гарадзішчы. У літаратуры вядомы таксама ўспамін аб знаходцы панцыра паблізу гарадзішча ў Маскавічах [16].

*Рыштунак конніка і рэчы конскай збруі* (рыс. 23). Гэта катэгорыя знаходак прадстаўлена шпорамі, страмёнамі і цуглямі. Шпор і іх фрагментаў вядома 14 экз. Карыстаючыся класіфікацыяй А. М. Кірпічнікава, цэлыя шпоры (5 экз.) можна раздзяліць на тры віды: з чатырохгранным шыпам і петлепадобнымі канцамі; з доўгім шыпам і прыпаянымі петлямі на кругападобных канцах дуг; без петляў, з доўгім шыпам і зубчатай дугой.

Шпоры з чатырохгранным шыпам і петлепадобнымі канцамі (3 экз.) адносяцца да тыпу III, шырока распаўсюджанага па ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі. З усіх старажытнарускіх шпор гэты від лічыцца самым цяжкім і датуецца XII — першай паловай XIII ст.

Шпоры з доўгім шыпам і прыпаянымі петлямі на кругападобных канцах дуг (1 экз.). Частка шыпа і дугі абвіты сплюшчаным медным дротам. Знаходка адносіцца да тыпу II і датуецца XII ст. Большасць шпор гэтага тыпу, па назіраннях А. М. Кірпічнікава, знойдзена ў паўднёварускіх землях. На поўначы яны адзінкавыя. Шпоры з доўгімі шыпамі, інкруставаныя медным дротам, маглі мець заходняе паходжанне [17].

Шпоры без петляў, з доўгім шыпам і зубчатай дугой (1 экз.). Мяркуючы па дузе, знойдзеную шпору можна аднесці да літоўскіх рэчаў, характэрных для X — XIV стст. [18]

Акрамя апісаных шпор знойдзены яшчэ 2 фрагменты шпор, дугі якіх заканчваюцца кругападобнымі канцамі з прыпаянымі петлямі. Шпоры з такімі петлямі адносяцца да тыпаў II, III, IV і датуюцца XII — першай паловай XIII ст. Адзін абломак шпоры на дузе мае кругападобнае пашырэнне, упрыгожанае сярэбранай кропкавай інкрустацыяй. Знойдзены 3 абломкі шпор з шарападобнымі шыпамі. Мяркуючы па шыпах, шпоры можна аднесці да аднаго з тыпаў — III, IV ці IVa. Датаванне гэтых тыпаў шпор — XII — першая палова XIII ст. Акрамя таго, ад шпор знойдзены 4 петлепадобныя канцы з дугой. Такія фрагменты маглі належаць шпорам, якія адносяцца да тыпаў II, III ці V і бытавалі ў XII — XIII стст. [19]

Страмёны (4 экз.). Гэта катэгорыя знаходак прадстаўлена адным цэлым стрэменем і трыма абломкамі. Па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава, цэлае кальцападобнае і два абломкі такіх страмёнаў адносяцца да тыпу IX. У XII — XIII стст. кальцападобныя страмёны распаўсюджаны ад Сібіры і Сярэдняй Азіі да Прыбалтыкі і Польшчы. Такія знаходкі ёсць таксама ў Даніі, Швецыі, Чэхіі [20]. Адзін фрагмент стрэмені ўяўляе сабой зубчатую верхнюю частку з дзвюма круглымі адтулінамі. Такая форма

страмёнаў характэрна ў асноўным для Цэнтральнай Літвы ў XI — XIII стст.[21]

Цуглі (19 экз.). Сярод знаходак гэтай катэгорыі 15 цугляў двухзвённыя кольчатыя і 4 — з псаліямі. Дыяметр кольцаў 40—50 мм. У сячэнні кольцы круглыя ці прамавугольныя. Даўжыня злучальнай часткі 140—155 мм. Злучальныя звёны 2 цугляў упрыгожаны насечкамі. Па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава, цуглі адносяцца да тыпу IV. Цуглі, у якіх псаліі і кальцо злітыя, належаць да тыпу II. Усе знойдзеныя ў Маскавічах цуглі датуюцца XII — XIII стст.[22]

У Маскавічах знойдзена 7 ледаходных шыпоў. Канцы платформы чатырох шыпоў закругленыя. Тры шыпы маюць выгляд трохвугольніка. Першы від шыпоў, на думку А. М. Кірпічнікава, з'явіўся не пазней XIII ст.




*Рыс. 24. Вырабы з косці з гарадзішча Маскавічы: 1, 2 — гузікі; 3, 5, 7, 8, 11 — накладкі ад тронак нажоў; 4 — дробны выраб; 6, 11 — трапецападобныя грабеньчыкі; 9 — костка для гульні ў «бабкі»*

Шыпы ў выглядзе трохвугольніка лічацца абутковымі, яны дапамагалі бяспечна перамяшчацца па слізкіх дарогах у зімовы час [23]. Сярод археалагічнага матэрыялу ў Браславе вядома конская падкоўка.

**Вырабы з косці** шматлікія і разнастайныя на ўсіх гарадзішчах. У пахаваннях, за выключэннем аднаго грабеньчыка у Чарневічах, касцяных вырабаў не знойдзена. У Маскавічах выяўлена 20 праколак. Даўжыня іх 60 — 190 мм. Ёсць 3 цэлыя касцяныя ручкі ад нажоў, 8 насадак (муфтачак) для драўляных ручак і 2 накладкі. Знойдзены 2 гузікі, а таксама розныя дробныя вырабы. Большасць гэтых рэчаў упрыгожана цыркульным арнаментам. Шматлікія знаходкі грабеньчыкаў, з якіх 39 цэлыя. Па форме грабеньчыкі падраздзяляюцца на трапецападобныя з увагнутымі бакамі, трапецападобныя з накладкамі і прамавугольныя двухбаковыя наборныя (рыс. 24). Па наўгародскай класіфікацыі, яны адносяцца да тыпаў Д (5 экз.), М (5 экз.), Н (19 экз.), О (16 экз.), Ж (3 экз.) і I (1 экз.). Датаванне маскавіцкіх грабеньчыкаў — XI — XIV стст. [24] У Браславе выяўлены аднабаковыя і двухбаковыя грабяні [25]. Аднабакова арнаментаваны грабенчык вядомы ў Прудніках [26].

У Маскавічах і Рацюнках знойдзены касцяныя прыстасаванні для снавання нітак (юркі). На ўсіх гарадзішчах вядомы косці ад жужалак. У асноўным яны маюць адну адтуліну, але сустракаюцца і з дзвюма. Па вызначэннях палеазаолагаў, у Масквічах жужалі зроблены з касцей свінні, авечкі, буйной рагатай жывёлы і аленя. Цікавасць уяўляе знаходка касцянога вырабу ў выглядзе цыліндра са скразной адтулінай. Падобныя рэчы вядомы сярод археалагічнага матэрыялу Полацка [27], але прызначэнне іх пакуль што не высветлена. Трэба адзначыць таксама кругападобную паясную спражку і 8 касцей для гульні (астрагалаў), зробленых з таранных касцей буйной жывёлы. Два астрагалы зроблены са свінцовымі ўстаўкамі. У Маскавічах знойдзена рэч з косці, якая нагадвае частку пад'ёмнага блока, што выкарыстоўваўся ў бортніцтве. Дзве другія косці са зрэзанай, сцёртай паверхняй маглі ўжывацца як лашчылы пры апрацоўцы скуры і тканіны.

**Вырабы з каменя.** Адной з найбольш распаўсюджаных катэгорый знаходак пры раскопках паселішчаў эпохі Кіеўскай Русі з'яўляюцца шыферныя праселкі. Да нядаўняга часу лічылася, што шыферныя праселкі вырабляліся толькі ў Оўручы (УССР), дзе меліся вялікія залежы пірафіліту. У апошнія гады знойдзены сляды майстэрняў па вырабу шыферных праселак з прывазной сыравіны і ў іншых месцах, у прыватнасці на гарадзішчы Менка каля Мінска [28]. Шыферныя праселкі ёсць ва ўсіх гарадзішчах. У Маскавічах знойдзена 169 праселкаў (частка — у фрагментах). Сярод іх вылучаюцца 4 віды: біканічныя, ці бітрапецоід-




*Рыс. 25. Вапнавае рытуальнае яйка са знакамі з гарадзішча Маскавічы*




*Рыс. 26. Вырабы з гліны і каменя з гарадзішча Маскавічы: 1—5 — гліняныя пацеркі; 6 — гліняная праселка; 9, 10 — шыферныя праселкі са знакамі; 7, 8, 11, 12 — дробны выраб з гліны; 13 — кавалак гліняная арнаментаванай абмазкі*

ныя (113 экз.), бочкападобныя (42 экз.), дыскападобныя (12 экз.), фігурныя (2 экз.). Каляровая гама маскавіцкіх праселкаў наступная: цёмна-ружовыя ці фіялетавыя (10 экз.), ружовыя (27 экз.), светла-ружовыя (21 экз.), шэрыя (15 экз.), чорныя (2 экз.). Знешні дыяметр праселкаў 13—27 мм, дыяметр адтуліны 5,5—9, шырыня 7—16 мм. На 7 праселках нанесены літарападобныя знакі [29]. 13 шыферных праселкаў выяўлена ў Рацюнках. Яны падраздзяляюцца на бітрапецоідныя (6 экз.), бочкападобныя (2 экз.), дыскападобныя (4 экз.). Найбольшы дыяметр праселкаў 15—28 мм, дыяметр адтуліны 4—6, вышыня 5—10 мм. Некалькі шыферных праселкаў знойдзена на гарадзішчы Пруднікі.

У Маскавічах шматлікія знаходкі асялкоў і іх фрагментаў (больш за 70 экз.). Некаторыя маюць адтуліны для падвешвання. Асялкі вядомы і ў пахавальных помніках (Чарневічы).

6 каменных жорнаў знойдзена ў Маскавічах і 1 жорны (у фрагментах) — у Рацюнках. Жорны выраблены з марэннага граніту. Сярод іх 3 круглыя і 3 авальныя. Дыяметр круглых 40—45 см. Памеры авальных 30×33, 34×47, 35×45 см. Дыяметр адтулін 6—10 см, вышыня 6—11 см.

У Маскавічах вырабы з каменя прадстаўлены 4 абломкамі каменных свідраваных сякер. Пры вывучэнні фартыфікацыйных збудаванняў знойдзена вапнавае яйка, падобнае на курынае. Паверхня яго пакрыта схематычнымі знакамі (рыс. 25). У Маскавічах выяўлены 4 шыферныя крыжыкі і палова каменнай формачкі для адліву лістападобных падвесак. Вышыня формачкі 50 мм, таўшчыня 20 мм. Малюнак аналагічнай формачкі змешчаны ў кнізе Б. А. Рыбакова [30]. Цікавым з'яўляецца вапнавы выраб накшталт праселка ці грузіла. На яго згладжанай паверхні нанесены рунападобныя знакі (рыс. 26).

**Вырабы з гліны.** Найбольш шматлікімі глінянымі вырабамі з'яўляюцца праселкі — 21 экз., шарыкі — 8 экз., пацеркі — 6 экз., скульптуркі жывёл — 4 экз., фігурка чалавека (рыс. 27) і гліняная аднабаковая ліцейная формачка для адліўкі нацельных крыжыкаў. Скульптуркі зроблены з белай азёрнай гліны, а ўсе астатнія рэчы — з гліны бурага колеру.

Самай шматлікай катэгорыяй вырабаў з гліны з'яўляецца бытавы посуд. Знойдзеная кераміка падраздзяляецца на ляпную і кругавую (рыс. 28). Суадносіны яе неаднолькавыя на розных гарадзішчах. Ляпны посуд адносіцца да днепра-дзвінскай культуры, культуры штрыхаванай керамікі і трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. Кругавы посуд на ўсіх умацаваных паселішчах прадстаўлены ў асноўным гаршкамі, аналогіі якім добра вядомы ў Полацку [31]. Знаходкі місак, кубкаў, іншых відаў посуду адзінкавыя. Сярод кругавых гаршкоў з Маскавічаў па асаблівасцях венчыка вылучаецца 6 тыпаў (рыс. 29, *а*). I тып — слабапрафіляваны посуд з адагнутым венчыкам, які мае загнуты ўнутр край (63%); II тып — мяккапрафіляваны посуд з адагнутым наверх венчыкам (17%); III тып — слабапрафіляваны посуд з крыху адагнутым, гарызантальна зрэзаным краем венчыка, які часам мае жалабок (16%); IV тып — тонкасценны посуд з патончаным, выцягнутым уверх прамым краем венчыка і прыўзнятым плечыкам (2%); V тып — посуд з адагнутым наверх венчыкам, які мае жалабок (1%); VI тып — посуд з адагнутым наверх краем венчыка, добра выяўленай шыйкай і прыўзнятым плечыкам (1%).

Сярод гаршкоў з Рацюнкаў (18 фрагментаў) вылучаюцца 4 тыпы. Тры з іх аналагічныя першым тром тыпам маскавіцкай керамікі. Чацвёрты тып (2 фрагменты) падобны да тыпу IV керамікі з Маскавічаў, але ў адрозненне ад маскавіцкага посуду тут край венчыка зрэзаны.

Шматлікія фрагменты кругавога посуду знойдзены і на гарадзішчы Прудніці, але толькі нязначная частка ад агульнай колькасці іх сінхронная кругаваму посуду Маскавічаў і Рацюнкаў. У Прудніках ёсць посуд, аналагічны I тыпу маскавіцкай керамікі, і посуд, падобны тыпу IV керамікі з Рацюнкаў. Кераміка Браслава падобна апісанай.




*Рыс. 27. Гліняныя фігуркі з гарадзішча Маскавічы: 1—3 — фігуркі жывёл; 4 — фігурка дружынніка ў кальчузе*




*Рыс. 28. Кругавы посуд з гарадзішча Маскавічы*

Ганчарных горнаў на даследаванай тэрыторыі не выяўлена, але трэба меркаваць, што хутчэй за ўсё кругавы посуд паўночна-заходніх раёнаў Полацкага княства з'яўляўся прадукцыяй невялікіх ганчарных майстэрняў. Аб функцыянальным прызначэнні тых ці іншых гаршкоў меркаваць цяжка. Вылучаюцца вялікія пасудзіны, якія можна аднесці да тарнай керамікі, але большасць іх хутчэй за ўсё мела універсальнае прызначэнне. На некаторых фрагментах посуду бачны сляды нагару.

Значная частка кругавога посуду ў Маскавічах арнаментавана, прычым арнамент налічвае да 30 відаў (рыс. 29, *б*). Пераважае хвалісты арнамент, дзе форма і колькасць ліній розныя. Віды арнаментаў прадстаўлены таксама насечкамі, насечкамі ў спалучэнні з прамымі і хвалістымі лініямі. У большасці выпадкаў арнамент нанесены на плечыка, часам адразу на плечыка і край венчыка, іншы раз на ўнутраны бок краю венчыка. У Прудніках і Рацюнках сустракаецца таксама лінейны арнамент.

Шматлікія і днішчы ад гаршкоў. На большасці з іх бачны «борцікі», ёсць таксама клеймы. У Маскавічах на 120 донцах былі клеймы ў выглядзе трохвугольніка з адыходзячымі дужкамі накшталт знака Рурыкавічаў у спалучэнні з ромбам зверху. На першы погляд кляймо нагадвае чалавечка (рыс. 28). Акрамя таго, сустракаецца кляймо ў выглядзе двух авалаў, з якіх меншы ўпісаны ў большы, перасечанае перпендыкулярнымі лініямі і кляймо ў выглядзе трохвугольніка. Сярод знаходак




*Рыс. 29. Тыпы і арнаментацыя керамікі з гарадзішча Маскавічы*

ёсць крышкі ад гаршкоў. Некаторыя з іх арнаментаваны хвалістымі лініямі. Крышкі маюць выгляд полых конусаў і ў верхняй частцы ручку ў выглядзе кальцавога выступу. У Маскавічах акрамя посуду мясцовай вытворчасці знойдзена маленькая, хутчэй за ўсё прывезеная з Кіева чырвонагліняная амфарка, а ў Браславе, па меркаванню Л. В. Аляксеева, знойдзены фрагмент мазавецкага посуду.

### 2. ЮВЕЛІРНЫЯ ВЫРАБЫ

Сярод ювелірных вырабаў вылучаюцца падвескі, бранзалеты, пярсцёнкі, фібулы і розныя дэталі касцюма.

**Падвескі.** *Падвескі-бразготкі* (15 экз.) *. У Маскавічах такія знаходкі ў асноўным шарападобнай формы са шчылепадобнымі прарэзкамі (рыс. 30), за выключэннем аднаго грушападобнага і аднаго авальнага са шчылепадобнымі прарэзкамі. Некаторыя бразготкі ўпрыгожаны лінейным арнаментам. Па дзве грушападобныя бразготкі знойдзены ў курганах каля вёсак Кублішчына і Усце. Прарэзкі ў курганных бразготак крыжападобныя. Па даных В. А. Мальм і М. М. Фехнер, шарападоб-

* Лічбы ў дужках азначаюць колькасць знаходак у Маскавічах.




*Рыс. 30. Упрыгожанні з гарадзішча Маскавічы: 1, 9 — лістападобныя падвескі; 2 — падвеска з ракавіны кауры; 3, 4 — падвескі-качачкі; 5—8, 11 — бразготкі; 10, 17 — падвескі-крыжыкі; 12 — металічная пацерка; 13—16, 18, 19 — манетападобныя падвескі; 20 — спіралепадобная падвеска; 21 — полая падвеска-конік; 22, 23 — падвескі з клыкоў жывёл; 24 — трапецападобная падвеска; 25 — скроневае кальцо з полымі сярэбранымі пацеркамі*

ныя бразготкі са шчылепадобнай прораззю адносяцца да XI — XIII стст., са шчылепадобнай прораззю і лінейным арнаментам — да XI — XIII стст., а грушападобныя з крыжападобнай прораззю — да XI ст.[32] Па даных М. У. Сядовай, сярод наўгародскіх матэрыялаў шарападобныя бразготкі з лінейнай прораззю з'явіліся ў XI ст. і існавалі да пачатку XIV ст. Грушападобныя бразготкі з крыжападобнай прораззю знойдзены ў слаях сярэдзіны X— сярэдзіны XII ст.[33]

Бразготкі, акрамя ўжывання іх у якасці падвесак, прымяняліся як гузікі, служылі ўпрыгожаннем абутку, дэталямі агалоўя конскай вупражы, імі таксама абшываліся краі адзення і гунек.

*Крыжыкі-цельнікі* (16 экз.). Акрамя маскавіцкіх знаходак адзін крыжык знойдзены пры раскопках кургана каля в. Дзянісенкі Верхнядзвінскага раёна[34].

Сярод маскавіцкіх крыжыкаў 10 выраблены з каляровых металаў (рыс. 30, *10, 17*), 1 з бурштыну (рыс. 32, *3*), 5 з оўруцкага шэрага шыферу (рыс. 32, *1, 2*), у тым ліку адзін у сярэбранай аправе (рыс. 31, *2*). Крыжык з каляровага металу зроблены з трохлопасцевымі канцамі і ўпрыгожаны жоўтай эмаллю (рыс. 32, *7*). Такія крыжыкі адносяцца да шырока распаўсюджаных падвесак. Мяркуецца, што цэнтрамі іх вырабаў з'яўляліся Кіеўшчына[35] і нізоўі Даўгавы[36]. Медныя аб'ёмныя (рыс. 32, *4*) і алавяныя крыжыкі былі распаўсюджаны ў XI — XIII стст. на тэрыторыі Латвіі, а таксама на тэрыторыі Старажытнай Русі[37]. Цікавасць уяўляе крыжападобная шыракалопасцевая падвеска (рыс. 30, *17*), аналогія якой вядома ў Курляндыі[38].

Бурштынавы крыжык знойдзены ў фрагменце. Мяркуючы па форме і адсутнасці арнаментацыі, такія крыжыкі характэрны для паўночных раёнаў у XII—XIII стст.[39]

*Крыжы-энкалпіёны* (4 экз.). Адзін энкалпіён рэльефна-чэрнены, у двух канцы пашыраны і зроблены кроплепадобныя выступы па вуглах (рыс. 32, *13*) і чацвёрты маленькі энкалпіён з чэрню (рыс. 31, *1*). На рэльефна-чэрненым энкалпіёне з двух бакоў у цэнтры знаходзяцца рэльефныя фігуры. З вонкавага боку — выява распяцця Ісуса Хрыста на падстаўцы. На Хрысце доўгая кашуля, рукі распасцёртыя, злёгку сагнутыя ў локцях, далонямі ўперад. Галава Хрыста нахілена да правага пляча, вакол галавы німб. Валасы падаюць на плечы. У цэнтры адваротнага боку — Маці боская з дзіцем. На ёй хітон. Цела немаўляці пакрыта плашчом. Вакол абедзвюх галоў німбы. Па краях як з вонкавага, так і з адваротнага боку знаходзяцца медальёны з плоскімі выявамі святых, выкананымі прачэрчанымі лініямі, якія запоўнены чэрню. Краі медальёнаў закругленыя, і пачатак закругленняў падкрэслены выступамі.

Крыжы-энкалпіёны з пашыранымі канцамі ідэнтычныя. Адзін з іх захаваўся з аглаўем, упрыгожаным пазалотай і сіняй выемчатай эмаллю. На яго вонкавым баку схематычная выява распяцця, на адваротным — крыж са ззяннем, па краях медальёны з надпісам і рысункам сонца і месяца. Першы крыж адносіцца да канца XI — пачатку XII ст., два іншыя — да пачатку XIII ст.[40] Маленькія энкалпіёны з чэрню вядомы з тэрыторыі Старажытнай Русі і Усходняй Прыбалтыкі. У Латвіі такія крыжыкі знойдзены разам з каралямі[41].

*Манетападобныя падвескі* (2 экз.). Формай і памерамі падвескі нагадваюць манеты. У Ноўгарадзе яны знойдзены ў пластах X — XIV стст.[42] Тры падвескі праразныя, з уключаным крыжыкам (рыс. 30, *15, 19*). На адной з іх змешчаны крыж з расшыранымі канцамі, на другой —

крыж з перакрыжаваннямі на канцах, на трэцяй — крыж з фігурнымі перакрыжаваннямі. Дзве падвескі ўпрыгожаны несапраўднай зерню (рыс. 30, *13, 14, 18*).

*Трапецападобныя падвескі* (16 экз.). Тры падвескі знойдзены на гарадзішчы Маскавічы (рыс. 31, *4*). Адзінаццаць падвесак знаходзілася ў пахаваннях па абраду трупаспалення ва ўрочышчы Рацкі Бор (вёскі Майшулі, Шалтэні) — рыс. 5, *5, 6*. Усе падвескі рознай велічыні, выраблены з тонкай бляхі і ўпрыгожаны чатырма пункцірнымі лініямі. На адной з падвесак нанесены кропкавы арнамент. Дзве падвескі выяўлены ў кургане па абраду трупаспалення каля в. Усце. Па памерах яны большыя за падвескі з Рацкага Бору і ўпрыгожаны кропкавым арнаментам. Падвескі звычайна насіліся на шыйных грыўнях або падвешваліся да галаўных убораў.




*Рыс. 31. Упрыгожанні з гарадзішча Маскавічы: 1 — крыжык-энкалпіён; 2 — шыферны крыжык у сярэбранай апраўе; 3 — заклёпка; 4 — трапецападобная падвеска; 5 — скроневае кальцо; 6 — гузік; 7 — зашпілька ад кнігі; 8 — фрагмент рашотчатай падвескі; 9 — бубенчык; 10 — фібула; 11 — шпілька; 12 — бранзалет*



*Рыс. 32. Рэчы імпарту і вагі з гарадзішча Маскавічы: 1, 2 — крыжыкі з ойручскага шыферу; 3 — крыжык з бурштыну; 4, 7 — крыжыкі з медзі; 6 — падвеска-конік; 8, 9 — падвескі-лунніцы; 10 — лампадка; 11 — гірка-разнавага; 12 — жалезная гіра; 13 — крыж-энкалпіён*

*Лістападобныя падвескі* (2 экз.). Абедзве знаходкі зроблены з бронзы і маюць «вушкі» для падвешвання. Адна з іх па краях упрыгожана насечкамі (рыс. 30, *9*), другая мае лыжкападобную форму (рыс. 30, *1*). Ліцейныя формачкі для адліўкі першай падвескі вядомы на Кіеўшчыне, другой — як на Кіеўшчыне[43], так і ў Маскавічах.

*Шыракарогія лунніцы* — 2 экз. (рыс. 32, *8, 9*). Лунніцы былі шырока распаўсюджанымі ўсходнеславянскімі ўпрыгожаннямі. Яны з'явіліся ў X ст. і ўжываліся да XIII ст., але ў асноўным бытавалі ў X— пачатку XI ст.[44]

*Плоскія стылізаваныя падвескі-конікі* — 2 экз. (рыс. 32, *6*). Падвескі характэрны для X—XIII стст., але ў асноўным бытавалі ў XI — першай палове XII ст. Найбольшая іх канцэнтрацыя прыходзіцца на вобласці рассялення смаленска-полацкіх крывічоў. Падвескі-конікі сустракаюцца ў Прыбалтыцы і Скандынавіі[45]. На Даугмальскім гарадзішчы яны знойдзены ў паўгатовым выглядзе[46].

*Полыя шумячыя аднагаловыя падвескі-конікі* (1 экз.). Знойдзена падвеска з круглай храпай і грывай у выглядзе кольцаў. Уздоўж тулава нанесены хвалісты ўзор. Хвост загнуты ў спіраль. Вушы выдзелены двума кольцамі (рыс. 30, *21*). Па наўгародскай класіфікацыі, знойдзеная падвеска адносіцца да тыпу I[47], па класіфікацыі Е. А. Рабініна,— да групы VI, тыпу XX. Е. А. Рабінін улічыў 207 такіх знаходак і прыйшоў да высновы, што арэал іх распаўсюджання — Кіеўская Русь і прылягаючыя да яе раёны. Скапленне конікаў прасочваецца ў Ноўгарадзе, дзе выяўлена каля 25% усіх улічаных упрыгожанняў. Там яны знойдзены ў слаях XII — пачатку XIII ст. Такія падвескі ёсць у Латвіі, дзе лічацца рэчамі імпарту са старажытнарускіх зямель. У некаторых пахаваннях знойдзена па дзве падвескі, якія ў асноўным размяшчаліся каля пояса[48]. На тэрыторыі Беларусі такія знаходкі вядомы з раскопак Г. В. Штыхава ў Барысаве і Т. С. Бубенькі ў Віцебску.

*Падвескі ў выглядзе вадаплаваючых птушак* — 2 экз. (рыс. 30, *3, 4*). Падвеска з вушкам для падвешвання нагадвае качку ці лебедзя. Па баках ціснёны арнамент. Другая падвеска ў фрагментах уяўляе сабой галоўку птушачкі. Дакладнай аналогіі першай падвесцы невядома, але ў літаратуры адзначаны блізкія па форме знаходкі, якія бытавалі ў XI—XII стст. Большасць падвесак паходзіць з паўночных славяна-чудскіх вобласцей. Найбольш блізкай па форме і памерах можна лічыць падвеску, знойдзеную ў Суздальскім Аполлі ў кургане з пахаваннем абраду трупаспалення, дзе яна ўваходзіла ў склад інвентару, які меў дзве шкарлупападобныя скандынаўскія фібулы X — пачатку XI ст. Суздальская знаходка мае найбольшае падабенства з падвескай з могільніка Кобрату ў Эстоніі[49].

*Падвескі-ланцугатрымальнікі* — 2 экз. Па аднаму экземпляру знойдзена ў Рацкім Бары (рыс. 5, *11*), Усці (рыс. 5, *7*), Бяльмонтах (рыс. 5, *8*), Маскавічах (рыс. 30, *20*).

Курганныя ланцугатрымальнікі пласцінчатыя, а маскавіцкая знаходка мае петлепадобныя канцы, выцягнутыя накшталт спіралі. Паміж спіральнымі кругамі знаходзіцца выцягнутая ўверх пятля, а ўнізе — тры адтуліны. Аналагічныя знаходкі вядомы сярод іжорска-карэльскіх старажытнасцей XII — XIII стст., наўгародскіх і кастрамскіх курганоў, у Эстоніі, на востраве Готланд[50]. У Ноўгарадзе такія рэчы былі ў слаях XIII і XIV стст.[51] Ланцугатрымальнікі, аналагічныя маскавіцкім, С. І. Качкуркіна інтэрпрэтуе як карэльскія і адносіць іх да тыпу I (варыянта I), характэрнага для перыяду вікінгаў[52].

*Ракавіны каўры* — 2 экз. (рыс. 30, *2*). У адной з ракавінак было прасунута кальцо з дроту для падвешвання да ажарэлка. Знаходкі ракавінак каўры асабліва шматлікія на тэрыторыі Усходняй Латвіі. Яны бытавалі там у XV—XVIII стст., але асабліва ў XII — XIII стст. Паходзяць яны з Індыйскага акіяна, а ў Латвію паступалі праз паўночна-ўсходнюю Еўропу[53]. На тэрыторыі Беларусі знаходкі каўры нешматлікія.

**Бранзалеты** падраздзяляюцца на 7 відаў.

*Бранзалеты з дроту* з'яўляюцца самымі простымі па выгляду і вырабу. Яны вядомы сярод старажытнасцей усіх часоў і народаў. Тры тонкаканечныя бранзалеты з разамкнутымі канцамі знойдзены ў Маскавічах. Два з іх маюць круглае сячэнне і адзін — сегментападобнае. Драцяны тонкаканечны бранзалет з разамкнёнымі канцамі і сегментападобным сячэннем дроту знойдзены ў кургане каля в. Усце (рыс. 7, *17*), дзе па комплексу рэчаў пахаванне датуецца XI ст. Бранзалеты з тоўстага дроту вядомы ў богінскіх курганах. У курганах каля в. Чарневічы ёсць круглыя ў сячэнні бранзалеты з абрубленымі канцамі (рыс. 7, *12*).

*Вітыя і плеценыя бранзалеты.* Бранзалеты, вітыя з двух драцінак з завязанымі канцамі, часта сустракаюцца ў пахаваннях Падзвіння (рыс. 8, *1*). На гарадзішчах такіх бранзалетаў не знойдзена. Вітыя бранзалеты з завязанымі канцамі характэрны для XI — пачатку XII ст. і былі распаўсюджаны шырока — у наўгародскіх славенаў, дрыгавічоў, радзімічаў.

Аналогіі такім знаходкам добра вядомы сярод латгальскіх старажытнасцей[54]. У курганах паблізу вёсак Чарневічы і Укля ёсць знаходкі вітых бранзалетаў з абрубленымі канцамі (рыс. 8, *5*). Тры вітыя бранзалеты з петлепадобнымі канцамі выяўлены на гарадзішчы Маскавічы. Два з іх сплецены з двух драцінак (рыс. 33, *19, 20*). У аднаго з гэтых бранзалетаў петлі маюць перамычку. Бранзалеты, вітыя з двух драцінак і з петлепадобнымі канцамі, у Ноўгарадзе знойдзены ў слаях XII — 40-х гадоў XIII ст[55]. Трэці віты бранзалет з Маскавічаў зроблены з трох драцінак. Канцы ў яго пяцельчатыя (рыс. 33, *15*). Такія бранзалеты вядомы на гарадзішчы Асатэ ў слаі XIII ст., а таксама ў пахаваннях жальнічнага тыпу на паўночным усходзе Латвіі[56]. У Маскавічах знойдзены складанаплецены бранзалет са шклянымі ўстаўкамі на канцах. Такія бранзалеты распаўсюджаны на тэрыторыі вяцічаў[57], а з бліжэйшых да Маскавічаў помнікаў аналагічная знаходка вядома на Асацкім гарадзішчы[58]. Датаванне гэтых бранзалетаў — XII — XIV стст. У Ноўгарадзе адзін з такіх бранзалетаў знойдзены ў слаі другой паловы XI ст., другі — у слаі сярэдзіны XIII ст. Сустракаюцца яны і ў XIV — XV стст. Па назіраннях М. У. Сядовай, такія бранзалеты вядомы і сярод фіна-угорскіх старажытнасцей[59].

*Бранзалеты з гладкай унутранай паверхняй і імітацыяй пляцення з дроту паверсе.* Тры бранзалеты знойдзены ў Маскавічах (рыс. 33, *10*). Такія знаходкі вядомы, напрыклад, у Яраполчы Залескім, дзе яны стратыграфічна адносяцца да XII ст.[60]

*Несапраўднавітыя бранзалеты са стылізаванымі зааморфнымі галоўкамі.* Знаходка зроблена ў Маскавічах. Па даных В. П. Левашовай, такія бранзалеты характэрныя для Наўгародскай зямлі і датуюцца XII — XIII стст.[61]

*Гладкія бранзалеты са стылізаванымі зааморфнымі галоўкамі.* Усе знаходкі (4 экз.) вядомы ў курганах. Два бранзалеты знойдзены ў Лясной. Яны маюць сегментападобнае сячэнне і паверсе ўпрыгожаны геаметрычным арнаментам. У Чарневічах і Кублішчыне бранзалеты былі з моцна стылізаванымі канцамі (рыс. 8, *4*). Такія бранзалеты характэрны




*Рыс. 33. Упрыгожанні з гарадзішча Маскавічы: 1—9 — пярсцёнкі; 10 11, 15 — фрагменты бранзалетаў; 14, 19, 20 — бранзалеты; 12, 13, 16, 17, 18 — фрагменты шыйных грыўняў*

для балцкіх народнасцей. У X ст. з Прыбалтыкі яны распаўсюдзіліся на тэрыторыі, заселеныя славянамі і фінамі. Такія знаходкі трапляюцца ў курганах Беларусі, Паўднёвага Прыладажжа і Іжорскага плата, ва уладзімірскіх, падмаскоўных, смаленскіх і калужскіх курганах. Яны датуюцца ў асноўным XI — пачаткам XII ст.[62] Па назіраннях З. М. Сяргеевай, падобныя знаходкі часцей за ўсё сустракаюцца ў вярхоўях р. Вялікай і міжрэччы Заходняй Дзвіны і Бярэзіны, у вярхоўях Пцічы[63].

*Пласцінчатыя бранзалеты (8 экз.)*. Пласцінчатыя бранзалеты, як і зробленыя з дроту, у многіх народаў у розныя часы з'яўляліся распаўсюджанай формай. Вырабляліся яны звычайна з тонкай кованай пласціны. Знойдзеныя бранзалеты маюць разнастайны арнамент у выглядзе спалучэння кропак, кружочкаў, ромбаў, пункцірных і прамых ліній. Пераважае ромб. Сярод маскавіцкіх знаходак два багата арнаментаваныя бранзалеты са злёгку закругленымі канцамі, адзін загнутаканечны (рыс. 33, *14*). У іншых канцы абламаны. Адзін з фрагментаў (рыс. 33, *11*) упрыгожаны ціснёным раслінным арнаментам і нагадвае імітацыйныя бранзалеты Ноўгарада[64]. Пласцінчатыя бранзалеты выяўлены ў курганах каля вёсак Лісна — 3 экз. і Укля — 1 экз. (рыс. 7, *13*). Пласцінчатыя бранзалеты бытавалі ў асноўным у XII — XIV стст.[65]

*Шкляныя бранзалеты*. 250 шкляных бранзалетаў знойдзена на гарадзішчы Маскавічы, 2 фрагменты — на гарадзішчы Рацюнкі і 1 — у Браславе. З усіх упрыгожанняў XI —XIII стст. шкляныя бранзалеты з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі на старажытнарускіх гарадзішчах.

Сярод маскавіцкіх знаходак па форме вылучаюцца гладкія круглыя ў сячэнні, гладкія круглыя з перавіццём жоўтай палоскай, кручаныя, плоска-выпуклыя, плоска-выпуклыя ўдвая, рубчатыя, гладкія трохвугольныя ў сячэнні, пашыраныя, гладкія прамавугольныя ў сячэнні. Колерная гама бранзалетаў: зялёныя, сінія, фіялетавыя, бірузовыя, карычневыя, балотныя і жоўтыя. Т. С. Скрыпчанка, працуючы над вывучэннем маскавіцкіх бранзалетаў, прыйшла да высновы, што асноўная іх маса мае кіеўскае паходжанне. Знойдзена некалькі візантыйскіх бранзалетаў і пераймaнні іх старажытнарускага паходжання. Ёсць адзін бранзалет з двухслойнага шкла[66].

**Пярсцёнкі.** *Пярсцёнак з дроту з разамкнёнымі ці заходзячымі канцамі* (больш за 20 экз.) . Выяўлены на ўсіх гарадзішчах і ў многіх курганных могільніках. У Ноўгарадзе такія пярсцёнкі бытавалі з канца XI да канца XIII ст.[67]

*Вітыя пярсцёнкі з абрубленымі канцамі* — 2 экз. (рыс. 33, *2*). Знаходкі складаюць значную частку агульнай масы пярсцёнкаў на тэрыторыі фіна-угорскіх плямёнаў. Іх датаванне — XI — XIII стст.[68]

*Вітыя пярсцёнкі з адным пяцельчатым і другім абрубленым канцамі* — 2 экз. (рыс. 33, *1*). У Ноўгарадзе такія пярсцёнкі знойдзены ў слаях 30-х гадоў XIII ст. і бытавалі да канца XIV ст.[69] Аналагічныя пярсцёнкі ў Яраполчы Залескім знойдзены ў слаі першай палавіны XIII ст.[70]

*Фальшывавітыя пярсцёнкі* — 1 экз. (рыс. 33, *3, 4*). Знойдзены пярсцёнак з заходзячымі гладкімі краямі (канцамі). Храналагічныя рамкі бытавання такіх упрыгожанняў у Ноўгарадзе — XI — XIV стст.[71]

*Рубчатыя пярсцёнкі* — 2 экз. (рыс. 33, *8*). У пачатку II тысячагоддзя такія знаходкі характэрны для тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі[72].

Адзін з пярсцёнкаў упрыгожаны вертыкальнымі лініямі і кружочкамі з кропкай у цэнтры. У сячэнні пярсцёнак прамавугольны, мае заходзячыя канцы. У Ноўгарадзе такія знаходкі сустракаліся ў слаях канца

X — канца XIII ст. Другі пярсцёнак упрыгожаны арнаментам, які імітуе косапляцёнку. Пярсцёнкі з арнаментам у выглядзе маленькай касы шырока распаўсюджаны ў фінскіх плямёнаў Паволжа. Для славян яны не характэрны [73].

*Шчытковасярэдзінныя пярсцёнкі* (больш за 10 экз.) вядомы ў Браславе і ў курганах Верхнядзвінскага раёна. У Ноўгарадзе такія знаходкі выяўлены ў слаях канца XII — першай паловы XV ст.[74]

*Рашоткавыя пярсцёнкі* — 3 экз. (рыс. 33, *6*, *7*). Пярсцёнкі лічацца этнічнай прыкметай вяцічаў. У Ноўгарадзе яны знойдзены ў слоі 60 — 70-х гадоў XII ст.[75] Бліжэйшым ад Маскавічаў пунктам, дзе вядомы такія пярсцёнкі, з'яўляецца гарадзішча Асатэ ва Усходняй Латвіі[76].

*Пярсцёнкі са шклянымі ўстаўкамі* — 1 экз. У Маскавічах знойдзена толькі авальная ўстаўка з сіняга шкла. Пярсцёнкі з круглымі і авальнымі ўстаўкамі ў Ноўгарадзе трапляліся ў слаях сярэдзіны XII — канца XIV ст. Сінія шкляныя ўстаўкі складаюць у Ноўгарадзе 30% ад агульнай колькасці пярсцёнкаў з устаўкамі [77].

*Шкляныя пярсцёнкі* — 3 экз. (рыс. 19, *3*). Усе знаходкі з Маскавічаў у фрагментах. Па форме пярсцёнкі гладкія, з патоўшчанай сярэдзінай, па колеру зялёныя, ярка-зялёныя і фіялетавыя. Шкляныя пярсцёнкі з'явіліся ў XI ст. і бытавалі да канца XIV ст.[78]

*Сярэбраны шасцівугольны шчыток ад пярсцёнка.* Знойдзены ў Маскавічах. Шчыток ад пярсцёнка ў цэнтры ўпрыгожаны крыжам на чэрненым фоне, схематычнымі галінкамі па баках і трохвугольнікамі па вуглах. Па класіфікацыі Т. І. Макаравай, маскавіцкая знаходка адносіцца да тыпу III, падтыпу I (другая палова XII — пачатак XIV ст.) [79]. На думку даследчыцы, крыж упісаны ў падкованападобную фігуру, якая нагадвае адначасова і падкову «знака Рурыкавічаў», і падкову геаметрызаваных галінак, што абрамляюць крыж.

**Фібулы.** Знойдзены ў пахавальных помніках (17 экз.) і на паселішчах, у тым ліку ў Маскавічах (18 экз.). Сярод фібул з пахаванняў 5 жалезных падкованападобных са спіралепадобнымі канцамі, астатнія — з каляровых металаў: 1 тардзіраваная, 1 з макападобнай галоўкай і 10 са спіралепадобнымі канцамі. Усе яны адносяцца да тыпу падкованападобных. На думку Л. К. Вайткунскене, жалезныя фібулы гэтага тыпу з'явіліся ў VIII ст.[80] Падкованападобныя бронзавыя фібулы са спіралепадобнымі канцамі, трохвугольныя ў сячэнні, датуюцца X — XII стст., але асноўная маса іх адносіцца да X — XI стст. У Ноўгарадзе яны знойдзены ў слаях X — сярэдзіны XIII ст.[81] Тардзіраваная фібула (рыс. 8, *3*) датуецца X — XI стст. Фібулы з макападобнымі галоўкамі бытавалі ў X — XII стст.[82]

Сярод маскавіцкіх фібул 13 цэлых і 5 у фрагментах. Усе яны зроблены з каляровых металаў. 10 з іх падкованападобныя. 3 фібулы са спіралепадобнымі канцамі: 1 у сячэнні круглая (рыс. 34, *2*), а 2 сегментападобныя (рыс. 34, *13*). Адна з фібул з макападобнымі галоўкамі мае рыфлёную дугу. Дзве падкованападобныя фібулы знойдзены без канцоў. Адна з іх мае трохвугольнае сячэнне, другая — сегментападобная. Ад трох падкованападобных фібул знойдзены канцы: зааморфны (рыс. 34, *3*), ромбападобны (рыс. 34, *5*) і сегментападобны (рыс. 34, *6*).

Фібулы ў выглядзе звярыных галовак адносяцца да XI — XIII стст. і былі шырока распаўсюджаны сярод балцкіх старажытнасцей [83]. Фібулы з ромбападобнымі канцамі сустракаюцца ў мужчынскіх пахаваннях балтаў і эстаў, прытым толькі каля пляча. На тэрыторыі Кіеўскай




*Рыс. 34. Упрыгожанні з гарадзішча Маскавічы: 1 — чарапахападобная фібула; 2, 4, 9, 13 — падковападобная фібула; 3, 5, 6, 10 — фрагменты фібул; 7 — рагнаплечая фібула; 8, 11 — круглыя плоскавыпуклыя фібулы; 12 — накладка на скураны раменьчык; 14, 15 — спражкі*

Русі такія фібулы знойдзены ў Яраслаўскай і Наўгародскай абласцях. Датаванне іх — X — першая палова XI ст.[84] Фібулы з сегментападобнымі галоўкамі характэрны для земгалаў XI — XIII стст.[85] Адна з фібул падкавападобная з патоўшчанымі канцамі. Па назіраннях З. М. Сяргеевай, подобныя ўпрыгожанні былі шырока распаўсюджаны ў многіх мясцовасцях Балтыкі, але найбольшая іх канцэнтрацыя прыходзіцца на заходнія і цэнтральныя раёны Літвы, басейны Ліелупэ і Заходняй Дзвіны [86].

Самымі шматлікімі ў Маскавічах з'яўляюцца круглыя пласцінчатыя фібулы з выпукла-ўвагнутым сячэннем — 7 экз. (рыс. 34, *8, 11*). Адна з іх па краю ўпрыгожана кропкамі. Аналогіі такім фібулам ёсць сярод літоўскіх старажытнасцей XI — XIII стст.[87]

У Маскавічах знойдзена чарапахападобная фібула з ліліяпадобным арнаментам і гладкімі краямі, адзін з якіх завострaны (рыс. 34,*1*). Фібула адносіцца да карэльскага і літоўскага тыпаў. Лічыцца, што такія ўпрыгожанні ўзніклі пад уплывам шкарлупкападобных скандынаўскіх фібул і развіваліся ў самастойныя тыпы, якія бытавалі ў XII — XIII стст. на Карэльскім перашыйку, у паўднёва-ўсходнім Прыладажжы і ў ліваў. У Ноўгарадзе аналагічныя фібулы выяўлены ў слоі 60 — 90-х гадоў XIII ст.[88]

Знойдзена адна раўнаплечая фібула (рыс. 34, *7*). Па паходжанню такія фібулы лічацца скандынаўскімі. Храналагічны дыяпазон іх бытавання — IX — XIV стст. Раўнаплечыя фібулы вядомы ў Карэліі, Прыладажжы, Гнёздаве [89]

**Іншыя ўпрыгожанні, дэталі касцюма і розныя ювелірныя вырабы.** Гэтая катэгорыя рэчаў знойдзена на пасяленнях і ў пахаваннях.

*Скроневыя кольцы.* Два пацеркавыя скроневыя кольцы знойдзены ў Маскавічах (рыс. 30, *25*). Яны гладкія, з дзвюма пацеркамі, якія складаюцца з двух спаяных паўшар'яў. Датаванне такіх знаходак — XI—XIV стст.[90]

Шматлікія драцяныя пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы. У маскавіцкай калекцыі ёсць адно скроневае кальцо, якое складаецца з двух змацаваных пярсцёнкападобных кольцаў (рыс. 35, *13*). Пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы не з'яўляюцца храналагічнай адзнакай. У Ноўгарадзе яны сустрэты ў слаях XI — XV стст. [91]

На Маскавіцкім гарадзішчы знойдзены фрагменты вяціцкага сямілопасцевага скроневага кальца (рыс. 35, *16*). Лічыцца, што за межамі вяціцкага арэала сямілопасцевыя скроневыя кольцы адзінкавыя і адлюстроўваюць рассяленне з зямлі вяцічаў [92].

У курганах каля вёсак Чарневічы, Абрамава і Лісна зафіксаваны знаходкі бранзалетападобных скроневых кольцаў. Канцы ў іх звязаныя (рыс. 6, *15*) або самкнёныя. Па даных В. В. Сядова, звязаныя скроневыя кольцы характэрны для смаленскіх і полацкіх крывічоў. Іх датаванне — канец X — пачатак XII ст. [93]

У Маскавічах, Прудніках [94] і ў курганным могільніку ў Лясной (рыс. 7, *11*) знойдзены скроневыя месяцападобныя кольцы. Яны ўпрыгожаны вочкападобным арнаментам, але вочкі размешчаны па-рознаму. Падобныя кольцы вядомы ў Старой Ладазе. О. І. Давідан адносіць іх да VIII — IX стст.[95] Такія рэчы знойдзены ва Усходняй Латвіі: Краслава, Саулескалнс, Зілупэ [96], на гарадзішчы Мадаланэ [97].

*Шыйныя грыўні* (4 цэлыя і 4 у фрагментах). Цэлыя грыўні знойдзены ў пахавальных помніках: курганах каля Лясной (рыс. 8, *2*), Чарневічаў, Уклі, у грунтавым могільніку каля Казлоўцаў. Грыўні ў Ляс-




*Рыс. 35. Вырабы і ўпрыгожанні з каляровых металаў з гарадзішча Маскавічы: 1, 2, 10 — накладкі; 3 — падвеска; 4 — фрагмент пярсцёнка; 6—9 — ланцужкі; 11 — капавушка; 12 — шпілька; 13, 16 — скроневыя кольцы; 14, 15 — фрагменты бранзалетаў; 17, 18 — дужкі ад меднага посуду*

ной і Уклі вітыя, з петлепадобнымі канцамі. У чарневіцкай вітай грыўні адзін канец петлепадобны, раскаваны і арнаментаваны, другі абрублены. Грыўня з Казлоўцаў тардзіраваная з гранёнымі канцамі. У Маскавічах знойдзены фрагменты ад грыўняў. Два фрагменты з чатырохграннымі канцамі (рыс. 33, *13*). Такія грыўні былі папулярныя ў латгалаў, земгалаў, аукштайтаў у канцы I — пачатку II тысячагоддзя. Дзве другія грыўні зроблены з кручанага дроту — адна сплецена з трох вітых драці-

нак (рыс. 33, *16*), другая вітая з двух драцінак і мае петлепадобныя канцы (рыс. 33, *17*). Датаванне такіх грыўняў — X — XI стст.[98]

*Іншыя ўпрыгожанні з металаў.* У Маскавічах знойдзена бочкападобная медная пацерка, упрыгожаная напаянымі кольцамі з дроту (рыс. 30, *12*). У Ноўгарадзе такія знаходкі вядомы ў слаях XII — XIII стст.[99] На Маскавіцкім гарадзішчы знойдзены цэлы двухзвённы ланцужок, шматлікія кавалкі ад розных ланцужкоў (рыс. 35, *5—9*), больш за 30 спіральных пранізак дыяметрам 2 — 7 мм (рыс. 19, *4 — 6*), а таксама язычкі-зашпількі ад падковападобных фібул (рыс. 34, *10*). Спіральныя пранізкі сустракаліся і ў пахавальных помніках (рыс. 5, *2 — 4*; рыс. 7, *4 — 6*). У адным з курганоў каля в. Лясной знойдзены ажарэлак з розных пранізак, нанізаных на льняны шнурок. Падобныя ажарэлкі вядомы сярод старажытнасцей карэлы [100].

*Дэталі касцюма і розныя ювелірныя вырабы.* У Маскавічах знойдзена 6 бронзавых гузікаў. Два з іх маюць па дзве адтуліны. У двух гузікаў ёсць праразныя лініі паміж адтулінамі (рыс. 31, *6*) і два зроблены з двух полых паўшар'яў. Аналагічныя знаходкі вядомы ў Ноўгарадзе [101].

У Маскавічах знойдзены таксама 23 жалезныя спражкі (рыс. 32, *1—3*), розныя па форме і памерах. Частка з іх была паяснымі, іншыя — падпружнымі. Знойдзены таксама дзве медныя фігурныя спражкі. Адна з іх прамавугольная і мае фігурны прыёмнік для рамяня (рыс. 34, *15*). Спражкі, падобныя маскавіцкім, шырока распаўсюджаны на ўсіх усходнеславянскіх землях. У Ноўгарадзе яны знойдзены ў слаях другой чвэрці XII — пачатку XIV ст.[102]

Жалезныя спражкі знойдзены пры раскопках курганоў з трупаспаленнямі каля в. Бяльмонты (рыс. 5, *12*) і в. Богіна. У курганным могільніку Кублішчына ў насыпах з трупапалажэннямі знойдзены тры лірападобныя спражкі (рыс. 7, *7, 8, 10*). Лірападобная спражка знойдзена ў Усці ў пахаванні па абраду трупаспалення. У Ноўгарадзе такія знаходкі вядомы ў слаях, якія датуюцца першай чвэрцю XI — канцом XII ст. Па пазіраннях М. В. Сядовай, яны сустракаюцца на вялікіх абшарах: у наўгародскіх, мінскіх, смаленскіх, уладзімірскіх, падмаскоўных курганах, у Прыкам'і і нават у Сярэдняй Азіі [103].

У адным з курганоў каля в. Лясная знойдзена медная спражка з авальнай, завостранай на канцы рамкай, якая непасрэдна пераходзіць у прамавугольную аснову. Лірападобная частка спражкі арнаментавана насечкамі. Падобныя спражкі вядомы сярод усходнеславянскіх старажытнасцей X — XI стст. У Ноўгарадзе яны знойдзены ў слаях канца XI — канца XII ст.[104]

Упрыгожаннем касцюма, як жаночага, так і мужчынскага, служылі невялікія бляшкі розных форм. Яны нашываліся на галаўныя ўборы, каўняры, манжэты, краі адзення. Такімі бляшкамі часта ўпрыгожваліся і конская вупраж. У Маскавічах знойдзена 7 такіх бляшак. Яны зроблены з тонкай ліставой медзі (рыс. 34, *12*), злёгку выпуклыя і ўпрыгожаны геаметрычным арнаментам.

Да дэталяў касцюма адносяцца і два паясныя кольцы, знойдзеныя ў Кублішчыне (рыс. 7, *9*). Аналагічныя паясныя кольцы сустракаліся ў наўгародскім культурным слоі сярэдзіны X — сярэдзіны XIV ст.[105] У Маскавічах вядома бронзавая капавушка (рыс. 35, *11*). Аналагічная знаходка вядома на латгальскім гарадзішчы Асатэ. Даследчыкі мяркуюць, што такія рэчы выконвалі функцыю бытавога інвентару і адначасова з'яўляліся ўпрыгожаннямі. Капавушкі асабліва характэрны для касцюма карэлы [106].

Для большасці вывучаных помнікаў характэрны пацеркі. На гарадзішчах яны не шматлікія. Як і на іншых старажытнарускіх землях, пацеркі з'яўляліся ў асноўным упрыгожаннем вясковых жанчын. Таму ў курганах яны больш шматлікія і разнастайныя — лімонкі, вочкападобныя, бісерныя, зонныя, рабрыстыя, золаташкляныя, срэбрашкляныя, а таксама сердалікавыя і бурштынавыя. На Маскавіцкім гарадзішчы знойдзена 45 пацерак. Яны падраздзяляюцца на шкляныя шарападобныя (6 экз.), зонныя (26 экз.), вінтападобныя (2 экз.), сердалікавыя (4 біпірамідальныя і 1 шарападобная), падоўжаныя чорныя шкляныя з жоўтым упрыгожаннем (2 экз.), кварцавыя шарападобныя (2 экз.) і 1 медную. Сярод зонных пацерак 9 сініх, 6 карычневых, 5 чорных, 3 зялёных, 2 фіялетавыя і 1 жоўтая. Зонныя пацеркі характэрны для XII — XIII стст., сердалікавыя біпірамідальныя — XI — XIV стст., сердалікавыя шарападобныя — канца IX — XI ст. Медная пацерка бочкападобная і ўпрыгожана напаянымі драцянымі кольцамі (рыс. 30, *12*). У Ноўгарадзе такія знаходкі вядомы ў слаях XII — XIII стст.[107] Зонныя пацеркі знойдзены і на іншых гарадзішчах, а золаташкляныя — у Браславе і Дрысвятах.

Такім чынам, можна канстатаваць, што рэчы з жалеза, косці, каменя, гліны і шкла аналагічныя рэчам іншых старажытнарускіх гарадоў, толькі ва ўпрыгожаннях назіраецца моцны прыбалтыйскі ўплыў.

*Глава III*

# *ГАСПАДАРЧАЕ ЖЫЦЦЁ*

## *1. ЗЕМЛЯРОБСТВА, ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ І ПРОМЫСЛЫ*

Асновай эканомікі ў IX—XIV стст. была сельская гаспадарка: земляробства і звязаная з ім жывёлагадоўля. Аб вядзенні земляробства сведчаць знаходкі ў Маскавічах наральнікаў, кавалка сашніка, чатырох частак сярпоў. Агульная даўжыня аднаго з маскавіцкіх наральнікаў 167 мм, даўжыня рабочай часткі 67, шырыня ўтулкі 70 мм. Памеры другога: агульная даўжыня 177 мм, даўжыня рабочай часткі 60, даўжыня ўтулкі 81 мм. Частка ад сашніка з плечыкам, па класіфікацыі А. В. Чарняцова, адносіцца да тыпу I сашнікоў, які ў лясной зоне ў XI—XIII стст. быў найбольш распаўсюджаны [1]. Даўжыня маскавіцкага сашніка 125 мм. На ім бачны сляды наваркі рабочай часткі.

Два абломкі сярпоў уяўляюць сабой фрагменты зубчатага ляза: адзін — частку чаранка, другі — чаранок і частку ляза. Найбольшая шырыня ляза апошняга сярпа 47 мм, шырыня спінкі 3, даўжыня чаранка 87 мм. Па класіфікацыі В. П. Левашовай, апошні серп можна аднесці да наўгародскага тыпу, які характарызуецца вялікімі памерамі і вышынёй выгіну ляза, роўнай 1/3 даўжыні асновы[2].

Знойдзены ў Маскавічах касар мае даўжыню 290 мм. Найбольшая даўжыня ляза 42 мм, таўшчыня спінкі 9 мм. Касары звычайна выкарыстоўваліся пры расчыстцы ўчастка зямлі ад кустарнікаў. У Браславе знойдзена зерне жыта, ячменю, аўса, грэчкі, пшаніцы і гароху [3]. Наяўнасць сярод зярнят жыта пустазелля (асцёр жытні) дазваляе разглядаць жыта як азімую культуру, што даказвае факт існавання паравой сістэмы земляробства. Каменныя жорны з жалезнымі порхліцамі сведчаць аб наладжаным працэсе апрацоўкі сельскагаспадарчых культур. Трэба меркаваць, што развіваліся вырошчванне і апрацоўка льну.

Знаходкі ў Маскавічах двух цэлых наматыжнікаў і аднаго яго абломка, а таксама костачкі слівы дазваляюць сцвярджаць аб занятках агародніцтвам і садаводствам [4]. Адзін з цэлых наматыжнікаў мае даўжыню 140 мм, дыяметр абушнай адтуліны 32 мм. Даўжыня другога 105 мм, дыяметр адтуліны 33 мм. Мяркуючы па пісьмовых крыніцах, у той час вырошчвалі рэпу, капусту, буракі, моркву, цыбулю, кроп і яблыкі. Развіццю земляробства спрыялі добрыя геаграфічныя ўмовы — умерана цёплы і вільготны клімат, дзярнова-падзолістыя глебы, а таксама гушчыня рачной сеткі [5].

Вызначэнне і статыстычная апрацоўка астэалагічнага матэрыялу з раскопак гарадзішча Маскавічы праводзіліся палеазаолагам В. В. Шчагловай (Інстытут гісторыі АН БССР). Вызначальнымі аказаліся 2966 касцей мінімальна 495 асобін, якія належалі 6 відам капытных і 13 відам дзікіх жывёл. Сярод хатніх жывёл бык (13,8% ад агульнай колькасці асобін), дробная рагатая жывёла (19%), свіння (23,3%), конь (5%), сабака (5,4%), кошка (0,8%). Сярод дзікіх жывёл зубр (2,2% ад агульнай коль-

касці асобін), лось (11,2%), алень высакародны (0,4%), касуля (1,6%), кабан (9,7%), мядзведзь (0,8%), рысь (0,4%), воўк (0,6%), лісіца (0,6%), куніца (3,2%), выдра (0,2%), бабёр (6,3%), заяц (4,9%). Усяго рэшткаў хатніх жывёл 57,9%, дзікіх — 42,1%. Сярод хатніх жывёл найбольшы працэнт складае свіння, у два разы менш кароў і ў тры — коз і авечак. Рэшткі каня нешматлікія. Каровы ў Маскавічах былі невялікага памеру. Сярод коз і авечак шмат маладых асобін. Конь выкарыстоўваўся ў асноўным як цяглавая сіла і для ваенных мэт. Наяўнасць раздробленых касцей дазваляе меркаваць і аб ужыванні яго мяса ў ежу. Магчыма, маскавічане ўжывалі мяса дзікага каня (тарпана). Косці тарпана выяўлены і ў Браславе [6].

В. В. Шчаглова, вывучаючы маскавіцкую астэалагічную калекцыю, прыйшла да вываду, што ў выніку паляўніцтва маскавічане атрымлівалі мяса прыблізна ўдвая больш, чым ад развядзення хатняй жывёлы. Паляўніцтва давала не толькі мяса, але і пушніну. З пушных жывёл найбольш частай здабычай былі куніца, заяц і бабёр. Паляўніцтву ў Маскавічах прыдавалася не менш увагі, чым, напрыклад, на дзядзінцы Лукомля, які з'яўляўся добра ўмацаваным феадальным замкам [7]. Сярод астэалагічных рэшткаў з Маскавічаў, па вызначэнню заолагаў з Інстытута заалогіі АН УССР (Л. І. Рэкавец, Н. Г. Бялан), ёсць таксама рэшткі чорнага тхара (1 асобіна), вавёркі (41), рачной выдры (3), крапчатага сусліка (1), вадзяной палёўкі (4), шэрага пацука (6) і крата (1).

У Маскавічах знойдзены і шматлікія косці птушак. Іх вызначэнне (559 адзінак), праведзенае А. М. Дарафеевым (Віцебскі педагагічны інстытут) і А. С. Уманскай (Інстытут заалогіі АН УССР), паказала, што большасць належыць хатнім птушкам (336 адзінак). З іх 335 — курыцы (ад 53 асобін) і 1 косць — хатняй качцы. Дзікім птушкам належалі 223 косці ад 96 асобін. Вылучаецца 25 дзікіх птушак: глушэц, рабчык, гогаль, свіязь, галка, варона, чырок-свістунок, паганка вялікая, кнігаўка, сава балотная, чорны дзяцел, луток, крыжанка, баклан вялікі, цецярук, арланбелахвост, лысуха, чырвонагаловы нырок, крахаль, драч, шэрая курапатка, вяхір, ястраб, гусь, белавокі нырок. Мяса рабчыка, глушца, шэрай курапаткі, цецерука, крыжанкі і некаторых іншых птушак ужывалася ў ежу. Не выключана, што ў галодныя гады людзі карміліся мясам усіх птушак.

З бліжэйшых да Маскавічаў сінхронных паселішчаў арніталагічныя рэшткі вывучаны з раскопак Асацкага гарадзішча ва Усходняй Латвіі. Там выяўлена 16 відаў дзікіх птушак і косці хатняй курыцы [8].

Для паляўніцтва ўжываліся жалезныя гарпуны, якія прынята лічыць спецыфічнай зброяй на буйных жывёл, коп'і і лукі са стрэламі. Наканечнікі стрэл маглі выкарыстоўвацца і пры паляўніцтве.

Рыбалоўства насіла характар пастаяннага промыслу, чаму спрыяла вялікая колькасць азёр. Для рыбнай лоўлі выкарыстоўваліся разнастайныя прылады. У Маскавічах выяўлены двухзубая і адназубая восці. Лічыцца, што звычайна яны выкарыстоўваліся для здабычы буйной рыбы. Па назіраннях Р. Л. Розенфельда, двухзубыя восці сустракаюцца рэдка, а адназубыя — часцей. Адназубыя восці складаліся ў трохзубыя. Пры паломцы аднаго зуба яго лёгка можна было замяніць другім [9]. У Маскавічах знойдзена 10 блешняў і 50 рыбалоўных кручкоў. Блешні ўяўляюць сабой падоўжаную, некалькі выгнутую, лістападобную пласцінку, адзін канец якой пераходзіць у кручок, а другі мае адтуліну для прымацавання шнура. Сярод блешняў вылучаюцца дзве жалезныя (агульная даўжыня 120 і 150 мм), чатыры медныя (агульная даўжыня 120—150 мм), чатыры

алавяныя (даўжыня 50 мм). Да алавяных блешняў прыпаяны жалезныя кручкі. Рыбалоўныя кручкі па форме нагадваюць сучасныя. У сячэнні іх стрыжні квадратныя або прамавугольныя з крыху закругленымі вугламі. Агульная даўжыня кручкоў 29—73 мм. Пераважаюць кручкі даўжынёй 40—42 мм.

Пры раскопках у Маскавічах сабрана таксама вялікая колькасць іхтыялагічных рэштках. У выніку вывучэння каля 5 тыс. касцей і лускі, праведзенага Н. П. Александровіч, устаноўлена, што лавілі 13 відаў рыб: асятра, шчупака, ляшча, плотку, карася, язя, судака, акуня, ярша, сома, уюна, ліня і краснапёрку [10].

### 2. РАМЯСТВО І ГАНДАЛЬ

**Рамяство.** Большая частка з апісаных знаходак была выраблена на месцы. Адной з важнейшых галін вытворчасці з'яўлялася кавальская справа. Аб гэтым сведчаць знойдзеныя ў Маскавічах паўфабрыкаты: два крэсівы, тры нарыхтоўкі для гарпуноў, ключ. Металургічныя шлакі знойдзены каля гарадзішчаў Маскавічы, Рацюнкі, Прыднікі. Гэта тлумачыцца тым, што звычайна сырадутныя горны па прычыне небяспекі пажару размяшчаліся за межамі ўмацаванняў. Жалеза здабывалі з балотных руд, залежы якіх маюцца паўсюдна сярод забалочаных масіваў, па лугах і поймах рэк. Ускосным пацвярджэннем наяўнасці жалезаробчага рамяства і яго базіравання на мясцовай сыравіне з'яўляюцца тапонімы і мікратапонімы — Рудаўка, Рудня, Рудыя і г. д. [11]

М. Ф. Гурын у выніку вывучэння кавальскага рамяства Полацкай зямлі IX—XIII стст. прыйшоў да вываду, што яно не складала выключэння ў адносінах выкарыстання складаных тэхналагічных схем, якія ўжывалі еўрапейскія кавалі. Праведзеныя даследчыкам аналізы 258 вырабаў, знойдзеных пры раскопках аўтарам кнігі (237 рэчаў з Маскавічаў, 16 — з Рацюнкаў, 5 — з Лясной), паказалі, што пры вырабе рэчаў прымяняліся складаныя тэхналагічныя аперацыі: свабодная гарачая коўка металу са слабым і нераўнамерным навугляроджваннем; пакеціраванне, якое спалучала коўку і кавальскую зварку, тэрмаапрацоўку сталі; гарнавая пайка меддзю; цэментацыя і інш. Напрыклад, пры вырабе нажоў у Маскавічах шырока выкарыстоўвалася тэхналогія наваркі стальнога ляза на жалезную аснову рэчы. У асноўным ужываўся спосаб тарцовай наваркі. Цэментацыя прымянялася для павышэння цвёрдасці ляза сякеры. Для вырабу дрэваапрацоўчых прылад маскавіцкія кавалі выкарыстоўвалі шматслойныя нарыхтоўкі, практыкуючы таксама спалучэнне сталі з жалезам. Спосабам пакеціравання зроблены косы з Маскавічаў, а некаторыя сярпы з гэтага ж археалагічнага помніка ў выніку псеўдапакеціравання атрымалі шматслойную структуру, якую маюць і крэсівы з Маскавічаў. У адным з экземпляраў адзначаны ўзорчаты склад металу, які звараны з тонкіх стальных і жалезных палосак. Унутрыкорпусныя дэталі ў цыліндрычных навясных замках зроблены з нізкавугляродзістай сталі і жалеза, злучаны паміж сабой гарнавой пайкай. У якасці прыпою выкарыстоўвалі медзь і яе сплавы.

У Маскавічах асаблівая ўвага ўдзялялася механічнай шліфоўцы паверхні пяра наканечнікаў коп'яў. Металаграфічны аналіз аднаго з нажоў, знойдзеных у Рацюнках, паказаў, што пры яго вырабе прымянялася класічная трохпалосная пакетная схема. Бакавыя палосы па структуры неаднолькавыя. Адна з іх мае ферытную, а другая — ферытаперлітную структуру з адзнакамі палосчатасці. Зярністасць жалеза неаднародная.

Вывучэнне нажа з дапамогай мікразонда выявіла аднолькавую канцэнтрацыю прымесных хімічных элементаў ва ўсіх слаях пакета. Два нажы (лёзы) з курганоў каля Лясной былі падвергнуты металаграфічнаму аналізу. Высветлілася, што яны выраблены па трохпалоснай схеме: да цэнтральнай стальной паласы прываранны бакавыя жалезныя пласціны, якія забяспечвалі трываласць вырабу і самазаточванне ў працэсе эксплуатацыі. Гатовыя вырабы тэрмаапрацаваны, аб чым сведчыць структура нарыхтоўкі ў сярэдняй стальной паласе[12].

У Маскавічах выяўлены сляды ювелірнага рамяства. Знойдзена глiняная аднабаковая ліцейная формачка для адліўкі нацельных крыжыкаў, фрагменты каменнай ліцейнай формачкі для вырабу лістападобных падвесак, медныя пласцінкі, матрыцы для ціснення (13×13 мм) накладак са знакам свастыкі (рыс. 35, *2*), кавалачкі дроту, незавершаны ланцугатрымальнік і тры жалезныя ювелірныя пінцэты. Майстрам былі вядомы такія прыёмы пры вырабе ўпрыгожанняў, як коўка, ліццё, штампоўка. Не выключана, што ў Маскавічах існавала кавальска-ювелірная майстэрня, што даволі часта мела месца на падобных паселішчах[13]. Характар большасці апісаных упрыгожанняў паказвае, што яны разлічаны на шырокае кола спажыўцоў. Пытанне аб тым, адкуль і як маглі трапляць у Полацкую зямлю каляровыя металы, канчаткова не высветлена. Можна толькі меркаваць, што каляровыя металы маглі паступаць праз гандлёвыя гарады Заходняга Памор'я з Падунайя ці са Скандынавіі.

Драўляныя вырабы не захаваліся, але дрэва было традыцыйным відам сыравіны. З дрэва будаваліся хаты, абарончыя збудаванні, вырабляліся сродкі транспарту, мэбля, посуд, дрэўкі для коп'яў, стрэл і г. д. Асноўнымі прыладамі дрэваапрацоўчага рамяства былі сякеры, разцы, свярдзёлкі, скоблі, долаты. Была развіта таксама апрацоўка косці, аб чым сведчаць адходы касцярэзнай вытворчасці. Выраб з косці такіх рэчаў, як грабеньчыкі, накладкі і абоймiцы для тронак нажоў, патрабаваў складаных аперацый. Напрыклад, зубы грабеньчыкаў маглі быць прарэзаны пілкай, а вочкападобны арнамент мог быць нанесены толькі маленькім жалезным двухзубцам ці трохзубцам.

Мноства разнастайных фрагментаў кругавога посуду не выклікае сумнення ў тым, што на Маскавіцкім гарадзішчы было высока развіта ганчарнае рамяство. На пасяленні ці паблізу звычайна знаходзілася ганчарная майстэрня, што пацвярджаецца знаходкамі вялікай колькасці (больш сотні) донцаў гаршчочкаў з аднолькавымі клеймамі. Гліна для вырабу посуду, несумненна, выкарыстоўвалася мясцовая. Па даных геалогіі, па ўсім басейне Заходняй Дзвіны сустракаецца гліна, разнастайная па адсартаванасці пяскамі. Стужкавая гліна размяшчалася адразу пад раслінным слоем на глыбіні 1—2 м, а магутнасць месцанараджэння вар'іравала ад 2—3 да 10—15 м. Па этнаграфічных даных, напрыклад, у Дзісне для вырабу посуду бралі гліну на абрывістых берагах Заходняй Дзвіны[14]. Амаль на ўсіх днішчах посуду ёсць «борцікі», што сведчыць аб выкарыстанні падсыпкі. Бакавая прыдонная паверхня апрацоўвалася ўручную, аб чым, на думку А. А. Бобрынскага, сведчаць наплывы на прыдоннай частцы[15]. Частка пасудзін зроблена з цеста з дамешкам пяску. На зломе большасць фрагментаў аднакаляровыя, што сведчыць аб добрым абпальванні. У Мінскім навукова-даследчым інстытуце радыематэрыялаў праведзена вызначэнне тэмпературы абпалу керамікі метадам тэхнічных выпрабаванняў (водапаглынаннем) трох узораў кругавога посуду з Маскавічаў і трох з Рацюнкаў. Устаноўлена, што абпальванне ажыццяўлялася пры тэмпературы ад 750 да 1150 °С.

Ганчарнаму рамяству спадарожнічаў і выраб дзіцячых цацак. Цацкі ў Маскавічах рабіліся з бура-карычневай і цёмна-карычневай гліны. Частка цацак выраблена з белай азёрнай гліны.

Адной з важных галін хатняй вытворчасці было ткацтва. Яго значэнне пацвярджаюць шматлікія знаходкі гліняных і шыферных праселкаў. Матэрыялам для вырабу тканін служыла пража з авечай шэрсці і льнянога валакна. Пража рабілася рознай таўшчыні, аб чым дазваляе меркаваць адрозненне ў велічыні праселкаў. У Маскавічах знойдзены маленькія фрагменты тонкіх льняных тканін, якія захаваліся паміж бронзавымі ўпрыгожаннямі. У адным з курганоў каля в. Лясная бронзавыя спіралькі былі нанізаны на шнурок, звіты з дзесяці льняных нітак.

**Гандаль**. З апісанага вынікае, што рамяство было разлічана ў першую чаргу на мясцовыя патрэбы, але, несумненна, частка прадукцыі паступала і для навакольных паселішчаў. На прыкладзе рэчаў, знойдзеных у курганах, Б. А. Рыбакоў паказаў, што вырабы аднаго майстра звычайна мелі раён збыту ў радыусе 10—15 км. Далей пачыналася сфера ўплыву другога майстра[16]. Знаходкі пацерак у курганах сведчаць аб удзеле насельніцтва вёскі ў менавых гандлёвых сувязях. Асабліва разнастайныя пацеркі ў раёне р. Авуты (Чарневіцкія курганы).

Праз Полацкае Падзвінне праходзілі буйныя гандлёвыя водныя і сухапутныя шляхі. З Заходняй Дзвіны па прытоках і волаках можна было трапіць у Днепр і р. Вялікую. Паблізу ішоў гандлёвы сухапутны Аугшэземскі шлях з Літвы ў Пскоў і Ноўгарад. Сухапутны шлях ішоў і ўздоўж Заходняй Дзвіны.

Аб удзеле ў далёкіх гандлёвых сувязях сведчаць знаходкі шкляных бранзалетаў, пярсцёнкаў і пацерак, шыферных праселкаў, сердалікавых пацерак, ракавін кауры, бурштынавых крыжыкаў, чырвонагліпянай паліўной амфаркі, бронзавых лампадак і г. д. У адным з курганоў каля в. Лісна знойдзены фрагменты каўняра з чырвонай шаўковай тканіны, вышытай залатымі ніткамі[17]. Знаходкі фрагментаў дарагіх шаўковых тканін вядомы таксама і на суседняй тэрыторыі Усходняй Латвіі[18].

Як ужо адзначалася, большасць шкляных бранзалетаў, на думку Т. С. Скрыпчанкі, у Маскавічы трапіла з Кіева, частка магла паступаць з Полацка, дзе, мяркуецца, таксама была ўласная вытворчасць бранзалетаў[19].

Ракавінкі кауры, арэал знаходжання якіх абмежаваны Мальдзійскімі астравамі ў Індыйскім акіяне, маглі трапіць праз тэрыторыю Усходняй Латвіі. Даказана, што ў Латвію яны паступалі з паўночнага ўсходу, туды па Волзе і яе прытоках праз Наўгародскую зямлю, Пскоўшчыну па сістэме р. Вялікай і сухапутным шляхам у напрамку Лудзы[20]. З Латвіі на Браслаўшчыну маглі паступаць і некаторыя нацельныя крыжыкі[21]. Лічыцца, што большасць бурштынавых вырабаў траплялa з Прыбалтыкі. Адным са шляхоў іх пранікнення была Заходняя Дзвіна[22].

Шырокія гандлёвыя сувязі пацвярджаюцца знаходкамі бронзавых гірак-разнаважак. Даследчыкамі адзначана, што такія гіркі звычайна знаходзяць на тэрыторыі, дзе абарачаліся куфічныя дырхемы і сярэбраныя зліткі. У X — пачатку XI ст. гіркі служылі для зверкі грашова-вагавых адзінак, якія меліся ў абароце. Чатыры гіркі знойдзены на Маскавіцкім гарадзішчы і чатыры — у кургане Даўборскай групы Опсаўскага могільніка (раскопкі Ф. В. Пакроўскага). Тры маскавіцкія гіркі (вага 38,14, 30,9 і 20,5 г) і даўборскія апісаны Ш. І. Бекцінеевым. Усе гэтыя знаходкі даследчык аднёс да першай групы па распрацаванай ім класіфікацыі. Дзве маскавіцкія гіркі выдзелены ў першую падгрупу

і датуюцца канцом X ст., адна маскавіцкая гірка выдзелена ў другую падгрупу і датуецца XI — пачаткам XII ст. Даўборскія гіркі адносяцца да трэцяй падгрупы і датуюцца канцом X — пачаткам XI ст. Асаблівую цікавасць уяўляе маскавіцкая гірка са складанымі адзнакамі кратнасці. На яе вонкавым баку два кругі: адзін састаўлены з 20 маленькіх кружочкаў, другі — з 15. Кружкі нанесены пуансонам. На адваротным баку плоскасць падзяляецца лініямі на восем частак, у кожнай з якіх знаходзяцца два кружкі, так што атрымліваецца кратнасць у 16 адзінак (2×8). Ш. І. Бекцінееў лічыць, што з'яўленне такой гіркі — вынік пераходу рускай грашовай сістэмы ад куфічнага дырхема да выкарыстання заходнееўрапейскага дынарыя з сярэдзіны XI да пачатку XI ст.[23]

Чацвёртая маскавіцкая гірка мае паўсферычную форму і арнамент у выглядзе завіткоў. Вага гіркі 12,04 г. Па вызначэнню Ш. І. Бекцінеева, кратнасць гіркі 4 (завіткі) ці 5 (з улікам вочка ў цэнтры). Адсюль вагавая адзінка 3 або 2,4 г. Па даных Ш. І. Бекцінеева, у Маскавічах маецца звыш 10 дапаможных гірак-фрагментаў упрыгожанняў (фібул, бранзалетаў, пярсцёнкаў).

Вялікая жалезная гіра з Маскавічаў (рыс. 32, *12*) разам з пятлёй мае вышыню 88 мм і найбольшы дыяметр 93 мм. Вага яе 2,02 кг. На думку Ш. І. Бекцінеева, гэтай гірай можна было ўзважваць груз да 5 пудоў. Вагі з такімі гірамі шырока прымяняліся пры закупцы прадуктаў земляробства і збіральніцтва [24].

Аб гандлёвых сувязях сведчаць і скарбы манет (рыс. 3). Напрыклад, у 1867 г. у былым Дзісенскім павеце знойдзена 135 сярэбраных манет IX — першай паловы X ст. У 1888 г. каля в. Ахрэмцы на правым беразе р. Дрысы знойдзены 24 куфічныя дырхемы. Да 1870 г. адносяцца знаходкі двух абасідскіх дырхемаў пачатку X ст. каля Відзаў. У 1896 г. быў знойдзены скарб куфічных дырхемаў IX — X стст. каля в. Краснае на Дзісеншчыне [25]. У 1965 г. на тэрыторыі Міёрскага раёна знойдзены саманідскі дырхем першай паловы X ст.[26] Ёсць паведамленне аб знаходцы ў 1890-х гадах на востраве воз. Старапагосцкага скарбу арабскіх манет, якія потым паступілі ў Пецярбург [27]. У 1965 г. каля в. Гараўляны Глыбоцкага раёна знойдзены два скарбы, закапаныя ў першай палове XI ст. У склад аднаго са скарбаў уваходзілі 134 куфічныя дырхемы і 15 іх імітацый, а таксама фрагмент чэшскага дынарыя Баляслава III (999 — 1003 гг.). У другім скарбе было 220 куфічных дырхемаў і 185 заходнееўрапейскіх дынарыяў [28].

Пры раскопках гарадзішча Гарадзец знойдзены 2 дырхемы: адзін канца VIII — пачатку IX ст., другі першай паловы X ст.[29] Вядомы дырхемы і на селішчы ў Прудніках (раскопкі А. Р. Мітрафанава, В. І. Шадыры). На тэрыторыі Усходняй Латвіі ёсць скарбы і знаходкі адзінкавых усходніх і заходнееўрапейскіх манет [30].

Пацвярджэннем існавання гандлёвых сувязей на тэрыторыі Браслаўскага Паазер'я ў так званы «безграшовы перыяд» з'яўляюцца сведчанні пісьмовых крыніц. Да 1159 г. адносіцца паведамленне аб пачатку гандлю брэменскіх купцоў з лівамі і рускімі на Заходняй Дзвіне [31]. У хроніцы Генрыха Латвійскага паведамляецца аб тым, што «... у 1210 годзе Арнольд, брат-рыцар, пасланы быў з таварышамі да караля полацкага даведацца, ці не згодзіцца ён на мір і не адчыніць нямецкім купцам доступ у свае ўладанні...» [32] Да 1229 г. адносіцца дагавор Рыгі са Смаленскам, да 1263 г. — дагаворная грамата князя літоўскага Гердзеня з лівонскім магістрам і гарадамі Рыгай, Полацкам і Віцебскам, да




*Рыс. 36. Малюнкі на касцях жывёл з гарадзішча Маскавічы*

1265 г.— дагавор полацкага князя Ізяслава з лівонскім магістрам і з Рыгай [33].

Гандлёвыя сувязі жыхароў Полацкага княства з суседнімі ўсходнеприбалтыйскімі плямёнамі пацвярджаюць даследаванні лінгвістаў, якія сведчаць, што ў латышскую мову перайшлі са старажытнарускай такія словы, як tirgus (торг), cena (цана), bezmens (бязмен) і шэраг іншых [34].

Ёсць падставы меркаваць аб транзітным гандлі і існаванні невялікіх гандлёвых факторый. Напрыклад, такім пунктам ужо ў X ст. магло быць паселішча, якое існавала на месцы Маскавіцкага гарадзішча.

Тут знойдзены дзве гіркі канца X ст., адна XI — пачатку XII ст. і вялікая жалезная гіра. У параўнанні з суседнімі сінхроннымі паселішчамі ў Маскавічах знойдзена звыш 200 фрагментаў шкляных бранзалетаў і больш 100 шыферных праселкаў. У Браславе знойдзены толькі адзін шкляны бранзалет, у Рацюнках — два, у Прудніках і Дрысвятах яны пакуль што не выяўлены. Не выключана, што ў Маскавічах быў пункт для абмену прадуктаў мясцовага вырабу і промыслаў на прывазныя тавары. Воз. Дзерба, на беразе якога размяшчалася маскавіцкае паселішча, уяўляла сабой зручную гавань, куды па р. Друйцы з Заходняй Дзвіны маглі заходзіць гандлёвыя судны. Магчымы іншы шлях: па волаку з Заходняй Дзвіны, а потым праз азёры Снуды і Неспіш. На такую думку наводзяць і даныя тапанімікі. У Браслаўскім раёне ёсць в. Перавалока, а да 1971 г. існаваў хутар з такой жа назвай [35]. Паблізу в. Перавалока, на супрацьлеглым баку праліва паміж азёрамі Снуды і Волас, адзін з пагоркаў носіць назву Гарадзішча і аб ім бытуе шэраг народных паданняў. Культурны слой тут пакуль што не выяўлены. Не выключана, што на гэтым месцы быў нейкі невялічкі вартавы пункт, адкуль ажыццяўляўся нагляд за пралівам і волакам.

Ускосным пацвярджэннем сувязей маскавічан з узбярэжжам Балтыйскага мора з'яўляюцца малюнкі суднаў на абломках касцей жывёл. Судны ідэнтычныя рыжскім і брэменскім когам. Такія судны наўрад ці маглі заходзіць у Браслаўскія азёры і былі намаляваны па памяці прыезджым чалавекам або маскавічанінам, які пабываў на моры (рыс. 36, *2, 3*).

Такім чынам, зыходзячы з характарыстыкі знаходак і звестак пісьмовых крыніц, можна заключыць, што на працягу IX — XIV стст. насельніцтва Браслаўскага Паазер'я актыўна ўдзельнічала ў міжнародным гандлі.

*Глава IV*

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЕ І ЭТНІЧНЫ СКЛАД НАСЕЛЬНІЦТВА

## 1. САЦЫЯЛЬНЫ І ЭТНІЧНЫ СКЛАД НАСЕЛЬНІЦТВА

У феадальным грамадстве дэталі касцюма ўказвалі месца ўладальніка на іерархічнай лесвіцы, а таксама яго этнічную прыналежнасць. З даных археалогіі, антрапалогіі і тапанімікі вынікае, што славянская каланізацыя насіла адносна мірны характар і гэта прывяло да складання балта-славянскай этнічнай еднасці.

Аб характэрных рысах мясцовага этнасу сведчаць знаходкі — нажы, прыземістыя гаршкі, скроневыя кольцы з кручкападобнымі канцамі, а таксама элементы пахавальнага абраду: наяўнасць каменных агароджак, частае змяшчэнне ў пахаваннях з трупапалажэннем ляпнога посуду, а ў пахаваннях з трупаспаленнямі кругавога посуду, ранняе з'яўленне пахаванняў у падкурганных ямах і шматінвентарнасць мужчынскіх пахаванняў.

Аналіз упрыгожанняў паказвае, што сельскае насельніцтва па адзенню адрозніваецца ад жыхароў умацаваных пунктаў. Напрыклад, для насельніцтва вёскі не характэрны металічныя падвескі, але любімым упрыгожаннем з'яўляліся шкляныя пацеркі. Фібулы ў курганах сустракаюцца ў асноўным падкападобныя са спіралепадобнымі канцамі, у той час як на гарадзішчах гэта катэгорыя ўпрыгожанняў прадстаўлена шматлікімі відамі. Так, у Маскавічах знойдзены фібулы — раўнаплечая, чарапахападобная, пласцінчатая круглая з выпукла-ўвагнутым сячэннем, падкападобныя з зааморфнымі і з сегментападобнымі галоўкамі, з патоўшчанымі, ромбападобнымі і спіралепадобнымі канцамі. Жыхары вёскі насілі зааморфныя бранзалеты, бранзалеты, вітыя з двух драцінак з завязанымі або абрубленымі канцамі, радзей — пласцінчатыя. Ва ўмацаваных паселішчах насілі больш разнастайныя бранзалеты: плеценыя, несапраўдна-плеценыя, плеценыя з петлепадобнымі канцамі, багата арнаментаваныя шырокапласцінчатыя. Асабліва распаўсюджаны шкляныя бранзалеты.

На агульным фоне курганных пахаванняў, якія ў асноўным мелі небагаты інвентар, вылучаюцца адносна багатыя. Напрыклад, у могільніку каля в. Лясной знойдзены два шматінвентарныя пахаванні, у якіх былі вітыя бранзалеты, скроневыя кольцы, бурштынавыя і разнастайныя шкляныя пацеркі, у тым ліку вочкападобныя. У кургане каля в. Лісна знойдзен каўнер з чырвонай візантыйскай тканіны, вышыты залатымі ніцямі [1]. Шэраг рэдкіх і каштоўных пацерак, у тым ліку і залачоных, знойдзены ў чарневіцкіх курганах. Усё гэта сведчыць аб сацыяльным расслаенні вёскі. У сельскіх могільніках ёсць пахаванні са зброяй (Укля, Рацкі Бор, Чарневічы, Усце, Дзянісенкі, Кублішчына). Аднак у асноўным гэта ўсяго 1—2 пахаванні ў могільніку сярод вывучаных курганоў. Напрыклад, у Уклі гэта пахаванне па абраду трупапалажэння на мацерыку. Касцяк арыентаваны на захад. Пры нябожчыку знаходзіліся наканечнікі кап'я, крэсіва, нож, лірападобная спражка, спіральныя пранізкі, падкападобная фібула са спіралепадобнымі канцамі і круга-

вы арнаментаваны гаршчок. Пахаванні са зброяй у Рацкім Бары і Усці — адзіныя пакуль што пахаванні па абраду трупапалажэння ў гэтых групах. Напрыклад, у Рацкім Бары пахаванне было зроблена на мацерыку. Нябожчык арыентаваны галавой на ўсход. Акрамя наканечніка кап'я знойдзены крэсівы, сякера і спіральныя пранізкі. Хутчэй за ўсё пахаванні ў Рацкім Бары і Усці — гэта пахаванні дружыннікаў, якія жылі па вёсках і збіралі даніну.

Асабліва неаднародным быў сацыяльны склад умацаваных паселішчаў. Гэта прасочваецца па выніках раскопак Маскавіцкага гарадзішча. Сярэбраная полая падвеска-конік, скроневыя кольцы з сярэбранымі пацеркамі, сярэбраная 6-вугольная ўстаўка ад пярсцёнка, шыферны нацельны крыжык у сярэбранай аправе, візантыйскія шкляныя бранзалеты, пазалочаныя гузікі, шэраг іншых рэчаў маглі належаць толькі людзям багатым і знатным. Знаходкі трох крыжоў-энкалпіёнаў, у тым ліку ўпрыгожанага пазалотай і выемчатай эмаллю, дазваляюць меркаваць аб пражыванні ў Маскавічах святароў.

На падставе знаходак зброі, рыштунку каня і конніка, абломка касцей жывёл з выявамі на іх воінаў можна сцвярджаць аб наяўнасці ваенных гарнізонаў. Велічыня гарнізонаў залежала ад месца паселішча ў сістэме абароны. Дружына ў сацыяльных адносінах была не аднарод-




*Рыс. 37. Рэканструкцыя адзення па матэрыялах курганоў: а — дзявочы касцюм (в. Богіна р-на); д — касцюм дзяўчынкі 11—12-гадовага ўзросту (в. Укля Браслаўскага р-на);*

най, што пацвярджаецца характарам зброі, рыштункам каня і конніка. Напрыклад, жалезную булаву прынята лічыць зброяй радавых воінаў. Бронзавая булава, тым больш з упрыгожаннем, падкрэслівала знатнасць яе ўладальніка. Прывілеяванай зброяй лічыліся і мячы. Можна меркаваць, што воіны адначасова з нясеннем службы займаліся сельскай гаспадаркай і паляўніцтвам. У Маскавічах, як адзначалася, былі рамеснікі, што займаліся кавальскім, ювелірным, касцярэзным і ганчарным рамёствамі. Нейкую частку насельніцтва складалі купцы, якія былі заняты галоўным чынам транзітным гандлем.

Паселішчы ў Браславе, Дрысвятах, Маскавічах і Рацюнках хутчэй за ўсё выконвалі ролю парубежных пунктаў. Фарміраванне падобных пунктаў, якія ўзніклі на землях, што асвойваліся славянамі, праходзіла за кошт выхадцаў з розных плямёнаў (рыс. 37). Яшчэ князь Уладзімір перасяляў у парубежныя крэпасці «лепшых мужоў» з розных, часта аддаленых зямель. Гэтым ён дамагаўся дасягнуць двух мэт: умацаваць граніцы і ліквідаваць мясцовую племянную арыстакратыю. Узрастанне моцы паселішчаў вяло да таго, што ў іх сцякалася насельніцтва акругі, якое наймалася на службу. Грунтуючыся на даследаваннях П. П. Талочкі, можна адзначыць, што на 1 га плошчы ў вялікіх гарадах пражывала каля 130 — 140 чалавек, а ў малых магчыма і больш [2].



*Браслаўскага р-на); б, в, г — дзявочыя касцюмы (гарадзішча Маскавічы Браслаўскага е — мужчынскі касцюм (в. Кублішчына Міёрскага р-на)*

Этнічнымі індыкатарамі служаць упрыгожанні. Звычайна у гарадах, заселеных толькі славянамі, знаходзяць упрыгожанні, характэрныя для аднаго племя ці саюза сваяцкіх плямёнаў. На землях жа, якія асвойваліся славянамі, знаходзяць розныя па племяннной прыналежнасці ўпрыгожанні [3]. Мяркуючы па ўпрыгожаннях, у дадзеным выпадку ва ўмацаваных паселішчах сяліліся выхадцы з усходнеславянскіх, фіна-угорскіх і ўсходнепрыбалтыйскіх зямель.

Крытэрыі для вывучэння этнічных элементаў касцюма добра распрацаваны ў археалагічнай літаратуры. Выходзячы з іх, можна вызначыць, што на даследаваных гарадзішчах сярод знаходак значнае месца займаюць усходнеславянскія ўпрыгожанні. Гэта шыракарогія лунніцы, пласцінчатыя падвескі-конікі, розныя манетападобныя падвескі, пласцінчатыя бранзалеты з геаметрычным арнаментам, бранзалеты, вітыя з дроту, лістападобныя падвескі, скроневыя кольцы, шкляныя бранзалеты, пярсцёнкі і пацеркі.

Ёсць падставы меркаваць аб пражыванні ў Маскавічах выхадцаў з вяцкіх зямель. Аб гэтым сведчаць характэрныя для вяцічаў шыракасярэдзінныя рашотчатыя пярсцёнкі (рыс. 33, *7*), плецены бранзалет са шклянымі ўстаўкамі на канцах, плеценыя бранзалеты з петлепадобнымі канцамі (рыс. 33, *15, 20*), фрагменты вяцкага скроневага кальца (рыс. 35, *16*) і медная пацерка з напаянымі кольцамі (рыс. 30, *12*). Акрамя таго, арнамент тупаканечных пласцінчатых бранзалетаў знаходзіць аналогіі пераважна сярод вяцкіх старажытнасцей. Цікава, што два вяцкія скроневыя кальцы знойдзены ў Полацку [4].

Аб наяўнасці ў Маскавічах фіна-угорскага насельніцтва сведчыць полая білонавая падвеска-конік, характэрная для наўгародскай зямлі. Прысутнасць фіна-угорскага насельніцтва прасочваецца па знаходках у выглядзе вадаплаваючых птушак, фігурных ланцугатрымальнікаў, бронзавых цыліндрычных пацерак, нагрудных двухзвённых ланцужкоў, бранзалетаў і пярсцёнкаў, якія імітуюць косапляцёнку (рыс. 33, *10*). Чарапахападобная фібула з ліліяпадобным арнаментам і з адным завостраным канцом (рыс. 34, *1*) характэрная для літоўскага насельніцтва. Да ўсходнепрыбалтыйскіх упрыгожанняў ці ўпрыгожанняў, выкананых па іх узорах, адносяцца звярынагаловыя бранзалеты, розныя падкovападобныя фібулы, круглыя фібулы з выпукла-ўвагнутым сячэннем, вітыя шыйныя грыўні, трапецападобныя падвескі, спіральныя пранізкі. Прыбалтыйскі ўплыў прасочваецца і на бурштынавых пацерках. Сярод усходнепрыбалтыйскіх упрыгожанняў падкovападобныя фібулы з патоўшчанымі канцамі і круглыя пласцінчатыя фібулы з выпукла-ўвагнутым сячэннем лічацца літоўскімі старажытнасцямі, падкovападобныя фібулы са спіралепадобнымі канцамі — латгальскімі, з сегментападобнымі канцамі — земгальскімі і г. д.

Некалькі ўпрыгожанняў, знойдзеных у Маскавічах, атаясамліваюцца са скандынаўскімі вырабамі. Гэта раўнаплечая фібула (рыс. 34, *7*), падвеска-ланцугатрымальнік са спіралепадобнымі кругамі (рыс. 30, *20*) і падвеска ў выглядзе вадаплаваючай птушкі (рыс. 30, *3*). Аб прысутнасці скандынаваў у Маскавічах дазваляюць меркаваць знаходкі абломкаў касцей жывёл з нанесенымі на іх рунічнымі надпісамі і знакамі. Надпісы на касцях жывёл маглі быць пакінуты славянізаванымі нашчадкамі выхадцаў са Скандынавіі, воінамі-наёмнікамі, купцамі або скандынавамі, якія ўдзельнічалі ў агрэсіі крыжакоў. Цікавым з'яўляецца наступны факт. У «Сазе аб хрышчэнні», якую прынята лічыць напісанай у другой

палове XIII ст., гаворыцца: «...Я прыйшоў туды, дзе Торвальду, сыну Кадрана, Хрыстос даў упакаенне: там ён пахаваны ў высокай гары ўверх па цячэнню Дроўна, каля царквы Иаана...» Т. М. Джаксан у якасці магчымай лакалізацыі Дроўна называе ваколіцы Браслава, дзе сканцэнтраваны некалькі падобных гідронімаў — азёры Дрывяты, Дрысвяты, Дзерба, р. Друйка, і падкрэслівае магчымасць пахавання паблізу Маскавічаў ісландскага місіянера, які вяртаўся на радзіму па «ўсходняму шляху»[5].

На гарадзішчы Пруднікі знойдзена касцяная праколка з зааморфнай галоўкай (X — XI стст.). Падобныя знаходкі вядомы ў Кіеве, Гняздове, Шаставіцах і ў Яраслаўскім Паволжы, менавіта ў тых месцах, якія звязаны з прысутнасцю скандынаваў[6].

### *2. ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА. ПОМНІКІ ЭПІГРАФІКІ*

Духоўныя бакі жыццядзейнасці людзей часткова матэрыялізуюцца ў рэчах. Размежаванне матэрыяльнай і духоўнай культуры на аснове форм аб'ектывізацыі дзейнасці людзей даволі ўмоўнае, таму што многія прадукты чалавечай працы з'яўляюцца адначасова вынікам як духоўнай, так і фізічнай працы. Таму на падставе археалагічнага матэрыялу ёсць магчымасць у нейкай ступені ўявіць духоўную культуру.

Ужо ў першыя стагоддзі існавання Кіеўскай Русі выявілася розніца паміж вёскай і горадам у аспекце культуры, якая асабліва ўзрасла пасля прыняцця хрысціянства. Сам факт прыняцця хрысціянства і абмежаванне яго першапачатковай зоны гарадамі былі вынікам і паказчыкам складання дзвюх культур[7].

Заснаванне Полацкай епархіі даследчыкі адносяць да часу Уладзіміра Святаслававіча і яго сына Усяслава. Епіскапская кафедра з царквой і дзявочым кляштарам у Полацку ўпершыню згадваецца ў 1105 г. Вядомы імёны полацкіх епіскапаў — Міна, Лука, Ілля[8]. Археалагічныя знаходкі і пісьмовыя крыніцы сведчаць аб тым, што ўжо ў X — XII стст. на тэрыторыі Усходняй Латвіі пачало распаўсюджвацца праваслаўе[9]. Але, з другога боку, вядома, што некаторыя язычніцкія свяцілішчы існавалі яшчэ ў XI — сярэдзіне XIII ст.[10] П. М. Бранцаў, спасылаючыся на храністаў, адзначае, што Адам Брэменскі ў адным са сваіх сачыненняў пісаў: «...Калі рускія былі язычнікамі, часта ездзілі да літоўцаў пакланяцца іх божышчам...» Далей аўтар паведамляе, што тое ж самае гаворыцца ў Іакімаўскім летапісе: «...Храмы і жрацы земіголы знаходзіліся ў глыбокай павазе ў рускіх славян»...[11] А як вядома, землі земіголы знаходзіліся паблізу даследаванай тэрыторыі. Варта адзначыць, што на адным з астравоў воз. Богінскага каменны ідал прастаяў да пачатку XX ст. Гэта была статуя ў палову чалавечага росту, са складзенымі на грудзях рукамі і адбітай галавой. Мясцовае насельніцтва называла ідала «стодам»[12]. Гэтыя даныя гавораць аб доўгім бытаванні язычніцкіх вераванняў.

Многія са знойдзеных пры раскопках рэчаў сведчаць аб язычніцкіх вераваннях і абрадах. Так, знаходкі ў Маскавічах чатырох каменных свідраваных сякер дазваляюць меркаваць аб веры ў «перуновыя стрэлы». Пры прарэзцы схілу на Маскавіцкім гарадзішчы знойдзены вапнавы камень, па велічыні і форме падобны на курынае яйка. Уся паверхня знаходкі распісана геаметрычнымі фігурамі, якія хутчэй за ўсё мелі магічнае значэнне (рыс. 25), таму што яйка ва ўсіх народаў лічыцца сімвалам здароўя і ўрадлівасці. У Старажытнай Русі, як вядома, шырока бытавалі арнаментаваныя пісанкі. У літаратуры выказваліся думкі, што знакі-клеймы на дншчах посуду насілі культавы характар. Яны адлюст-

роўвалі абогатварэнне і шанаванне неба, а таксама нябесных свяцілаў і з'яўляліся магічнымі знакамі агню пры абпале [13]. У Кіеўскай Русі разнастайныя падвескі, якія насілі часам па некалькі штук, выконвалі ролю не толькі ўпрыгожанняў, але і абярэгаў. Напрыклад, бурштынавыя падвескі і пацеркі лічыліся амулетамі, што ахоўваюць ад дурнога вока [14]. Ракавіны каўры вядомы не толькі як грашовыя адзінкі, але і як культавыя рэчы. Найбольшы іх наплыў у суседнюю Латвію, асабліва ў мясцовасці, населеныя латгаламі, назіраецца ў XII — XIII стст. У Нукшынскім могільніку (Усходняя Латвія) ракавіны каўры знойдзены ў пахаваннях пажылых жанчын [15]. Шматлікія бразготкі мелі рытуальнае значэнне. Яны, згодна з вераваннямі, лічыліся эмблемай бога-грамавержца, якія ахоўвалі людзей ад злых духаў і праганялі ад іх нячыстую сілу.

Формай светаўспрымання ў славян з'яўляўся культ прыроды. Падвескі-лунніцы сімвалізавалі месяц, плоскія стылізаваныя канькі і полыя шумячыя падвескі-конікі з'яўляліся ўвасабленнем дабра, шчасця і ўрадлівасці. Са старажытных часоў конь быў уведзены ў славянскую аграрна-магічную абраднасць і звязваўся з сонцам. Як сімвалы сонца вядомы і падвескі з крыжам у крузе. Бранзалеты са стылізаванымі зааморфнымі галоўкамі былі звязаны з культам змяі. Шматлікія пласцінчатыя бранзалеты з разнастайным геаметрычным арнаментам, які меў не толькі эстэтычны, але і засцерагальны характар. Хвалісты ўзор, а таксама перапляценне драцінак увасаблялі сімвалы вады. Насілі таксама амулеты з клыкоў і касцей жывёл. У Маскавічах, па вызначэнню В. В. Шчагловай, былі амулеты з астрагалаў зайца, лісіцы, каня. Шмат знаходак крыжыкаў-цельнікаў. За выключэннем адной знаходкі ў кургане, усе яны знойдзены на гарадзішчах. Крыжыкі зроблены з медзі, бронзы, волава, шыферу, бурштыну. На думку даследчыкаў, толькі частка з іх звязана з хрысціянствам, асноўная ж маса была паганскімі сімваламі і бытавала задоўга да прыняцця хрысціянства [16]. З хрысціянствам звязаны манетападобны медальён з выявай Аранты, знойдзены на гарадзішчы Прудніке [17], а таксама чатыры апісаныя крыжы-энкалпіёны і тры лампадкі з Маскавічаў.

У асэнсаванні духоўнай культуры вялікую ролю адыгрывае рэканструкцыя пахавальнага абраду. У язычнікаў пераход у іншы свет не дапускае змен у стане памёршага, а ў хрысціян нябожчык трапляе ў рай або пекла. Нягледзячы на распаўсюджванне хрысціянства, сельскае насельніцтва яшчэ многія стагоддзі прытрымлівалася язычніцкага пахавальнага абраду. У адпаведнасці з язычніцкімі вераваннямі, хаваючы нябожчыка ў святочным адзенні, забяспечвалі яго ўсім неабходным — прыладамі працы, ежай, зброяй. Часта перад засыпаннем магілы ў яе кідалі каштоўныя рэчы — дар нябожчыку. Так, напрыклад, у адным з курганоў паблізу в. Шо каля ног жаночага шкілета знойдзены бранзалет, віты з двух драцінак [18]. Падобнае зафіксавана і ў Уклі, дзе таксама ў жаночым пахаванні каля ног побач з гаршком ляжаў зааморфны арнаментаваны бранзалет. У чарнеўіцкіх курганах вядомы знаходкі ключоў. Ключы звычайна інтэрпрэтуюцца як сведкі завяршэння рытуалу замыкання нябожчыка на месцы пахавання, каб смерць не магла выйсці з магілы. Вядомы павер'і, што вострыя прылады (нажы), пакладзеныя ў магілы, адпужваюць «нячыстую сілу», а крэсівы спатрэбяцца нябожчыку для высякання агню. Знаходкі маленькіх сякерак таксама з'яўляюцца рэчамі культу.

Надзвычай цікавы факт зафіксаваны ў курганным могільніку каля в. Кублішчына. У парным безынвентарным пахаванні на грунце на жано-

чым чэрапе быў гарызантальны спіл верхняй часткі. Хутчэй за ўсё гэта звязана з малавядомым культам [19].

Працягламу захаванню язычніцкіх вераванняў спрыяла ўваходжанне тэрыторыі Полацкага княства ў склад Вялікага княства Літоўскага, дзе язычніцтва з'ўлялася дзяржаўнай рэлігіяй [20].

У Маскавічах знойдзены гліняныя дзіцячыя цацкі, якія зроблены ў выглядзе воіна ў кальчузе з поясам, а таксама ў выглядзе хатніх жывёл — свінні і авечкі (рыс. 27). У жыхароў умацаваных паселішчаў папулярнасцю карысталіся розныя гульні. Так, на Маскавіцкім гарадзішчы знойдзены 8 касцей для гульні — бабак, зробленых з таранных касцей розных жывёл. Адтуліны ў некаторых бабках заліты свінцом, а на некалькіх касцях прачэрчаны нейкія знакі. Уявіць ход гульні дазваляюць этнаграфічныя даныя. На падставе этнаграфічных даных можна ўявіць і дзіцячую цацку — «жужалку». Праз зробленыя ў костачках адтуліны працягваўся шнурок і, цягаючы за яго канцы, можна было чуць гукі.

Рашоткі, прачэрчаныя на касцях жывёл, нагадваюць дошкі для гульні ў шашкі, шахматы або таўлеі [21]. Аб знаёмстве з падобнымі гульнямі сведчыць знойдзеная шахматная пешка ў выглядзе касцянога цыліндра. Шматлікія абломкі касцей жывёл і праселкі з нанесенымі на іх надпісамі і знакамі, зашпілька кнігі, знойдзеныя ў Маскавічах, пісалы, знойдзеныя ў Браславе, — усё гэта сведчыць аб распаўсюджванні граматнасці. Знаходкі касцей жывёл з малюнкамі дазваляюць меркаваць аб мастацкай творчасці. Косці з такімі графіці былі ў двух раскопках, дзе яны выяўлены кампактнымі скапленнямі ў 2 — 3 слаях на невялікай плошчы. Косці з графіці — гэта ў асноўным абломкі рэбраў і метаподзій буйной і дробных хатніх жывёл (кароў, свіней, авечак) і буйных дзікіх жывёл (лася). Выявы на касцях выкананы ў тэхніцы прадрапвання і выразання. Сярод выяў вылучаюцца тры групы: I — малюнкі, II — знакі (адзінкавыя ці групы) і III — рашоткі (сеткі). У некаторых выпадках групам знакаў спадарожнічаюць малюнкі або рашоткі.

**Малюнкі.** Усе выкананы контурнымі лініямі. Гэта выявы чалавека з мячом, шчытом, у кальчузе і ў шлеме. Рыштунак і адзенне адпавядаюць археалагічна вядомым старажытнарускім матэрыялам. Вылучаецца 27 малюнкаў, якія ў сваю чаргу падраздзяляюцца на тры групы: выразнае аблічча чалавека, абстрагіраваныя выявы людзей і кампазіцыйныя малюнкі. Першая група прадстаўлена 8 малюнкамі. Гэта выява чалавека з мячом у правай руцэ і з каронай на галаве, два малюнкі з выявай лучніка, чатыры «партрэты» воіна ў кальчузе ці панцыры, у шлеме і адна выява аголенай жанчыны (рыс. 36, *7*). На адным з малюнкаў над галавой воіна намаляваны крыж на ланцужку, які па форме падобны да знойдзеных на Маскавіцкім гарадзішчы энкалпіёнаў (рыс. 36, *1*). Падобная маскавіцкім знаходкам паясная выява воіна ў пласцінчатых даспехах і ў востраканечным шлеме, з круглым шчытом у левай руцэ і мячом у правай вядома па вапнавай плітцы памерам 8×10 см, знойдзенай у Бярэсці [22]. Трэба падкрэсліць, што малюнак аголенай жанчыны XII — XIII стст. не адзіны. У 1967 г. у Полацку ў слоі першай паловы XIII ст. знойдзена невялікая драўляная скульптурка аголенай жанчыны [23]. Гэтыя знаходкі хутчэй за ўсё звязаны з нейкімі культамі.

Да другой групы адносіцца 13 малюнкаў з абстрактнымі выявамі людзей (рыс. 35, *4,8*). Адзін з малюнкаў знойдзены на суседнім гарадзішчы Рацюнкі (рыс. 38, *6*). На трох касцях намаляваны чалавек з мячом у правай руцэ, на дзвюх — з мячом у левай руцэ, яшчэ на адной — чалавек у лодцы. Ёсць выява двух чалавек, адзін з якіх знаходзіцца на беразе,




*Рыс. 38. Знаходкі з гарадзішча Рацюнкі: 1 — бронзавая булава; 2 — фрагмент бранзалета; 3 — спіральная пранізка; 4, 5 — шыферныя праселкі; 6 — косць з малюнкамі; 7 — нож; 8 — ключ; 9 — крэсіва*

другі — у лодцы. На 4 малюнках паказаны чалавек з распасцёртымі рукамі. На косці, знойдзенай у Рацюнках, з аднаго боку намаляваны чалавек з шырока разведзенымі ў бакі рукамі, з выразна вылучанымі пяццю пальцамі, на галаве карона, з другога боку знаходзіцца схематычная выява конніка. Падобная выява вядома ў Чэхіі на гарадзішчы X ст. (Лібушын), дзе яна была зроблена на камені[24]. На ўсіх малюнках другой групы фігуры непрапарцыянальныя і невыразныя. Тулава і галава паказаны кружочкамі ці аваламі, а рукі і ногі — лініямі.

Да трэцяй групы адносяцца малюнкі з сюжэтнымі кампазіцыямі на шасці касцях. На адным малюнку ў баявой позе паказаны воін

у кальчузе і шлеме, з мячом у правай руцэ і міндалепадобным шчытом у левай. На заднім плане знаходзіцца лодка, побач з ёй — другі воін. На абломку другой косці злева намаляваны трохвугольнік са знакам трызубца, справа — парусная ладдзя з чалавекам на карме (рыс. 36, *2*). На трэцяй косці паказаны два дружыннікі, якія б'юцца мячамі. Ёсць малюнак са схематычнай выявай натоўпу людзей. Вылучаецца сюжэт з лодкай, у якой знаходзяцца два чалавекі з распасцёртымі рукамі, справа ад іх — натоўп людзей. У цэнтры паміж натоўпам і лодкай — крыж, па канцах і ў сярэдзіне якога размешчаны трохвугольнікі (рыс. 36, *3*). Гэты сюжэт хутчэй за ўсё трэба трактаваць як сустрэчу або провады мясцовымі жыхарамі людзей, якія прыплылі ці адплываюць на караблі. На адной з касцей паказана лодка, якая нібыта разгойдваецца на хвалях, а побач, пад вадой, вялікая рыбіна[25].

Па тэхніцы выканання некаторыя малюнкі маюць падабенства з шырока вядомымі малюнкамі на бяросце з Ноўгарада, якія адносяцца да рубяжа XII — XIII стст. Для маскавіцкіх малюнкаў характэрна тая ж непасрэднасць і наіўнасць выяў. Усе знойдзеныя малюнкі з'яўляюцца, напэўна, фрагментарнымі адлюстраваннямі падзей, якія адбываліся на Браслаўшчыне ў XII — XIII стст. Маскавіцкія знаходкі і знаходку з Рацюнкаў трэба адносіць да старажытнарускага свецкага мастацтва. Тут у адрозненне ад традыцыйнага мастацтва, звязанага з царквой, прасочваецца цікавасць мастака да жывога чалавека, да мясцовых падзей і герояў. Трэба меркаваць, што малюнкі выйшлі з княжацка-дружыннага асяроддзя, дзе ідэалізаваўся воін.

**Знакі на касцях.** Ёсць косці толькі са знакамі, аднак сустракаюцца знакі разам з малюнкамі. Усяго налічваецца 265 знакаў. Асноўную іх частку (больш за 210) складаюць літарныя знакі рознага тыпу, якія рэгулярна паўтараюцца і сустракаюцца ў складзе груп. Вылучаецца 46 граф, колькасць ужывання кожнай з іх вар'іруецца ад 1 да 36 разоў. Асноўная большасць граф (41 з 46) супастаўляецца са знакамі скандынаўскіх малодшарунічных алфавітаў сярэдневяковага рада.

На маскавіцкіх касцях ёсць спецыфічныя асаблівасці пісьма ў параўнанні з аналагічнымі тэкстамі на скандынаўскіх мовах. Па-першае, выкарыстанне ў шэрагу выпадкаў рэдкіх варыянтаў накрэслення рун, якія ўяўляюць выпадковыя і нетыповыя знакі. Пры гэтым стандартныя, найбольш распаўсюджаныя ў Скандынавіі графы альбо адсутнічаюць, альбо мала выкарыстоўваюцца. Па-другое, ужыванне некаторых графем значна перавышае іх частотнасць у старажытнаскандынаўскіх мовах. Аднак гэтыя адхіленні не аказваюць значнага ўплыву на пытанне аб прыналежнасці знакаў скандынаўскага рунічнага пісьма, якое мела мноства лакальных варыянтаў. Большасць знакаў знаходзіць сувязь са скандынаўскай рунічнай пісьменнасцю XII — XIV стст., асабліва ў яе «бытавым варыянце».

Спецыфіка пісьма на касцях з Маскавічаў — выкарыстанне рэдкіх, атыповых форм рун, а таксама несуаднонасць у частаце ўжывання некаторых знакаў можа сведчыць аб тым, што тут мае месца дэградзіраванае пісьмо, навыкі якога былі часткова страчаны яго носьбітамі. У выніку гэтага графічныя формы падвергліся спрашчэнню і уніфікацыі. Акрамя таго, ёсць 11 граф, якія суадносяцца з літарамі старажытнарускага кірылічнага алфавіта[26].

**Рашоткі ці сеткі на касцях.** Налічваецца дзесяць такіх касцей. Адсутнасць аналогій як у старажытнарускім, так і ў прыбалтыйскім і скандынаўскім матэрыялах абцяжарвае інтэрпрэтацыю гэтых выяў. Формай

лікавага запісу па тыпу абака яны наўрад ці маглі быць, паколькі ні ў адной ячэйцы не сустракаецца больш за адну кропку. У найбольшай ступені гэтыя рашоткі нагадваюць дошкі для гульні ў шашкі або шахматы на Русі ці таўлеі ў Скандынавіі і, магчыма, выкарыстоўваліся як часовае аднаразовае прыстасаванне, якое імітуе поле гульні. Некаторыя такога роду малюнкі нагадваюць архаічны спосаб лікавага запісу сеткі ў выглядзе рысачак. Выявы рашотак ва ўсіх выпадках суправаджаюцца знакамі, якія нанесены на некаторай адлегласці ад іх. Гэта ўказвае на тое, што рашоткі не ўваходзяць у лік знакаў і што існуе сэнс паміж імі і надпісамі[27].

Знакі зроблены на 7 шыферных і 1 гліняным праселках. Форма шыферных праселкаў бітрапецоідная, за выключэннем аднаго дваякаўвагнутага экземпляра. Колер праселкаў ружовы або цёмна-ружовы. Большасць знакаў на праселках выразана вострым прадметам. Усяго налічваецца 76 знакаў, якія падраздзяляюцца на 43 віды. Частка знакаў адносіцца да кірылічнага алфавіта, частка — да рунічнага. Некаторыя знакі на абломках касцей паўтараюцца[28]. Аналогіі некаторым знакам вядомы на рэчах з археалагічных раскопак у Ноўгарадзе[29]. Магчыма, гэта тайнапіс, які пачаў распаўсюджвацца ў XII ст. Для дэталёвага высвятлення характару надпісаў патрэбны тэксталагічныя даследаванні лінгвістаў.

У рэчышчы Заходняй Дзвіны вядома 5 помнікаў эпіграфікі XII ст. — «Барысавых камянёў». Гэта вялізныя валуны з высечанымі на іх крыжамі і надпісамі, у якіх упамінаецца імя Барыса. Гэтае імя звязваюць з полацкім князем Барысам. Адзін камень знаходзіўся каля Полацка (Падкасцельцы), тры — каля г. Дзісны (Балоткі — 2, Накоўнікі) і адзін — у Друі. Мясцовыя назвы гэтых помнікаў — Барыс, Барыс-Хлебнік, Пісар, Пісанік, Барыс-Глеб, Барысаглебскі, Французскі, Напалеонаўскі камень і г. д.

Не выключана, што такіх камянёў было больш, але яны ўзарваны ў час прачысткі рэчышча Заходняй Дзвіны ў 1818 г. У сувязі з гэтым важна прывесці назіранне А. І. Рогава, які адзначыў, што ні адзін з «Барысавых камянёў», што захаваліся, не мае такой формы крыжа, якая пададзена ў хроніцы М. Стрыйкоўскага[30].

Дыскусіі аб прычынах высякання крыжоў і надпісаў на каменнях ідуць звыш 200 гадоў. Першае ўпамінанне аб адным з дзісенскіх камянёў адносіцца да XVI ст. Яго змяшчае Хроніка літоўская і жамойцкая, а таксама хроніка М. Стрыйкоўскага.

У Хроніцы літоўскай і жамойцкай гаворыцца: «...Того и теперь явное сведоцтво: каждый найде камень в Двине высокий, от Дисны места миля, а от Полоцка миль 7, мижи Двиною и Дисною на низ дорогой едучи, на котором камени ест крест такими образом +. И того князя Бориса под ним надпись «Вспоможи, господи, раба своего Бориса сына Гинвилового. А то написано литерами русскими...»[31].

М. Стрыйкоўскі лічыў, што князь Барыс пры пабудове ў Полацку ў 1217 г. храма Барыса і Глеба загадаў у гонар пасяховай дастаўкі з Лівоніі будаўнічага матэрыялу высячы на камені надпісы і крыж[32].

У 1773 г. адзін з дзісенскіх помнікаў апісаў акадэмік І. І. Ляпёхін[33]. У 1818 г. ішлі работы па паляпшэнню суднаходства па Заходняй Дзвіне, і тады вучоным стаў вядомы камень каля в. Падкасцельцы пад Полацкам. Тады ж па хадайніцтву Н. Н. Румянцава ўрад прыняў рашэнне аб захаванні помніка эпіграфікі. Члены румянцаўскага гуртка ўзнялі пытанне аб прызначэнні камянёў з надпісамі. В. Ф. Канкрын меркаваў, што камяні служылі знакамі ўладанняў або для барацьбы супраць язычніцтва[34].

У далейшым артыкулы, прысвечаныя дадзенай праблеме, друкаваліся ў шматлікіх часопісах. Выказваліся розныя гіпотэзы адносна прычын з'яўлення надпісаў і крыжоў. Напрыклад, А. Плятэр і А. Кіркор сцвярджалі, што надпісы на камянях высечаны для ўвекавечвання памяці князя Барыса, а Я. К. Тышкевіч лічыў камяні пагранічнымі знакамі ўладанняў полацкіх князёў. У 1820 г. К. Шмідт, выкарыстаўшы мелкаводдзе, змог замаляваць дзвінскія камяні. Пазней замалёўкі рабіліся А. Плятэрам і Д. М. Струкавым. Значная ўвага на «Барысавы камяні» была звернута на I археалагічным з'ездзе (1869 г.). Даклады аб гэтых помніках рабілі К. І. Шмідт і М. Ф. Кусцінскі[35].

Шматлікія артыкулы, прысвечаныя «Барысавым камяням», выклікалі цікавасць у мясцовых улад, і ў 1887 г. адзін з камянёў каля в. Балоткі паблізу Дзісны з надпісам «Сулибор хрест» быў падняты з вады і адпраўлены ў Маскву. Спачатку ён знаходзіўся ў музеі Маскоўскага археалагічнага таварыства, затым — у Гістарычным музеі, а зараз захоўваецца ў музеі-запаведніку «Каломенскае». Два іншых камяні каля Дзісны знішчаны ў сярэдзіне XX ст.

У 1889 г. спрабавалі падняць з вады і ўстанавіць у Полацку на плошчы камень, які знаходзіўся каля в. Падкасцельцы, але спробы былі безвыніковыя[36]. Толькі ў 1981 г. з дапамогай аквалангістаў гэты помнік быў падняты з ракі і ўстаноўлены каля Сафійскага сабора.

Значную ўвагу «Барысавым камяням» удзяляў А. П. Сапуноў. У 1890-х гадах ім быў адкрыты новы «Барысаў камень» у Друі. А. П. Сапуноў лічыў, што высяканнем крыжоў і набожных надпісаў князь Барыс хацеў абясшкодзіць камяні, якія нібыта абцяжарвалі суднаходства па Заходняй Дзвіне[37]. Значнае месца ў сваіх працах «Барысавым камяням» адвёў Е. Р. Раманаў. Ен выказаў некалькі меркаванняў аб прычынах высякання крыжоў і надпісаў: у мэтах распаўсюджвання хрысціянства, у гонар аб прабыванні ў гэтых мясцінах князя, для добрага праходжання суднамі небяспечных месцаў на рацэ, у памяць аб незвычайным мелкаводдзі і г. д.[38].

Заслугоўвае ўвагі абагульняючы артыкул В. П. Тарановіча. Да артыкула прыкладзена падрабязная карта і бібліяграфія аб «Барысавых камянях». Аўтар звярнуў увагу на тое, што формула «Господи, помоги рабу своему» грэчаская і шырока ўжывалася як у Візантыі, так і ў Старажытнай Русі[39].

Цікавая думка адносна прычын высякання крыжоў і надпісаў на дзвінскіх камянях выказана Н. Н. Варонiным у кнізе «История культуры Древней Руси» (М., 1951). У рабоце адзначана, што з распадам Кіеўскай дзяржавы развіццё мясцовых інтарэсаў, пытанні гандлю і самастойнасці княстваў прымусілі звярнуць увагу да ўнутраных водных шляхоў і адным з мерапрыемстваў у гэтым напрамку была спроба ўстанавіць свайго роду лоцманскія знакі на небяспечных месцах рачных шляхоў. Менавіта такім мэтам, па думку даследчыка, і маглі служыць «Барысавы камяні», а надпісы сведчаць аб дзейнасці полацкага князя Барыса па паляпшэнню рачных шляхоў на яго землях.

Такім чынам, думкі даследчыкаў аб прычынах высякання крыжоў і надпісаў розныя. У пачатку 80-х гадоў з дапамогай аквалангістаў-аматараў былі праведзены гідраархеалагічныя даследаванні месцаў, дзе знаходзіліся «Барысавы камяні» каля г. Дзісны. Высветлілася, што перашкаджаць суднаходству гэтыя камяні наўрад ці маглі.

Найбольш рэальнай уяўляецца гіпотэза, выказаная Б. А. Рыбаковым. Згодна з ёй, крыжы і надпісы на камянях былі высечаны для барацьбы

супраць паганства. Гэта было зроблена ў дні Барысаглебскіх аграрных святаў вясной 1128 г. Неўраджай і голад прывялі тады да вяртання язычніцкіх вераванняў, і, пэўна, людзі сталі маліцца каля сваіх старых паганскіх алтароў — валуноў. У мэтах барацьбы з голадам князь Барыс, які быў вельмі набожным, загадаў асвяціць камяні і выбіць на іх крыжы з Галгофай, а каб узвысіць першых старажытнарускіх святых*, а можа, ўвекавечыць сваё імя, па яго загаду былі высечаны надпісы ў выглядзе хрысціянскай формулы з упамінаннем імя Барыса [40]. Трэба падкрэсліць, што «Барысавы камяні» знаходзіліся менавіта каля гарадоў Полацка, Дзісны, Друі. Гэты факт можа прасвятліць пытанне ўзнікнення гэтых гарадоў. Цікава, што Друяй да канца XV ст. валодалі слугі Полацкага замка, а былыя вёскі Накоўнікі і Балоткі (каля Дзісны), дзе знаходзіліся «Барысавы камяні», у сярэдневякоўе належалі друйскай Спаскай царкве[41]. Гэта думка варта больш падрабязнага вывучэння.

---

* Культ Барыса і Глеба быў прыняты ў 1072 г. і канчаткова ўстаноўлены ў 1115 г.

*Глава V*

# ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЯ ТЭРЫТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў ГІСТОРЫІ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

## 1. ПРАБЛЕМА ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА РУБЯЖА ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА

Са старажытнарускіх летапісаў, хронікі Генрыха Латвійскага, ліфляндскай рыфмаванай хронікі, шэрагу іншых пісьмовых крыніц вядома, што даннікамі Русі былі ўсходнепрыбалтыйскія плямёны — лівы, куршы, земгалы, селы і латгалы. Не выклікае сумнення існаванне ў XII—XIII стст. на тэрыторыі гэтых плямёнаў дзяржаўных аб'яднанняў Кукенойс і Герсіке, якія былі ў васальнай залежнасці ад Полацкага княства і дзе правілі прадстаўнікі полацкага княскага дома. Знаходзячыся ў васальнай залежнасці ад Полацка, гэтыя княствы карысталіся адноснай самастойнасцю ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Яны развіваліся пад уплывам полацкай дзяржаўнасці, але захоўвалі і мясцовыя асаблівасці, як, напрыклад, саветы старэйшых і нарады дружыннікаў. Падпарадкаванне Полацку першапачаткова праяўлялася ў выплаце даніны, а затым у форме аб'яднання дружын, падобна таму як гэта было ва ўсходнеславянскіх землях. К канцу XII ст. гэтыя землі карысталіся палітычнай самастойнасцю, але потым пагроза нямецкай агрэсіі прымусіла шукаць дапамогі ў суседніх землях усходніх славян[1].

Пытанне аб тэрыторыі і межах гэтых княстваў разглядалі Ф. Кейслер[2], В. Ц. Пашута[3], М. Хелман[4], П. А. Старадубец[5], Э. С. Мугурэвіч[6] і іншыя даследчыкі. Усе яны былі адзіныя ў тым, што ўсходняя граніца княства Герсіке супадала з паўночна-заходнім рубяжом Полацкага княства, але ніхто з даследчыкаў не ўказвае канкрэтна гэтага рубяжа. А. Н. Насонаў[7], а за ім Л. В. Аляксееў[8] у сваіх манаграфіях на картах, якія паказваюць тэрыторыю Полацкага княства, уключылі ў яго і васальныя землі Падзвіння, але канкрэтна пытання аб гэтых княствах не разглядалі.

І. Я. Фраянаў, даследуючы пытанні аб даніне, зрабіў вывад, што даніна падуладных плямёнаў насіла характар выкупу (кантрыбуцыі) і што жыхары аддаленых зямель, якія плацілі такую даніну, уваходзіць у склад старажытнарускай дзяржавы не маглі [9]. Е. Ахманьскі выказаў думку, што Герсіке і Кукенойс маглі быць гарадамі-дзяржавамі [10]. Аб гэтым сцвярджае і І. Я. Фраянаў [11].

Даследчыкамі даўно адзначана, што на сучаснай граніцы Беларусі з Латвіяй і Літвой яшчэ ў старажытнасці праходзіла парубежная этнаграфічная зона паміж славянамі і ўсходнепрыбалтыйскімі народамі. Адным з першых пісаў аб гэтым З. Даленга-Хадакоўскі: «...Каб аб'ехаць і адзначыць межы рускія ад ліваў, латышоў, літвы, складанасць якой па дыялектах і ўрочышчах мне ўяўляецца ў наваколлі Друі на Дзвіне, праз самае Вільна, Коўна...» [12] М. Баліньскі і Т. Ліпінскі намячалі граніцу ў раёне Дрысвятаў і Відзаў [13]. Н. Барсаў праводзіў граніцу праз воз. Свір да прытоку Дзісны р. Мядзелкі, на поўнач да сістэмы азёр і далей Опса, Пеліканы, Дрысвяты, Рыча, Сомка, Рубеж, Шылаўка, Краслава. Затым вёў яе ў воб-

ласць р. Дрысы, захопліваючы Асвею і Себеж [14]. А. Біленштэйн лічыў, што этнічнае пагранічча ў старажытнасці праходзіла па лініі Ілюкст, на поўдзень ад Дзвінска, уверх па цячэнню Заходняй Дзвіны да Крэйцбурга, на ўсход ад Ільгера да граніцы з Літвой [15]. Ф. В. Балодзіс этнічную граніцу для IX—X стст. праводзіў па лініі Лжа, Пітэле, Зілупэ, Грэбля, а для XI—XII стст. — Лжа, Пітэле, Зілупэ, Плісуна [16]. Б. Брэжга звязваў граніцу з населенымі пунктамі Пітэле, Зілупэ, Грэбля, Краслава [17]. Г. Лаўмянскі лічыў граніцай лінію ад воз. Свір да Браслава і далей уздоўж сучаснай граніцы Беларусі з Латвіяй [18]. Ю. Гацье пісаў, што «...пры князі Усяславе Полацкае княства не прасцірала сваёй улады далёка за этнаграфічны рубеж рускіх, які тады праходзіў прыблізна там, дзе ён праходзіць і зараз: уздоўж цяперашняй граніцы Літоўскай і Латвійскай ССР з аднаго боку і РСФСР і БССР з другога боку...» [19]

М. Я. Грынблат зафіксаваў парубежную этнаграфічную зону: на ўсход ад г. п. Відзы, уздоўж заходняга берага воз. Лукі, на ўсход ад в. Мілашкі, на ўсход ад г. Браслава да Заходняй Дзвіны, на ўсход ад г. п. Друі [20]. М. Хелман пагранічнай зонай называе таксама пункты Лша, воз. Высокае, вусце р. Рубеж, упадаючай у р. Сінюху, заходні бераг воз. Сіняга, далей да рэк Сар'янка, Росіца, Дзвіна і да г. п. Асвея [21]. К. Сласкі пагранічнымі назваў наступныя пункты: Пітэле, Дубовікі, Мельнікі, Істра, Андзелі, ці Дзегцяры, Казлава, Нерза, Рудава, Пентухі, Кромані [22]. Л. В. Аляксееў праводзіць пагранічную лінію ўздоўж нёманскай Бярэзіны і Ашмянкі на поўнач да Мядзела, Дрысвятаў, Браслава [23]. В. Сядоў вызначыў лінію парубежжа наступным чынам: «...Ад Асвейскага возера на поўдзень, перасякае Заходнюю Дзвіну каля вусця р. Дрысы, правабярэжная частка р. Дзісны (прыток Заходняй Дзвіны) належала крывічам, на захад жыла летапісная Літва. Найбольш заходнім крывіцкім паселішчам быў Браслаў» [24]. Е. Ахманьскі граніцу паміж славянамі і ўсходнепрыбалтыйскімі народамі праводзіць па лініі Браслаў — Пагост — Паставы [25].

Пытанне аб парубежнай зоне закранаді ў сваіх работах Я. Ф. Карскі [26], А. Хедэман [27], А. В. Куза [28], В. Уртанс [29], Г. А. Хабургаеў [30], Ц. Штэрн [31] і іншыя даследчыкі.

Рыса старажытнай этнічнай парубежнай зоны, па даных усіх указаных аўтараў, адпавядае ў асноўным сучаснай граніцы Беларусі з Латвіяй і Літвой. У першым раздзеле адзначалася, што пахавальныя помнікі пацвярджаюць такую карціну. Заселеныя крывічамі раёны ў XI—XII стст. былі замацаваны за Полацкам лініяй абарончых пунктаў, у ліку якіх Браслаў, Маскавічы, Рацюнкі, Дрысвяты. На гэтых гарадзішчах дамініруе славянскі матэрыял. Адначасовае ўзвядзенне такіх пунктаў з'явілася хутчэй за ўсё вынікам свядомага планавання абарончай лініі. У гэты час Полацкая зямля амаль абасобілася, і яе даўнія суседскія сувязі з прыбалтыйскімі плямёнамі пачалі перарастаць у спробы падпарадкавання гэтых плямёнаў уладзе Полацка. Тады ж узнікла і небяспека з боку Літвы, дзе пачалася кансалідацыя балцкіх плямёнаў у літоўскую народнасць [32]. Летапісы (хроніка Быхаўца, хроніка М. Стрыйкоўскага) сведчаць аб паходзе літоўскага князя Кернуса і яго брата Гімбута да Браслава ў 1065 г. Неаднаразова ўпамінаецца ў літаратуры паход літоўцаў праз Дзвіну на пскоўскія землі ў 1183 г. [33] Менавіта гэтым і тлумачыцца неабходнасць магутных умацаванняў на ўскраіне княства.

Але ўжо да сярэдзіны XIII ст. адносіны з літоўскімі плямёнамі, напэўна, былі ўрэгуляваны, таму што Генрых Латвійскі паведамляе, што ў 1248 г. магістр Эрнэст пабудаваў крэпасць Дынабург каля руска-літоўскай граніцы [34]. Дынабург (сучасны Даўгаўпілс) знаходзіцца ў 45 км ад Браслава,

адкуль вынікае, што Браслаў у той час яшчэ належаў Полацкаму княству. Археалагічныя раскопкі на гарадзішчах Усходняй Латвіі паказваюць, што ў пачатку II тысячагоддзя там таксама ўзводзіцца шэраг умацаванняў — Дзігная, Асатэ, Аўцінэ, Цэсвайнэ, Аленэ, Цэрдэнэ і інш.[35] У літаратуры ўказваюцца і ўмацаваныя паселішчы на тэрыторыі Літвы, напрыклад замак Мажулоніс, які процістаяў Браславу і Дрысвятам. Яго зруйнаванне звязваецца з паходамі палачан у 1180 г. ці ў 1201—1202 гг.[36]

Парубежныя пункты, якія мелі магутныя ўмацаванні, былі размешчаны на вялікай адлегласці адзін ад другога, таму можна меркаваць, што паміж імі, магчыма, існавалі і іншыя, менш значныя. Трэба пагадзіцца з думкай Л. В. Аляксеева, які лічыць, што князем Брачыславам маглі быць заснаваны акрамя Браслава іншыя паселішчы з сугучнымі назвамі [37]. Да такіх паселішчаў, напрыклад, можна аднесці гарадзішча каля в. Браслава (сучасны Краслаўскі раён Латвійскай ССР) [38].

Аб пагранічнай зоне, пэўна, сведчыць і назва в. Рубеж каля Браслава. Тапонім Рубеж азначае паселішча каля рубяжа, граніцы ўладанняў [39]. Г. Лаўмянскі, абапіраючыся на Рускую Праўду і Наўгародскі летапіс, паказаў, што тапонімы Рубеж існавалі ўжо ў XI ст.[40] У «Гістарычным атласе» Н. І. Паўлішчава [41] на поўнач ад Браслава на карце, якая паказвала Русь у 1054 г., адзначаны пункт Рубеж. Есць падставы звязваць гэты пункт з гарадзішчам Маскавічы. У выданні «Slownik Geograficzny królewstwa Polskiego i innych krajów slowiańskich» (1888. T. 9. S. 877) у Браслаўскім Паазер'і адзначаны яшчэ шэраг пунктаў з назвамі Рубеж. Гэта паселішча на Заходняй Дзвіне, уніз па цячэнню, у 51 км ад г. Дзісны, в. Рубеж на тэрыторыі Усходняй Латвіі і в. Рубеж у былым Новааляксандраўскім павеце. Згадваецца таксама ручай Рубеж, які ўпадае ў Заходнюю Дзвіну, некалькі ніжэй Друі.

Лінію парубежжа падкрэсліваюць тапанімічныя назвы з балцкімі канчаткамі на -ішкі, -ані, -аны. У Верхнядзвінскім раёне такіх назваў не зафіксавана, у Міёрскім адзначаны толькі дзве — Алексішкі і Камарышкі. У заходняй жа частцы Браслаўскага раёна назвы з указанымі канчаткамі пераважаюць [42].

Е. Ахманьскі, аналізуючы публікацыі па тапаніміцы, падкрэслівае, што назвы на -ішкі праходзяць па лініі паміж Дзвіной і Дзісной і, агінаючы Браслаў з захаду, цягнуцца над азёрамі Снуды і Струста, далей да Дрысвятаў, мінаючы з захаду Іоды, і ад воз. Богінскага на поўдзень уздоўж р. Дрысвяты да р. Дзісны на ўзроўні Каз'ян і г. д.[43]

Такая ж змешаная этнічная зона адзначаецца і мовазнаўцамі, якія займаюцца старажытнымі балта-славянскімі сувязямі. Гэтаму пытанню прысвечаны працы А. Біленштэйна [44], Е. Блезе [45], К. Бугі [46], Я. Эндзэліна [47], З. Зінкявічуса і Р. Гаўчаса [48], а таксама шэрагу іншых даследчыкаў [49].

Выкладзеныя факты дазваляюць заключыць, што сучаснае беларуска-літоўска-латышскае сумежжа ў канцы I — пачатку II тысячагоддзя з'яўлялася граніцай Полацкага княства з прыдаўгаўскімі княствамі, а таксама з літоўскай зямлёй [50].

### 2. БРАСЛАЎСКАЕ ПААЗЕР'Е НАПЯРЭДАДНІ УВАХОДЖАННЯ У СКЛАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Цяпер на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі вядома паўтары тысячы гарадзішчаў. Гэта дало магчымасць распрацаваць шкалу сацыяльна-эканамічных адзнак умацаваных паселішчаў, зрабіць вывад

аб іх шматфункцыянальнасці і аб тым, што ў сваім развіцці звычайна паселішчы пераходзілі з адной катэгорыі ў другую. Але па-ранейшаму вывучэнне сацыяльнай тыпалогіі старажытнарускіх умацаваных паселішчаў застаецца адной з актуальных задач [51]. Асабліва гэта важна для вывучэння гісторыі ўскраінных рэгіёнаў Русі, у прыватнасці літоўска-крывіцкага сумежжа [52].

XI — XII стст. былі часам распаўсюджвання феадалізму, калі фарміраваліся і ўмацоўваліся вотчыны. Магчыма, шэсць сыноў Усяслава Полацкага яшчэ пры жыцці бацькі былі надзелены землямі і гарадамі. Да сярэдзіны XII ст. Полацкую зямлю падзялілі нашчадкі Усяслававага роду, а да канца стагоддзя дзесяць праўнукаў Усяслава вядомы як уладальнікі дробных княстваў. Яны імкнуліся пашырыць свае ўладанні за кошт суседніх літоўскіх зямель, але безвынікова [53].

Даследаваны рэгіён размешчаны на граніцы з усходнепрыбалтыйскімі народамі, і ў канцы I — пачатку II тысячагоддзя, як адзначалася, тут адбывалася афармленне паўночна-заходняга рубяжа Полацкага княства. Адначасовае ўзвядзенне ўмацаванняў мела мэтай замацаваць за Полацкам заселеныя крывічамі землі і было хутчэй за ўсё вынікам мэтанакіраваных дзеянняў полацкай адміністрацыі.

Археалагічныя даныя сведчаць, што амаль на ўсіх апісаных гарадзішчах жыццё існавала і да ўзвядзення магутных умацаванняў. Таму можна меркаваць аб тым, што ў часы рассялення крывічоў маглі існаваць пасёлкі-станы (пагосты), якія выконвалі ролю полацкіх фарпостаў і пунктаў збору даніны. Хутчэй за ўсё такія пункты былі ў Браславе і Маскавічах. Такі фарпост мог быць і на гарадзішчы Гарадзец на р. Мнюце, дзе ў выніку раскопак знойдзены рэчы VIII — IX стст.[54]

А. Р. Мітрафанаў, які вывучаў гарадзішча Свіла I (Глыбоцкі раён), прыйшоў да высновы, што ў канцы I тысячагоддзя на гэтым месцы быў апорны пункт славян [55]. Як фарпост Полацкага княства, магчыма, узнікла і паселішча каля в. Межава (Расонскі раён). Тут Г. В. Штыхавым знойдзены ляпны посуд VI — IX стст. і кругавы — X — XIV стст.[56] Да фарпостаў Е. Ахманьскі адносіць Пагост (Міёрскі раён) і падкрэслівае, што сама назва сведчыць аб сувязі з фінансавай сістэмай Кіеўскай Русі [57]. У Міёрскім раёне існуе в. Новы Пагост і ў 7 км ад яе в. Стары Пагост. Культурнага слоя ў гэтых месцах пакуль што не выяўлена, але каля в. Стары Пагост яшчэ ў XIX ст. быў знойдзены скарб арабскіх манет. Па меркаваннях вучоных, там таксама магло існаваць паселішча IX — X стст.[58]

Трэба адзначыць, што на Браслаўшчыне ў курганных групах, дзе па абраду трупаспалення хавала нябожчыкаў балта-славянскае насельніцтва, знойдзены мужчынскія пахаванні па абраду трупапалажэння са зброяй (Вусце, Рацкі Бор). Гэта хутчэй за ўсё пахаванні прадстаўнікоў полацкай адміністрацыі, якая збірала даніну з падуласнага насельніцтва. Прадукты даніны першапачаткова маглі паступаць у Полацк, але з ростам фарпостаў яны сталі асядаць на месцах і служылі развіццю рамяства і гандлю. Узвядзенне ўмацаванняў ператварыла станы (пагосты) у ваенна-вартавыя крэпасці і адміністрацыйныя цэнтры, дзе знаходзіліся і двары феадалаў. Былі ўзмоцнены ваенныя гарнізоны, і гэтыя пункты мэтанакіравана пачалі засяляцца грамадзянскім насельніцтвам. Прычым засяленне праводзілася ў асноўным за кошт выхадцаў з іншых зямель, а не ваколіц. Рознаэтнічнасць маскавіцкага насельніцтва добра прасочваецца на археалагічным матэрыяле, у асноўным на

ўпрыгожаннях. Падобная сітуацыя назіраецца ў іншых пагранічных раёнах Старажытнай Русі [59].

Умацаваныя паселішчы Браслаўскага Паазер'я, якія ўзнікалі адначасова, першапачаткова выконвалі адну і тую ж ролю, але з цягам часу ў сацыяльным плане станавіліся неаднароднымі. З усіх умацаваных пунктаў у пісьмовых крыніцах упамінаецца толькі Браслаў. У «Гістарычным атласе», складзеным П. Н. Паўлішчавым (1845 ці 1873 гг.), як адзначалася, на карце «Русь у 1054 годзе» на поўнач ад Браслава паказаны пункт Рубеж. Гэты пункт лакалізуецца менавіта на месцы гарадзішча Маскавічы. На карысць такога атаясамлівання сведчаць наступныя факты. Па-першае, паміж Браславам і Заходняй Дзвіной няма іншых гарадзішчаў са старажытнарускім слоем, а, па-другое, паблізу Маскавічаў у цяперашні час існуе в. Рубеж. Такое меркаванне аб назве старажытнага паселішча каля Маскавічаў з'яўляецца даволі пераканаўчым. Аднак не выключаны і яшчэ два варыянты. Хутары, якія ёсць у ваколіцах Маскавіцкага гарадзішча, з'яўляюцца рэшткамі в. Рацішы (Рацюны). Як згадвалася, Ф. В. Пакроўскім Маскавіцкае гарадзішча было прывязана да гэтай вёскі. Зараз у 2 км на поўдзень ад Маскавічаў знаходзіцца в. Рацюнкі, дзе таксама маецца гарадзішча са старажытнарускім слоем. Мяркуючы па даных раскопак, гарадзішчы былі цесна звязаны паміж сабой. Хутчэй за ўсё гарадзішча ў Рацюнках з'яўляецца рэшткамі двара дружынніка. Аб гэтым дазваляюць меркаваць і даныя тапанімікі — назвы Рацюны і Рацюнкі. Магчымы два варыянты паходжання назваў Рацішы (Рацюны і Рацюнкі). На думку В. А. Жучкевіча, такія назвы паходзяць ад старажытнарускага слова «рацъ» [60]. Хутчэй за ўсё парубежныя замкі былі залежнымі ад Полацка. Вядома, што ў час войнаў Полацк патрабаваў ад залежных зямель дапамогі ратнымі сіламі [61].

Магчымы варыянт узнікнення назваў ад уласных імёнаў. Вядомы старажытнарускія імёны Рацьшын [62] і Рацьша [63]. Часта бывала, што замкі атрымлівалі назвы ад імёнаў сваіх заснавальнікаў ці ўладальнікаў, напрыклад Браслаў, Барысаў, Ізяслаўль і г. д. Так магло адбыцца і ў дадзеным выпадку.

Што датычыцца гіпотэз наконт назваў Рубеж і Рацюны (Рацішы) Маскавіцкага паселішча, то тут маглі быць і дзве назвы. Першапачатковай назвай мог быць Рубеж. Пасля разбурэння паселішча* яго ўцалелыя жыхары перасяліліся на бераг р. Друйкі, дзе зараз знаходзіцца в. Рубеж. А пазней на старым, стратэгічна зручным месцы, магчыма, нехта Рацьшын ці Рацьша, дружыннік ці сваяк князя Брачыслава, узвёў умацаванне, якое і атрымала назву ад яго імя.

Нарэшце, можна адзначыць яшчэ адзін факт. Назвы, сугучныя слову «Маскавічы», упамінаюцца ў дакументах XVIII ст.— Мацкаўцы, Мaськаўцы [64]. Падобныя тапонімы вядомы і на суседніх тэрыторыях. Напрыклад, на тэрыторыі Усходняй Латвіі гарадзішчы VII—IX стст. ёсць каля вёсак Маскевічышкі і Маскавас [65]. У «Спісе населеных пунктаў Ковенскай губерні» на тэрыторыі Усходняй Літвы адзначаны пункты Мацкавічы, Мацканы, Масколя, Масколішкі і інш.[66]

Адносна Браслава ўжо ўсталявалася думка, што яго назва паходзіць ад імя князя Брачыслава. Назва паселішча Дрысвяты, напэўна, паходзіць ад воз. Дрысвяты ці р. Дрысвяткі. У XV ст. замак ужо вядомы пад назвай Дрысвяцкага [67]. Паселішча, якое было на месцы гарадзішча Пруднікі,

* Гэта магло адбыцца ў канцы X — першай палове XI ст., калі суседні Браслаў таксама быў падвергнуты нападу літоўцаў і спалены (Алексеев Л. В. Раскопки древнего Браслава// КСИА. Вып. 81. М., 1960. С. 95 — 106).

называлася хутчэй за ўсё Вятай (Вяцкам). У дакументах XVI ст. згадваецца «фартэцыя» Вята [68]. Паходжанне назвы можна звязваць з назвай р. Вята.

